Бібліятэчка
Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа"
Серыя заснавана ў 1990

Кніга дваццаць шостая

Рэдактар: Галіна Тычка
Тэхнічны рэдактар: Павел Бельскі
Фота: Гжэгаж Дамброўскі

Copyright © by Sokrat Janowicz

ISBN 83-85918-18-3

Publikacja wydana przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Sztuki
Drak: Offset-Print, Białystok, ul. Broniewskiego 14

Сакрат Яновіч

# ЗАПІСЫ ВЕКУ

Беласток 1999

KAMUNIKAT.org



Сакрат Яновіч

I

## АКНО

Як толькі перастаў я поўзаць малечаю па хаце і пачаў хадзіць, памятаю акно. Яно вабіла мяне святлом і таемнымі гукамі. Даставаўся я да яго з бядою, але неадступна. Ужо прадчуваў і нават разумеў, што свет не канчаецца ў сенях, і аднекуль заходзяць да нас людзі, цёткі з дарункамі цукеркаў. Мне вельмі хацелася ўбачыць — менавіта — адкуль яны і як; а яшчэ, якія ў іх хаты, бо чуў, што таксама маюць свае...

Акно снілася. Тады я вылятаў цераз яго бабульчыным анёлам і зачаравана прынюхваўся месяцавай бондзе з пахамі велікоднага пірага. Зоркі, калі спрабоўваў лізнуць каторую, прынаджвалі смакам ландрынак. Не баяўся вышыні, не ведаючы, што такая ёсць.

Прачнуўшыся, жальна плакаў. Пакуль прыйшла вясна і мацерка вывела мяне на сонца.

На падворышчы я разгубіўся, бы зайчаня, што адбеглася ад гнязда пад мяжою ў шырокае поле. Першае, што ўгледзеў быў з пярэпалаху — гэта куры з пеўнем і парасяты, што смачна прысмакталіся адно каля аднаго да цыцак рохкаючай мацёры. Моцна здзіўлены, я не спадзяваўся, каб намаляваныя ў дзіцячай кніжцы тыя стварэнні напраўду жылі! Пасля дзівіўся што ні дзень усё чымсьці іншым, урэшце пажарам стадолаў ад грымотнага гневу Бозі.

KAMUNIKAT.ORG

У травень з чэрвенем ды ў ліпень са жніўнем, гуляючы не выходзіў з сенакоснае аселіцы з капуснымі загонамі, над якімі мільгацелі бялюсенькія матылі. Азіраўся на нашу хатку з рассмяяным акном, рагатліва расчыненым, і ветрык навейваў адтуль попахі смажаных скварак з цыбуляю... Тлусты арамат у перадабедак, калі вядома, што вось дакіпае рассыпістая бульба і ўжо адстаўлена з агню пад фаеркамі пліты гарачая страва з маладзістага шчаўю і з скабкаю свінога мяса. Ад прыступу першабытнага голаду, які магчымы толькі ў таго, хто расце і дужэе, гнаўся з архетыпным крыкам: "Мама, я хачу есці!"

## МОЙ МАЛЫ ГЕНЕЗІС

У дваццатым стагоддзі аднойчы жыць давялося. У самых пачатках славянскага ўсходу, у Крынках. У азіяцкія аднак тут зімы, хоць лета час-часом залятае сюды ад Элады. Мікраполісны гімназіён у нас тады — памятаецца — размяшчаўся ў драўляным асабняку колішняга медыка іудзейскага (забілі яго былі рыжыя германе). У юнацтва маё ўрокі ў ім давалі варвары, падвучаныя з мясцовых багатыроў. Яны, праўда, чулі нават пра Сакрата ды ягонага вучня Платона, але ўсё ж шчыра не спадзяваліся, што як хрысціяне пакланяюцца жыду Ісусу...

У той — пасля вялікае вайны акурат — росквіт прымітыўнае цывілізацыі ў тутэйшым старонні надарылася немалая ўдача халопам і плебеям. Ім, зрэшты, заўсёды даволі шчасця з хлеба, віна, пропаведзі; у такім клімаце яшчэ і з жытла. Горадзен іх — Беласток, у нечым кшталтам Афінаў з графаманскім падабенствам Акропалю, у выглядзе чырвонасцяжнае будыніны на валасную меру. Прышываныя дочкі бульбаносыя Карынфа аблюбавалі венерную Кракаўскую вуліцу (па-кашэчаму ўтульную).

Жывецца, вось, бы запацеламу Сізіфу пад гарою.

Вельмі практычна прытым не бярэм у галаву выпадковасць свайго ў кожнага з'яўлення на свет. І таго, таксама, што нараджаемся, каб памерці. Намагаемся затое на сэнс уласнага існавання — хто паўжыцця на куплю аўтамашыны аддае, іншы на бабы растрачваецца; бывае, на гарэлку ўсянютка прасадзіць або ў саладосць скандалаў кінецца; камусьці горб вырасце ад службы вернае... Тлумачыцца тое і тое, і дзесятае, папулярным махлярствам, дбайнасцю менавіта пра ясную долю дзецям родным. А яны ж, наследкі тыя, толькі ў плямёнаў першабытных паўтараюць бацькаў лёс, аб чым ужо ведалі ў белакаменную старажытнасць.

Можна сказаць: і славяне прыдумалі душу... Няпраўда, аднак жа, што і пекла з раем. Няма пэўнасці, дарэчы, ці гэта вынаходніцтва якраз эмацыянальных элінаў у супраджы з рацыянальнымі рымлянамі. Разам з тым досыць камічна гаварыць пра бяссмерце выпадковага. Нашто чалавеку вечнасць? Каб швэндацца неўміручым турыстам пасля зямное натруджанасці?

Бунтарны Ізраіль, пляжаны кесарамі, паспеў ашчасліціць нас Богам Адзіным. Сын Яго — будзе дзве тысячы гадоў ад банальнага ў тую пару распяцця — надарэмна вучыць дурняў розуму, варагоў прыяцельству, багатых спагаднасці. Але, прынамсі, Богаайца баімся па паганскай традыцыі, замест хрысціянскай любові ўсімі ўсіж. Таму перспектыва раю звузілася ва утопію, а вароты ў пекла нядбайна расчыненыя.

З дзіцячай упартасцю вяртаецца пытанне: а нашто ўсё гэта? Жыццё на зямлі дзеля неба? Зямное ў імя незямнога? Такіх сумненняў не наглядаецца ў галодных і халодных. У гэтым, відаць, і адказ. Адназначны, бы арганізм. І кпіна лірыкі смерці, усё роўна што папрок паэтам ды фанатыкам.

Аднаму Богу вядомая сутнасць свету, з чым я гатоў пагадзіцца. Бо ставіць пад пытанне Сусвет гэтак жа бяссэнсава, як і свае нарадзіны.

## РЭМШІСЦЭНЦЫІ

Табе пад пяцьдзесят. Ты: дабіўся для сябе невытлумачальна болып, чымсьці магло прысніцца табе, вырастаючаму на падпанка ў гады свае далёкія, калі для ўсіх тады пачынаўся гэты новы свет, і вось завяршаецца наша стагоддзе, пра якое некалі запытаюць: а чаму яно было такое — і ваеннае і дабрабытнае?

...На Багача слівы пасмуглелі. На іх папырскаў быў дожджык і яны выглядалі незвычайна сакаўнымі. І ад таго яшчэ, можа быць, што дзень жа святочны і пры гэтым ціхі ўполудзень ды барвовы на зыходзе; парумяненая лістота, пахацяць выспелыя агароды.

Ад самюткага рання суседка спраўляла хрэсьбіны. На траве каля ганка яе, па-прыгараднаму вымаджанага дома паразлягаліся напоеныя мужчыны (храплі — у белых кашулях і ў чорных касцюмах, ад якіх яны трохі, як пінгвіны якія). З расчыненых вокан, што на паверсе, з-за далікацтва фіранак у іх далятала сварня ў застоллі, звяглівая і нясціхная ( так, калі застануцца за чаркамі адны бабы). Таму вельмі дарэчы было пайсці адсюль у малінавы закутак і прысесці там сабе на камяні, выгратым сонцам. У настрої, які не параўнаць з адпачынкам ратая або з існаваннем толькі, такім безпачуццёвым. Відаць поле, як прасціраецца яно ад запушчанага парку, маянтковага. Яго прыгажосць бачыш ты ў раптоўным цудзе песні ці ў малітве верша, — панскімі вачыма культуры, памятай. Не-е трасучы гной, і не за плугам...

Засланяючы нанач спальны пакой, угледзіш месяц. Заўважыўшы яго фазу, табе падумаецца, што час прамінае ў нейкім чаканні, аднак жа, бяжыць ён, быццам па-зайчынаму вяртаючыся ў тое ж месца і ўсё роўна што выгледжваючы вочы за кімсьці. Ці дзіва, чаму тваё жыццё не зусім каб патрэбнае, здасца яно табе да крыўднасці выпадковым, хоць і не хапае дзеля яго дня ды з вечарам...

У летняе ўставанне, у той перадспякотны халадок бярэ ахвота папрацаваць — з радасным жаданнем быць прысутным у жывым, зялёным і светлым. У балаціне, што пад Лісіным Грудам, крычыць тамашняя птушка. Ты ўспомніш аднакласніка з паўзабытай вялікагарадской школы; ён, зарабіўшы мільёны, памёр ад рака.

Цябе гняце прымус закончыць сваё незакончанае, бо яно далося, хаця і ў звычнай табе хамутнай натузе, праз плойму гадоў шэра-шэрых, і ты баішся, каб не апусціць залішне рук. Гэткі спех — твая змора і дакучнасць. Уласцівасць безвыходнага.

У замглёнасці ўзлессяў бок Пачапка пасецца дзікі звер. Відацьме алень. Чаму ён якраз навідавоку? Гэта ж так небяспечна для яго, апынуцца ў полі зроку чалавека!..

Эх, аўтамашынай паімчацца б табе па шашы ў майскім дрэўі! Панаднейшы смак ад таго, калі ты далей, у глыбі мураванай Польшчы, альбо ў па-заходняму акуратным замежжы. У бацькоўскім жа старонні дагніваюць пакінутыя вёскі, якімі, а каб не, зацікавяцца археолагі зацюканасці ды бядоты. Куды прападае людская праца? — палі зарастаюць хмызам, украпівелыя сядзібы нагадваюць сабою колішнія могілкі з руінаю



капліцы, а ўнукам нашым манерным і не ў здогад нават тое, што ёсць ў іх дзяды ды прадзеды... Народ мой хворы бяспамяццю таксама.

Яблык падае блізка ад яблыні. Гэта так, як лёс маці паўтараецца ў дачцэ, праўда, па-свойму... Хвалімся, галытва ўчарашняя, вялізным кавалкам хлеба, нарэшце і катэджамі з мансардамі, каб папанстваваць, не цямячы чамусьці, што знакі багацця сталі не тыя і што ўсё гэтак жа міражныя яны для нас. Мінулае нацыі, бы абсалютная ісціна або прыцягненне зямное, што моцна трымае нас, — помсліва ці як, не дае нам выпрастацца, пазбыцца анамаліі росту.

У Крынскай пушчы ўпаткацьмеш паляны з вывараценямі і лугі, ад хараства якіх затрымціць табе ўвачу. Адзін лес старасць упрыгожвае, і ён векавечны. Будзе мець рацыю той, хто прыраўняе да яго культуру (без яе свет сам не ведаў бы пра сябе, пра тое, што ён быў і ёсць!). Сядзеш, каб ногі табе адышлі, збоч ад сенакоснай траскоты касілак і на строме рэчкі ў лозах, над тою яе затокаю, у якой вудзяць маладых шчупакоў. Вада бруіцца ў ёй у водарасцях, а цябе пранізвае заедлівае: ну чаму гэта мы, чаму забедныя і забедныя?! Дападаем да сваіх шанцаў, а яны, аказваецца, высмактаныя... Ачышчаючы з галчыных гнёздаў комін і апухі, ты дзівішся, што знаходзіў у іх засушаны трупок пісклянаці, як заўсёды адно заморанае.

Еўропа нам даўно за гарамі. Нічога не скажаш, не мужыку ж палацы ў галаве (прынята гаварыць у высокім тоне). А па шчырасці, дык куды працей усенька ў нас адбываецца — а будзь ты сабе кім хочаш, абы грашавітым! Нішто ёсць усё золата і блакіт дня, тамы кнігаў ды старцаў развагі, сама існасць існасці, — хлісні долі нашай над нашымі, мазаля яе і ганьбы пакаштуй. Вымавіш тады: разумею, — і аціхнеш утомна, без болю (бо ён у таго толькі, хто не пагаджаецца).

Племя маё нагамі дапераду выносяць унукі ягоныя, тыя ж пачужэлыя, і пажыткамі дзеляцца. А мо і застанецца пасля яго ўсяго сытасць бяздумная, якой будзе выгода параю? Калі так, дык пажартавала з нас асвячоная эпоха ўсеўладная, быццам ласкавая пані яснавяльможная калісьці, што служкаў сваіх віншавала імянінна ды за стол свой запрасіла, а мы так жа цяпер наеліся за ім ажно да адрыжкі, усё роўна што за ўсе вякі мінулыя, а як жа глумныя над намі!..

## ОДУМ

Пасля вайны вялікае мы школы паканчалі заядла і, усе да апошняга, дарослымі ўраз зрабіліся. І на работу ў гарады трамваезвонныя ды з тратуарамі франтаватымі, бы на фэст які вяселісты пайшлі-паехалі. Грошы ж свае мелі, яшчэ з малаком на губах будучы, во дзіва цуднае было над дзівамі! Так працавалі там і ў якія толькі хочаш змены, што сам Сізіф той пры нас гультаём здаўся б... Не з аднаго страху парабка, што маўклівым кватарантам споўдаўся ў кожным з нас, — а каб не турнуў хто на галытву тую бацькоўскую назад. За шанц жыць потым, як у байцы, браліся сутаргава, неадчэпна.

Мы палічылі, што мінулае сваё басаногае, дзякаваць Богу, у дурнях пакінулі спрытна, таму сэнс усякі без нас або не ў нашым новаздабытым уявіўся тады да абсурду немагчымым, часам няхай сабе смешным усяго да сакатлівага рогату. Маці задрыпаная з бацькам зацюканым, усё роўна што памылка несусветная лёсу людскога, у глухамані забеластоцкай беспатрэбна гароўна карпелі. Свет цэлы не бачыў чагосьці такога з маладымі ды й найстарыя са старых не зведалі аніколі. Як жа лёгкакрыла ішлося ў часы тыя і ў нагу несумненна жа ж!

Ой, стараліся мы ды перастарваліся, не ў прыклад кажучы, быццам дзеці малыя, якім цацкі за тое навюткія і фабрычныя, нікім не кранутыя, далі на свята прычаканае ўрэшце. У захапленні гэткім ад таго, ажно да першабытнага самазабыцця зацьменнага, у якім год за годам нам гады замільгацелі ўваччу на падабенства лікаў тых выйгрышных на рулетцы нейкай азартнай. Стаўкі тадышнія на карту нашу запаветную дазвалялі пакуль на няшмат, спачатку на абноўку чаравічную, а потым і на касцюмную, з зашпількамі фарсістымі-серабрыстымі. Ну й разжыліся ж радасна і сяк ды так на мэблю блішчачую і на кватэры жаданыя з пакоямі гардзінна-шырокаваконнымі. А й унучанятамі, як анёлкамі, дзеда з бабкай з рукамі парэпанымі пацешылі мы па-панску для шыкоўнасці пад тайны свой комплекс хама на паркетах.

Дзяцей пагадавалі ж мы так, быццам яны былі не нашымі, а прысланымі ад паноў нам даўгапамятных на ўтрыманне смачнаежнае і выхаванне фінціклюшнае. Раслі панічамі і паненкамі ў нас на хвалу усё-такі вясковую, і вазілі ж іх туды што ні свята, у дрымоцце тое прыгуменняў, на паказ абавязковы дзеля цётак з дзядзькамі, а і зайздрасці прыемнай ад суседзяў у заплоцці. Лялькамі разадзетымі і шпанюкамі, якім толькі малака птушынага не хапала!

Як кажуць: і азірнуцца не паспелі, калі сівізна пасыпалася на галовы нашы інеем прымаразку першага і вочы заімгліліся стомаю пасля дарогі такой пыльна-доўгай, малапраезнай яшчэ ў тое вандраванне наша. Песні тыя, што спявалі мы ў вёсны маладыя і ў леты квяцістыя, рэхам беспаваротным адляцелі на той свет, а словы родныя з родных цяпер непатрэбшчынаю на гарышчы хаты або ядлоўцамі на палях удзічэлых староння сардэчнага; душы ў пустапаш пустазельную вырадзіліся. Бацышў сваіх вось крадком пахаваўшы на могілках, бяспамяццю зарастаючых за палеткамі пакінутымі, а дзяцей шумна ў зямлю абяцаную альбо ў Амэрыкі выправіўшы з кашалькамі тугімі, агледзеліся і самі век дажываючымі, каратаючымі дзень да вечара ды над фатаграфіямі даўнімі галавою ківаючы... Адно неба засталося нязменна зорным і буры пераджніўныя гэтак жа па-маладзецку грымотныя ды захады ў задуменні назаўсёды ціхім барвовыя, і маладзік месяца ў ноч Пятра і Паўла, бы перад колішнімі зажынкамі, цярпліва напамінаючы з нябёсаў над нашаю айчынай зараз пустыннаю, што без сярпа перш не было б хлеба.

Як жылі, так і пражылі. І па законе старасці натужваемся думаць пра раней непрадчуваныя намі тысячагоддзі, разумеючы, хоць бессаромна позна, як блізка, аднак, адыйшліся мы наперад, няглядзячы на зразумелую і слушную гідлівасць нашу да існавання сярмяжнага пад стрэхамі саламянымі, пад якімі проста па-варварску былося. І добра, што прынамсі бяздарна ўяўляем сабе ўсё, колькі нам да спасціжэння неспасцігльх Элады і Рыма. Ды пытаем самі ў сябе з сумненнем, як мудрасць: а як гэта нас успамінаць будуць і ці прыстойным словам?

## ВЫЕЗД ПА СПРАВЕ

У тую нядзелю, калі расквітнелі сады, упорань выбраўся я ехаць да брата. Самой язды тае аўтобусам да яго было трохі за пятнаццаць хвілінаў, да ягоных тых Любавак (з высокага канца якіх усё відаць цэлую пасеку летніх домікаў, што ўбок ад помпавай станцыі гарадскога вадаправода). Братаў дом — свяжуткая мураванка, пакуль абгароджаная абы-як — па-новабагатаму распанела ўскрай жытнёвага поля, што

прасціралася да ельнікавага маладняку. З суседняга панадворка, аднекуль з-пад хілае хаты на ім, кінуўся сабачыска, праз брамку там, такі шарсцісты, ды ўеўся брахаць на мяне, чужога тут.

Брат, сяк-так падвучыўшыся ўрэшце-рэшт спекуляваць, лепей зарабляе на вырошчванні цяплічных памідораў, і я палічыў, што ён дапаможа мне ( у гэтую пару ўжо не павінен швэндацца па падбеластоцкіх прыватных будовах, на якіх яму, майстру гідраўлічных рамёстваў, хоць і напагатове, таксама немалая плата). Зрабіўшыся бойкім агароднікам, паказаў сябе зусім пэўным у сваім чалавекам.

— Каля тысячы расады, — сказаў мне пра сваё прадпрыемства. Я, а як жа, упаткаў яго перад паркім увaходам у цяпліцу. Яна нагадвала сабою, не бачанага нават бацькамі, вялізнага цэпеліна.

— Грабеш грашыскі!

Ён, аднак, адказаў без радасці таго галяка, які ўдачна ад'еўся і зажыў.

— А-а, робіш-робіш і чым болей прыдбаеш сабе, тым горла шырэйшае... Цёшча, ага, кажа: даўней не так жылі, вядома, ды затое весялей, — ён нагнуўся і выцер далоні аб траву пад кульгавым плотам.

Я сказаў, бы ў патыліцу яму:

— У сытасці, відаць, рэдка смяюцца, у дабрабыт...

— Хітрая штука гэты добры быт: без яго адна бяда, а з ім другая! — ён хмурнеў. — Пойдзем дахаты, ага, — азірнуўся на тую цяпліцу, ці чаго не забыўся ў ёй. — То што: пойдзем, ну, пагаворым... На тое і хата.

Ён ступіў першым, цяжка. Адкінуў быў нагою — у гумавым боце — пакручаную бляху, усю іржавую, і яна шуснула ў дол, што збоч ад утаптанае сцежкі, завалены каменнем ды закрапівелы. Падворышча, як гэта ў тых, хто будуецца, з зарастаючым зеллем куп'ём ад навезенага пяску, усюды з вапневым натрусам; па-акопнаму параскіданы на ім дрот, абрэзкі арматуры, ненатуральнымі вусенямі рыжэюць пагубленыя шрубы, вінцікі.

— О, скажы ты мне, дзе б знайсці такога злодзея, ага, які прадаў бы добрае кола ад трактара, — загаварыў, гледзячы некуды ўдалеч. Ен адамкнуў дом.

— Трактар у цябе? — забубніў мой голас у пустых сценах.

— Купляю, ага, ды запасовых частак не даюць; трэба ж дакрасці.

— Нашто табе ён?!



— Невялікі будзе, ага, якраз на загоны, — растлумачыў мне.

І мы чамусьці памаўчалі. "Ну і дзеля чаго яму трактар? — калацілася ўва мне. Каня мець, дык ім усюды даедзеш, як не возам, то вярхом, або хоць бы палюбавацца быдляцінай... А машыну?!"

— Жонка з хлопцам у сваіх бацькоў, бульбу садзяць, — гаварыў ён, як бы папярэджваючы маё пытанне. Я ўлавіў у ягоным голасе, што такая гаворка была б яму ў нечым прыкрай, нешта не ладзілася ў іх... Я ад іхняга вяселля ні разу не наведаўся да іх і за столькі часу даволі падзабыў ейны выгляд, твар. Зрэшты, ягоная радзіна дакладна абыякавая мне, што вецер у падстрэшшы.

— Дзесьці стаіць у мяне паўбутэлькі, — пашукаў тае выпіўкі надарэмна ў шкапчыку. Ён бразгаў пасудаю, а я з натугаю абдумваў, як выкласці яму пра ўсё тое, з чым з'явіўся ў яго. — Думаеш, ага, дастаяла...

— Пакінь, кажу...

Без дай прычыны ўспомнілася, як з эмігрантамі, з якімі я быў пасябраваўся, ішоў у гасціну ў адзін лонданскі дом, адрасу якога ніхто з нас не ведаў як след. Мы, спрачаючыся, убіліся ў нейкі ціхі завулак асабнякоў з мноствам сіямскіх катоў за аздобным заплоццем і перанакіраваўшыся наўпрасты, пралазілі цераз уздырдыган новабудоўлі, як гэта зазвычай, бязлюднае. Насустрач нам паўстаў тады мардаты мужчыніска ў дажджавым плашчы, няйначай сторож, які з відавочнай злосцю паказаў кульбакаю на надпіс забароны пераходаў, але мае тыя сезонныя сябры паведамілі яму, што я і яны беларусы, і (не паспеў я рагатнуць ад такое напышлівасці) ён адчапіўся ад нас. — Што, можа, ён сам з нашых? — пацікавіўся я. — А халера яго ведае?! — адказалі яны мне. Усе мы, нічога не разумеючы ў тым, выбіліся на патрэбную "стрыт" і — дзякуй Богу! — пунктуальна пазванілі ў чакаючыя нас дзверы.

...Брат зморана сеў на канапу, транту з выпушчанымі, бы кішкі з жывата, спружынамі; са скрыгатам пазвоньвала пад ім. Ён хацеў сказаць, што ў яго няма чым ўчаставаць мяне, і мне рабілася ад гэтага непрыемна, тым мацней, што я не чакаў таго, не з'явілася нават жаданне вады напіцца (пра што таксама трэба змоўчваць, каб той, у каго ты нечаканым госцем, не адчуў сябе прыніжаным). Таму яшчэ і гэта аддаляла ад нас прадмет сустрэчы.

Да другога паверху высілася чыясьці ўрослая груша, абсыпаўшыся квеценню так, што здавалася: вось выпаў перадкалядны бялюсенькі снег і мы з братам грэемся ля печкі, перакідваючыся дрымотным словам пра будзённае (як ісці ў дасвецце малаціць авёс, у маразечу)... На рэчцы Супраслі, там, дзе паварочваецца яна на лугоўі Сцюдзянак, ёсць завадзь, на якой разлапушылася водная лілея. Уяўляючы сабе тое буйна-блакітнае закуцце з капіцамі лазнякоў, пачынаю як бы ўчувацца ў тых, хто з вудаю ходзіць на рыбу.

— Цесць німала дапамог мне сваімі тысенцамі-тысячамі, ага, каля двухсот даў, — гаварыў ён, а я амаль не цяміў усяго таго ягонага, маючы ўваччу пяшчанае плыткаводдзе пад тою страмізною (за яе гарбом узарваны сабор). — І гэта, ведаеш, мяне засмактала... Цэлае сваё жыццё будаваўся наш бацька, ага, цяпера і я! Ён не пабачыў свету, не пакаштаваў яго, і мяне тое ж чакае... Калі закончыцца гэтае ўгнезджванне?

— Не закончыцца, браток, — прачнуўся я з задумення. — Прынамсі, не пры нас.

— Чаму?

— Замест "чамукаць", ты лепей усвядоміў бы сабе, што колішняя курная хата — палац у параўнанні з буданом першабытнага чалавека! — я раптам адкрыў для сябе нешта простае, як праклён. — Панскі двор мы ўжо перагналі, го-го, і ўраджаямі, і выгодамі, і машынамі. І па-польску размаўляем, як у самой Варшаве! Гэтак мы, наша пакаленне. А дзеці нашы? Заварожанасць панствам ім стане не столькі смешнай, колькі наогул незразумелай. Ім будзе: давай Еўропу, во, Парыж і Лондан, і твайму сыну гэта твая мураванка з паверхам убачыцца дакладна так, як табе наша бацькоўская хата, ведай.

— Але ж чаго яму больш трэба будзе?

— Адкуль мне ведаць? Бедныя раўняюць на багатых, а багатыя ўсё багацеюць. Адкуль мне ведаць наперад, чым багацтва аслепіць нашых дзяцей або ўнукаў?! Заўваж — мы ўсё парабкуем, а аптымістычнае тут адно: на штораз лепшых умовах, — я перапаўтараў на розныя лады выказанае, заблытваючыся.

Брат плюскаў вачмі, як бы па-хітрэцку хаваючы найважнае.

— То ж але, — дакінуў ён сваё. — Стрымгалоў паперлі б срачы апаражняць за даляры... Найлепей так: рукі — у Амэрыцы, а зад — у Польшчы, ага.

Мы рагатнулі, трохі як прайдзісветы, якім знячэйна даказана нешта агіднае. Можа, каб адагнаць непрыемнае нам абодвум, а найбольш мне, ён паўсеў на цесця. — ...І з мяне будзе калісьці стары. Не дай Бог, каб гэткі на ўсенькія розумы надакучлівец! Яму, ага, нічагуткі не вытлумачыш. Ён заўсёды мусіць лепш ведаць ад цябе, а слухацьме тады, калі ты яго хваліш. Не чытае хоць бы газеты, якоесьці прароцтва яму ў галаве, даўняе... Іншы раз падумаеш сабе: зашмат наадбывалася на тым яго вяку, усё-такі ж столькі назмянялася ўсяго, што няхай нават і мне, яшчэ ж маладому, ага, і то ажно ў мазгах гайдаецца ад аднаго толькі цяперашняга, і таму, ці не ў бабцісты якія запісацца, каб з глузду не з'ехаць... — і, быццам забаяўшыся сказанага, з робленай паспешлівасцю абмацаў ён свае кішані, знаходзячы ў іх папяросы, запалкі.

"Як жа ўспрыме справу, з якою я тут да яго?" — і я ўважлівей услухаўся ў гаворанае ім. Сапраўды: простаму хочацца быць пад уладаю, што, па-праўдзе, і не дзіўна; сам жа быт і ёсць парадак перш-наперш. Чым цяжэй каму даецца хлеб надзённы, тым пранізлівейшая ў гэткага туга па адназначнасці — каб сысці з ростаняў на адну дарогу (часамі — без розніцы, на якую?). Магчыма, неабавязковай ёсць нашым бядота тая; пад старасць, напрыклад, кожнаму жадаецца таго ж. Або ў працяглую змору жыццём, пасля доўгага, пераважна няўданага, змагання за галоўнае.

— Ну, а што ў цябе? — ён пыхкаў сінявым дымком, неяк заўзята пазіраючы на сцяну. Прадчуўшы, што паспяшаўся з такім запытам да мяне, дадаў, бы ў працяг закінутае думкі:

— А ў каго вазьмі ды папрасі слова парады якое, дык зараз жа і пачуеш, ага, па-просту ці ў здогад, што няўмека з цябе ды дурань. Чаму вось, ага, так у нас? Я лічу, што цэлы гэты наш дабрабыт, так сказаць, пакуль... смаркацкі! Учыняем мы сабе Амэрыку на свой крывы капыл...

— "Бо я мужык, дурны мужык", — прадэкламаваў я, чаго ён, на шчасце, не дачуў.

Я ўражана аціх, падумваючы, зрэшты, і такое, што ён, мабыць, нечага начытаўся, разлёгшыся пад чарнасліўем на загуменні ў свята... Поспех будучых пакаленняў — махлярства добрасумленных? Наступнаму — старыя чамусьці вельмі вераць у маладых! — наканаваны ўсяго новы ўчастак таго ж шляху, і не бывае чалавек, які, няхай пад свой канец, не апынецца ў стане пачуццяў гэтакім, бы той, каго схапілі за горла або прынамсі абдурылі паганым чынам!

Дзеля таго і трэба трываць у — дакладней не названым — настроі гатоўнасці ўспрыняць благое?.. Няшчасны найчасцей той з нас, хто паспадзяваўся на большае (на бяздонне ж віры зацягваюць).

"Падабраліся мы, як тыя вароны ў дождж, — пасмяяўся я з сябе і яго. — І яму свет клінам сыходзіцца! Я не дамоўлюся з ім..."

— А ведаеш, той жылы сабе пападрэзваў, — сказаў я пра юрыста; брат меркаваў згадзіць яго, каб бараніцца ад гародняга падатку.

— Жыве? — суха перапытаў ён.

— Чорт пана не браў!

— Духоцце халернае... — тыльным бокам далоні правёў па ўзмакрэлым ілбе. — Выйдзем на падворышча, га?

Яму даўно трэба было наведацца ў Засценкі, заказаць шафу — у перадпакой і другую, у спальню; ён запусціў матор у ламачыне сваім, "трабанце" з адарванымі дзверцамі заднімі.

— Сталярыху пакажу табе там: гляне на цябе, дык адразу засукочаш нагамі, гэ-гэ-гэ... Дзе і падчапіў, грыб, ага, гэткую чаляднічку сабе, — гаварыў усё роўна, што самому сабе, з зайздрасцю або дакорам, нечага лазячы з кулачыстым французскім ключом пад машыну. — Парахно і падла, і скупы... Ён, можа ты чуў, пашкадаваў на майстроў, сам пачаў мураваць дом, і сцяніска, а ўжо да столі падводзіў быў яе, ага, узяла і паваліласа разам з ім, у сярэдзіну, дзе ягоная жонка якраз вырабляла свежы раствор... Не было чаго збіраць па бабе ў труну! — кавалкі рыштавання ляцелі на неба!

Калі ён дагаворваў мне пра тое, мы даязджалі да драўлянага маста на Супраслі пад Навадворцамі. Рагаталі, неяк пабрэхваючы: — Рга, рга-рга, рга... Певень, пер'істы ды набрынялы чырванню, ўзляцеў з-пад нашых колаў на плот арлом, столькі грукату разлягалася па брукаванай вуліцы ад братавай тае легкавушкі. — Куры перастануць несціся ад твае язды, — пажартаваў я. — А дзяўчынятам прысняцца кавалеры, — цалкам павесялеў ён. І мы аднова грымнулі "рга", як на якой вясельнай п'янцы; танцаваць па модзе не нам, а для беларускага спявання ўсё-такі мала ў нас адвагі: бярэм сваё, ганяючыся "пад сафары" (спаіўшы прадбачліва ўчастковага). Вуліца раптоўна паварочвала і, пакуль брат націснуў на тармазы, агледзеўся я ў нечых варотах, праўда, і без нас разваленых.

— Не першыня... Не трапячыся, бы голы ў крапіве, — супакоіў мяне, калі я ў паніцы выкрыкваў яму, не зводзячы вачэй з гаспадара, што насіў віламі салому ў хлеў. — Глухі ён, ага, не чуе то і не бачыць. Я ведаю яго.

Да столяра, аказалася, кавалiска дарогі. "Трабант" порстка праставаў дарожкамі і, калі ён паказаў мне праз шыбіну на кастражу якойсьці новасядзібы, кажучы, што яна таго ж менавіта, змаразіў мяне ідавок лішняга усяго тут, накшталт лому, які быццам дрэйфуе на хвалях па-майску ўспененага ды бясконцага ў той бок саду, поблізу берагоўя Багноўскіх ляскоў. Яшчэ на пад'ездзе туды супыніў нас рыклівы спеў. У расхлябешчаных дзвярах было відаць, што ў хаце бязбожна балююць, і брат, доўга не думаючы, выкіраваў машыну назад, пакідаючы глыбокія каляіны на аўсянай руні, што сягала ўпрытык да абочыны.

— Дзед пайшоў у водмаладзь, — выскаліўся ён. — Боўт, — дадаў.

Неслася адтуль: — Кум за сталом, я за сталом, сядзімо, сядзімо!.. Гарэліцу п'ём, гарэліцу п'ём! Кум за кіраўніцаю, а я збоку, едзямо, едзямо!.. Я на шасе, кум у адкосе, ляжымо, ляжымо!.. Я ў бальніцы, а кум у трупяніцы, будзямо, будзямо!..

Па кузаве шмарганула галлём; мы ўязджалі ва ўзлесак, затравелы, які ападаў у нізок; наперадзе мігацела дрыгвяністая азярына з пеўневымі хвастамі аеру.

— Пакурым, ага, — сказаў, застопарыўшы ўгрэтую машыну. Цень давала сасна, кучмастая крывуля. Мы паразлягаліся ў прохаладзі пад ёю, на ўздзірванелай паласе, пазіраючы ў блакіт вышыняў, адкуль праменіла супакоенасцю.

— Драпанулі мы, ага, як ад банды якое... Слухай, не сушыць часам і табе галавы: чаму гэта нашым людзям жывецца, бы на каменнях? Ты не прыкмеціў таго? Нібы і добра ім цяперка, ага, і то вельмі, — мурованкі, во, ставяць сабе, ага, і займаюцца прыбытковымі інтарэсамі яны, і гордымі, бач, як быццам парабіліся ўрэшце, аднак жа... Ведаеш, ага, усенька тое з прарэзлівым скрыпам выадбываецца, усё з той жа — ад бацькоў — запацеласцю, з тым самым выцягваннем жылаў з сябе, гаротнасцю. Рэвалюцыі прайшлі, ага, паночку, войны нашумелі, свет да непазнанкі іншым стаў, а наш мужык ад таго не вырас, не, калі не лічыць, што патлусцеў ён пад пана... Дзеці і яго не ўшануюць гэтак жа, як ён не паважаў, ага, высілку ўласных бацькі і маткі, ну, не? — — —

Брат гаварыў пра рэчы, да якіх ужо не знаходзілася ў мяне ахвоты прыглядацца (хіба ж навучана нас што-кольвек паважаць, апроч грошай?..). Я калісьці з запалам выкладваў яму слова ў

слова тое ж, тады гэта не даходзіла да яго. Нечакана для мяне, ён заеўся капаць усю тую ганебную праблемію, як нешта сваё, што і ўсцешвала мяне, і злавала уперамен, наклікаючы на маё адчуванне стомы такую казытку, ад якое бегала па твары нервовая ўсмешка. "Думаеш ды гаворыш сам пра нешта датуль, пакуль сутнасць таго не глынеш да апошняе крышынкі. Потым, пасля, як тая адрыжка, яно толькі затуманьвае свядомасць... Здараецца — у будучым здзівішся тым жа самым зноў, хоць напэўна іначай, паглыблены сталасцю", — пралятала праз маю галаву, калі наскочыла на нас нечае выкрыкванне, ну, так, у тэлефон:

— Hallo! А-алё!!.. Ciotuniu, to ty?! Здравствуй, to ja! Здравствуй, цётачка даражэнькая, mówię. Co чуваць у вас, pytam!?..

Брат пераваліўся на жывот, прыўзняўся на руках, чуйна ўставіўшыся некуды. Мяне душыў смех ад ягонага выгляду — нагадваў мне ён паршука ў лужы, якога патрывожылі. Мы выгледзелі, між рэдкага сасонніку, што воддаль, яснеючы асабняк з прыстойным плотам, агарод з кветкамі, ахайны садок. У расчыненым наросхліст ваконцы мансарды, збоч балконіка з відочным на ім столікам ды парай плеценых крэселцаў, круцілася дзяўчына ў купальным касцюме філіграннага колеру (валошкавага?), бачна маладзіца. Яна паварочвалася да таго голасу і пацяшалася з яго, сыплючы іскаркамі прырагатку. — І не боязна ёй тут, на бязлюддзі?

— Хацеў бы, нябось, з такою паначаваць, га? — маргнуў да мяне брат.

— За граніцу звоніць, пэўна, у Гродна, — я гэтак. Я вырашыў сказаць яму, з чым вось прыехаў да яго. — Слухай, хату па бацькох трэба затрымаць у нашых руках, і будынкі...

— А-яй-яй, якія грудзі ў яе ды задніčка! — Паддаваў ён сабе жару, добра чуючы, пра што я гэта да яго. Выплывалі яму на шчокі ледзь прыкметныя белыя плямы і я ведаў, што зараз у ім адбудзецца. — Хату табе, ага, хату... — устаў з зямлі, як пасля ўдару кулаком у яго, і накіраваў на мяне свой раз'ятраны зрок. — У мяне свая ёсць, а ў ёй да самое магілы работы мне! Ці ты ведаеш, што значыць у нас будавацца? Гэта ж паўжыцця каштуе! Так і лічы, ага: што ні мурованка — капец мужчыне, вітай дзядуля! Глядзі, што з мяне засталося. А я ж маладзей цябе на дзесяць гадоў, і павінен яшчэ...

— Чаго ты крычыш?! — І ён ураз апусціў вушы: стары



завяшчаў жа ўсё яму, бо я і так абсталяваўся на казённым лёгкахлеб'і.

Брату, відавочна, і надалей няўцям тое, чаго не даслухаў быў ад нябожчыка, — што: можна мець і са свае працы дом, бы шклянку, і легкавушку, і разам з гэтым ні трохі не жыць. Мы ж, здаецца, дабіваемся ўмоваў сабе як бы па-другагодніцку, не ўмеючы пакарыстацца тымі, якія засталі, зрэшты, і не разумеючы іх. Чаму з намі так? Ад інстынкту ганьбы гнязда? Строгі вецер веку паганяе нас гэтак ды падводзіць.

— Ты ж паглянь: птушак, і тых ёсць болей у горадзе, бо цяплей у ім і ежы па поўніцы на сметніках, ага, колькі асушкаў хлеба ды ўсяго! — Абрыд мне ён.

Запахацела дзікім лубінам. Паазіраўшыся — прыйшла да мяне нейкая ўпэўненасць у тым, што трэба спадзявацца на вялікае лета. "Вось, каб агароджу, такую сучасную, вакол бацькоўскага жытла паставіць, жалезную і на падмурку з камянёў, і абсталяваць санітарыят з ванным пакоем, і цэнтральнае абаграванне з чыгуннымі батарэямі, і веранду пабудаваць, а агарод з садам — на англійскі манер... Ён жа, хоць і брат мне, не падможа". Смутак насеў на грудзі і рабілася нават няёмка мне ад таго, што надумаў я дурыць яму галаву, урэшце-рэшт нечым далёкім, як паўзабытым і прыкрым абавязкам. І сам жа я не рады той бацькаўшчыне, — мазоліла мяне, што нельга ж яе пакінуць на пустапаш. Я, прытым, усё не мог раскусіць тае з'явы ўцёкаў людзей ад кроўнае зямлі, хоць розумам акуратна тое тлумачыў сабе, але душа бунтавалася супраць майго — газетнага ці як? — рацыяналізму. "Гарады нам гэта фабрыкі паляпшэння долі..."

Сцішнаватасць халодзіць табе нутро, калі ўявіць сабе незлічонасць пакаленняў, ад самае беспамятнае даўніны гараваўшых на тых палосках, на якіх нямаш і кумячка не перасыпанага вузлаватымі ад працы пальцамі, у ваколлях цэлых ды абшарах палёў, што зарастаюць цяпер выпадковымі маладнякамі, пералескамі. Сэрца сохне і цвярдзее ад таго, што чалавечнасць у чалавеку залежная ўсё-такі... ад жывата. Існаванне ёсць нечым грубым, як гвалт — сутнасцю ягонага працягу. Уражлівасць і прыгожасць немагчымыя без хлеба? Як не чуваць пра народы бедныя, але культурныя!

Ні стуль, ні ссюль, самому сабе да ўздзіву неспадзявана раз'юшыўся я ад злосці, такой набалелай ды ахапіўшай дрыжыкамі ўсё маё цела, і ад якой цудам устаяў, не грымнуўся вобземлю. Я выкідваў з сябе пашматаныя фразы (не зусім

заслужаныя братам).

— ...Ах, бачу я, абражае цябе мой клопат пра бацькоўшчыну!?.. Пакажы мне родзіча свайго і я скажу табе: хто ты!.. Ты ахвотней байструком хацеў бы быць!.. Цябе найагідная лаянка, без рэшты блядская, не апякае так, як беларуская мова!!!.. Так, не вырачайся... Халоп ты!...Падонак эпохі!.. Адукаванец, якому здаецца, што і тэлефон не разумее нашага слова!.. Забабоннік, якому мураваны дом патрэскаўся таму, што, што муляр быў з нашых.. Думаеш: напраўду ўжо вылез ты з гаўна? Сынок лічыць цябе, нават адкрыта, чарнамазнікам!.. І табе гэта падабаецца, бо ты бацька як бы князя будучага, ідыёт!.. І жонка твая, як ты!.. Абое рабое! Сучасныя парабкі, што не могуць жыць без пана, дык дзяцей сваіх панамі парабілі, цемната недавучаная... Бядота ты беларуская! — — —

Брат энергічна сеў у машыну і ад'ехаў.

Я доўга выплёўваў з сябе ўсенька і безразумна плакаў за свет цэлы.

Даваломся да прыгарадку, калі сцямнела.

У аўтобусе гарадской камунікацыі я напружана супакоіўся; у праходзе бушавалі маладзікі, па якіх адразу было відаць, што яны за падобнае хоць адзін раз забілі б мяне...

## УЗНІКНЕННЕ І ЗАНЯПАД АНГЕЛЬСКАЙ

Бадай што і няма ў гэтым горадзе больш задрыпанай за Ангельскую вуліцы. Сюды звалаклася калісьці басота з Царства Польскага, што пачыналася за лапскай Нарваю. Прываблівалі яе заробкі на жыдоўскіх ды нямецкіх фабрыках, якія муравалі на падсушаных багонцах над Белаю. Была работа таксама на вузлавой станцыі пецярбургска-варшаўскай чыгункі. У тутэйшай Літве набіраліся тыя палякі патрыятызму падпанкаў. Будучы людзьмі бывалейшымі, жылося ім адразу лепей. Набывалі, зазвычай, дзялку пад шаляваны дамок з ганачкам. Садзілі пару яблынькаў ля вокан і вішні ў плоце. Хлеўчык для парасяці, трусоў, галубоў і на вугаль збівалі збоч ад загонікаў (дзеля меншага снегу і большага цяпла яны апланоўвалі дзверы на поўдзень). Прыбіральню хавалі ад людскіх вачэй у малінавы закутак.

З беларускімі тубыльцамі яднаў іх спачатку касцёл і той самы ксёндз. Гаспадары з Беласточка, Бацечкаў, Старасельцаў, Антанюка, Дайлідаў і Выгоды ганялі дачок ад тых лайдакаватых кавалераў; сыноў палохалі "пранцамі", калі каторы ўтрэскаўся ў салодкую фахоўку. Вёску даканала, аднак, не тое; варочаць плугам скібы зямлі цяжэй, чым майстраваць і чамусьці меншы кус хлеба, трымаючыся поля і стадолы... Мястовасць узяла верх, а з ёю і Царства Польскае.

На Ангельскай зайгралі сялянска-работніцкія вяселлі. За пасажныя гектары ды местачковаю натугаю закрасавалі, бы мухаморы ў шэрані, камянічкі з паддашкамі для кватарантаў. Елі пабагацелыя, можа, не па поўніцы, але і не шкадуючы сабе занадта. Гароўныя маладзіцы дагаджалі пралетарскім выбраннікам (хадзілі тыя ў скрыпучых афіцэрках і ў галіфэ). Здараліся і прымакі, няшчасныя лапцюжнікі. Затое былі ў іх два выйсці: або запівацца па-фурманску і лейцамі вучыць розуму фанабэрлівую бабу, або свету не бачыць у пагоні за грашыма і несваіх дзяцей гадаваць.

Горад брыняў, займаючы палеткі. Трубілі на работу ўранкі, на абед і ў адвячоркі дамоў. Пабрукавалі былі: Аляксандраўскую, Мікалаеўскую, Пушкіна, Базарную. Туды і павялі вадаправод (пра каналізацыю яшчэ не чулі). А доўгую вулачку гэтую пачалі называць Ангельскай пасля таго, калі высыпалі яе жужалем; праехаў ёю аўтамабіль з якімсьці ангельцам, як казаў іванаваты ступайка.

Людзям, аднак, усё кепска. Не было і не будзе ім добра. Збурыліся раптаць на фабрыкантаў, біць вокны ў палацах, падымаць вэрхал. Жандары з казакамі — ўжо не страх. Пакаціліся войны, адна за адною. І каго толькі ліхі ні прыводзіў сюды, на Ангельскую; адно японцаў не пабачылі. У франты і паходы стралялі мужчынаў, калі каторы выдаўся пад шпіёна. Цікавых кавалерыі красуняў адпускалі з жыватамі (пакачаныя ўланамі вучаніцы варочаліся растапыранымі). Марадзёры дырдыганілі куфры ды захаванкі; грабасталі шкатулкі. Была Расея, прыйшла Нямеччына, мільганула Беларусь, з'явілася Польшча; чарга зноў паўтарылася потым (настолькі іначай, што загавелі душою жыды і прапалі немцы, а начальнікі і крамнікі пасмакавалі Сібіры).

Ва ўстаялы камунізм пагнілі платы на Ангельскай. У падзічэлых садках з удовінымі хатамі вуліца павясковела. Моладзь з даваеннага прыплоду, паканчаўшы школы ды ўбіўшыся на службу, перабралася ў бесклапотныя блокі. Ажывала

Ангельская ў мярліны; з'язджаліся парэпаныя аўты, тратуарныя панкі з кватэрнымі панюсямі і жулікаватымі смургелямі; тапталіся, бы жабракі ў прытворы, бесфасонныя сваякі з хамуцкага загароддзя. Пасля чаго сядзіба зарастала чартапалохам ( купцоў на яе не знаходзілі). Ажно ў нашы дні ўтрамбаваў усенька пад сябе новы, з прэтэнзіямі на метраполію, горад; напоўз ён ад цэнтру.

## НАВЕДАННЕ

Мне надарылася магчымасць паслаць да д'ябла дурату справаў і акунуцца ў безгалоссе зазімку ў нашых лясах. Шчасліва паслухаўся прыяцеля, які жыве на глухой станцыі пад Каралёвым Стойлам. Адзін з тых мастакоў-адзінотнікаў, чые палотны трапляюць потым у галерэю Эдуарда Торпа ў Нью-Йорку.

У дапатопным вагоне з пабітымі вокнамі ды паламанымі дзвярыма праняў мяне холад і я — даехаўшы — вітаў гарачую вячэру на стале з напаленай печкаю за маёй спіною. Ён участаваў дзічынаю з грыбамі і ажынаю; былі мянтузы і настойка з выспелай шыпшыны. І вялікі голад інтэлігентнай гутаркі.

Амаль усёй дамок займала ягоная майстроўня. Мы чамусьці спяшаліся выказацца, перабіваючы адзін аднаму. Пазаціхалі, быццам сцяміўшы, урэшце рэшт, што ніхто нас не паганяе і нікуды нам не трэба. Карціны, ім намаляваныя, не прыйшліся мне да спадобы. Я іх нават не разумеў, але яны прыцягвалі мяне нейкім, дагэтуль нязведаным смуткам, ад якога лепей ісці прэч, куды вочы панясуць.

Была і праходка поначы пабялелым гасцінцам і ў зорнасць. Узялі з сабою маўклівага, бы цень, аўчарыка, прывучанага не рэагаваць на небеларускія воклічы...

— У якое тысячагоддзе чалавек ачалавечыцца?.. Безнадзейны гэты хітрунец: з Хрыста зрабіў свайго фраера, даверлівага Спаса, якога бязбоязна ашукоўвае і бессаромна просіць штораз у яго прабачэння. Маральны бізнес з Богам…

Ад невыноснае маркоты мы загаварылі пра іншае, але настолькі вымушана, што ажно без сэнсу.

— Трэба так жыць, як жыццё бяжыць, — казаў я, усё роўна што дзеля паратунку. Маючы пры тым нахабнасць глядзець яму ў твар папоцемку.



... Пасля гэтага выезду прыбіўся быў да мяне сон, нібыта стаю я над пропасцяй у чужых горах і мярцвею ад жахаў! Пакінуў з'яўляцца неяк пад Новы год, у вэрхал справаздачнай акцыі.

## НА ПАРОЗЕ СТАРАСЦІ

І твае дзеці ўвойдуць у сумоту даросласці, бы вандроўнікі даўнія ў лес стараялінавы. Калі будзеш яшчэ жыць, дык паглядзіш за імі і нічога ўжо ім не скажаш. А яны ўсяго пачнуць здагадвацца ў тым, што і тваё жыццё не было надарэмным. І што апошнія наогул не бываюць першымі.

Успрыймацьмуць, а ці мала хто, свет белы так, быццам створаны ён у пярэдадзень іхных нарадзінаў і, вядома, досыць неразумна. Ажно прыйдзе і да іх той дзень і час, у які ціха скемяць пра паўторнасць сваю, як дачка пра замужжа ўласнае, зазвычай гэтак жа легкадумнае... А і пра тое, што — беларусам трываць, бяды ды паніжэння паспытаць трэба і ў гэтую эпоху абяцаную, каб хоць чалавекам і цяпер застацца.

І, як лета цяплынь узмацняе у нас адчуванне свайго існавання, і нам добра тады апынуцца на рэчцы ў лузе, калі яна якраз цямнее ад буры, што валачэцца ды грыміць над лясамі, — так супакой жа нейкі блаславёны сыходзіць з вышыняў нават ад думкі аб тым, што, відаць, у даўніну таксама найболын купаліся ў плыткаводдзі менавіта малыя, гэтыя стварэнні шчаслівасці, пры якіх абнаўляемся ж, праўда, усё часцей успамінамі.

Яны, ці бачыце, чужэюць, бо ёсць жа самі навіною, сутнасць якое ў змене чагосьці істотнага. Каб толькі да лепшага — вось няўпэўненасць веквечная.

## СУПРАСЛЕЎСКІ ТРЫПЦІХ

### І

Жылі-былі людзі тут і заўсёды, як дзень залатаблакітны прыходзіць ды ноч зорная настае. Верылі ў дарунак дажджоў у веснаполі на ўмалот зернехлебны і ў ласку бору жывічна-мядовага, і ў рэчкі бруіста-рыбныя. А яшчэ ведалі, напэўна, што

без працы аніштo не спорыцца; сваім жа мазалём — не крыўдаю чужою — народы ёсць слаўныя. Выходзілі прашчуры нашы з сярпом маладзіковым на нівы ў Юр'еў абход блаславёныя, пакланяючыся Усявышняму за сяўбу дабрачасную, за калоссе буйнае, і за тое таксама, што пот ненадарэмны. Быць патрэбным не аднаму сабе — гэта даступнасць да вышэйшага сэнсу існавання непустога і да шчаснасці даўгавечнае на ўсе леты судканыя.

Як без вады ўсякае жывое прападае, а крыніцы яе з глыбіняў тхланных бяруцца, так і з мудрасцю, пачатак якое ў Слове, а Яно было сказана, і навучаліся Яму шчыра-незабыўна. З Ім гэта ж агоралі злыбеды і нашэсці, пакуты розумаў слабых ды сэрцаў упалых, не даўшы ў ганьбу і няволю род наш старажытны, дум ягоных высокія памкненні архангелам белакрылым ахаваўшы. І губляючы Яго ў сумятні будзённасці няўважлівай, калі подых мяртвоты твар холадам абдасць, спасу шукаем, светлячка алтара нязгаснага, і пісанне божакніжнае цалуем губамі спажывы духоўнае прагнымі.

Колькі ні нараджаемся ды адраджаемся, гарыць зорка адна тая над намі, і за ёю дарожымся мы ў старонне супраслеўскае, да Цябе — Віфлііеме Русі маёй Белай.

II

У пустэльні ціхамірнай Гаспод Бог пасяліўся, на самагрудзе стромістым у даўніну нецяперашнюю. Паміж лясоў неаглядных святлом заззяла нештадзённым у гэтай краіне нам панурай, ад людства адрынутай. Святыня Добрай Весці ўзвысілася ў падхмар'е смутнае на вякі адвечныя, ад тады і назаўжды паднябесныя. Праяснеў жа воблік продка, лёсам зацюканага, ад беспрасвецця ўдзічэлага ў жыццё малавернае. Душа яго акрыяла, сэрца птушкай забілася, голубам узляцела анельскім, а ў вачах — дабрыня расквітнела васільковая. Цуд у ім, чалавека ў чалавеку, збыўся, самы чаканы з прычаканых, вялікі з найвялікіх — хрыстападобны!

Зямля тут наша айчынная, да крыві касцей родная, са светам з'ядналая ахвярай падіконнаю, адданасцю ўсёцялеснай. Быць нам на ёй, як Госпаду ў вышынях, як памяці ў людзях, як несмяротнасці ў бясконцасці неспасцігілай.

Да Супраслі я іду, да Цябе — Іярдане Русі маёй Белай.



III

Ішоў час агромністы ў край наш забыты, векаванню тубыльчаму надаючы значэнне непрыгуменнае, не адно застольнае. Лясун выглянуў урэшце з ялінаў кашлатых, з ягаднікаў чарнічных сыйшоў, як і заполянік з гоняў жытнёва-далечных, каб зрокам душэўнасці абуджанай угледзець, што быццё чалавекападобнае ёсць не па-звярынаму выпадковае. І не лысая гара, што паміж рачулак з дрыгвянікамі, з небам гаворыць ды не князь у гароднішчы спадаром над спадарамі; не Пярун маланкаю паліць, грымотна ў навальніцу гайсаючы.

Богі прыдуманыя, стварэнні бястварыя, погразныя неўгамонна ўсе да апошняга валадарылі фікцыяй няўмольнаю ў апраўданне язычніцкае ад свету незразумення. Каморнае цемені дамавіковае баяліся, і водарасцяў русалчыных у купанне жнейнае ў плыні зелянiстай пад стромаю залужнай. Ад усякіх уцякаць, а жа ж нікому не давяраццa ўзвычаеныя, слухалі навуку Хрыстовую, як байку нерэальную, таму і прыгожую... Ажно адкрыліся ўсцяж душы-сэрцы зацямнёныя, бы ў пагоддзе павяснелае, калі вербы маладалістыя суцяшальны знак абновы падаюць; рукі натруджаныя да іх галінак ажыўшых працягваюцца.

Ад тае пары што ні год вітаем мы Госпада, які дорыць нам узрадаванне зямное і задзіночанне ўсёпакаяльнае ў любові выбачальнай, хоць на памятны міг збаўляючы слодычна ад нянавісці пякотнае, усячыны непрыстойнае.

У тую часіну ў Супраслі быць мне ўквечанай, да Цябе я ў думках імчу — Іерусаліме Русі маёй Белай.

## СМЕРЦЬ ВЯЗА

У другі дзень польскага Вялікадня рэйсавы аўтобус, што выязджае са станцыі адпраўкі ў шэсць гадзін і дваццаць хвілінаў вечара, рушыў у дарогу чамусьці з апераджэннем графіку часу. Шафёр — яшчэ хлопец — круціў радыёпрыёмнік у пульце, пакуль не знайшоў рок-музыку на іншаземных хвалях. Пасажыры ўсе старыя; дзедаватыя мужчыны — падпітыя, яны крыху пасвяткавалі ў меставых дзяцей ды ўнукаў. Не чулася звычайнай у будзённых падарожных размовы. Панурыўшыся сядзелі; адзін

несціхана цямкаў, бы немаўля (засынаючае пры грудзях маці).

Ад палёў дзьмула ў шыбіны веснавым холадам з кропелькамі маладога дажджу. Прыцяплела, калі за Супраслю пачалася пушча. Недзе на пятнаццатым кіламетры шашы праз яе, ля лугоў Сакалды, гібела вёсачка (старажытнейшая за Амэрыку) На гэтай земляробчай паляне, абрубленай сумотнымі ялінамі і кудлатымі соснамі, выйшлі на прыпынку, што перад мостам, дзве бабулі. Па тым як паклыпалі — кожная ў свой бок — за паваленымі платамі, я дадумаўся, што ў марудныя ім ночы сцішна сварацца яны са сваімі нябожчыкамі, і тыя ад злосці грукаюць дошкамі ў гнілым шчыце, у ападаючых апухах, або крычаць цёмнай птушкаю ў абваленым хлевіску...

Паднялася віхура ад Вярхлесу; шугала на тракт, віруючы леташнім лісцём асіны і бярозы (бяспечнае такое з вокан маторнай аграмадзіны). У Паўночным Востраве ляжаў упоперак вуліцы голы вяз. Бездапаможнага, быццам даўнюю памяць, агледзелі яго зблізку, хто хацеў; прыйшлі мардатыя мужыкі з сякерамі ды піламі (пэўна, праваслаўныя ў так вялікае каталіцкае свята). Дрэва парэзалі ў метры і можна было праехаць на Шудзялава і далей. Работу канчалі гэтак жа моўчкі і толькі той наш шафярняк закінуў да кагосьці слоўцам, але, ці то не дачулі, ці бо не схацелі... На небе праяснела. Вялікая Мядзведзіца свяцілася акурат над зборышчам, усё роўна што цікаўліва заўзіраўшыся з вышыні на выпадак у шудзялаўскім канцы Паўночнага Вострава. Аўтобус ад'язджаў з нейкай панікаватай хуткасцю, а яна — глядзеў я з задняга крэсла на яе — не кранулася з месца. І паўстаў мне ўваччу неверагодна далёкі спад лета з начлегам на сене ў зорнасць: не спалася тады ад ціхуткае радасці, ад якое пранізвала ўсяго мяне жаданне доўга і соладка плакаць... Гэта шчаслівасць быцця, зусім неразумна даверлівая, а як жа памятная!

## НА ГАНКУ Ў ПРАДВЕСНЕ

Вясна ў той год ішла марудна і з халадамі. У месячныя ночы з'яўляліся прымаразкі з інеем, ад маянтковых сажалак далятаў крык вялікай птушкі. У хаце было цёмна, не хацелася запальваць святло. У бок Астравоў то гудзеў, то заціхаў трактар, быдта сувязны кукурузнік над партызанскімі лясамі ў забытую вайну. Не браў сон, а вышаўшы на ганак, можна было пачуць



нізкі і хуткі лёт дзікіх гусей, відаць, на Свіслацкія багны. У такую ясноту страшнавата на падворышчы, ад густога ценю хлява і стадолы, пад якімі, здаецца, нехта чакае цябе...

На Выганскай вуліцы, зусім унізе, загаварылі мужчыны ( настойлівы сіплы голас). Дзіўна, бы жывы смех у смутны сон, хоць і бяссэнсавы, але ўсё роўна невясёлы. Прыбілася ў галаву сцішнае, як лятучая мыш: "А ці ўжывешся з кімсьці, хто няздольны быць рады не ад сваёй удачы?" — ужо няшмат пытанняў пасля гэтага.

Застацца дарэшты аднаму-адным і пра нішто не думаючым, зрабіцца непатрэбным нават самому сабе, аж абыякавым на голад і холад, — гэтак ад стомы жыццём. Яна пяройдзе, накшталт застуды якое. Не бясследна, аднак жа, усё пакідае нешта за сабою. Так поўняцца гады кожнаму, — каму памалей, у таго і больш трывушчасці. Мудрасць гэта, каб пабыць на свеце не спяшаючы? Хто яго ведае... Ну, а з кім? — дапытлівасць, якой няма толькі на могілках.

...Асела ціш, цемнач ані варухнецца. Свяціліся лямпачкі, рассыпаўшыся местачковым Млечным Шляхам у чорнай бясконцасці, якая прападае тут у світанак з трэцімі пеўнямі і пры першай гамане ля калодзежа ў сялянскім завулку.

## АДЛЁТ БУСЛОЎ

З вясною буслы прыляцелі, як анёлы белакрылыя. У нябессі перадвелікодным кружылі, а мы стаялі на падворышчы ды глядзелі на іх. — Будзе ў цябе брацік, — пажартавала з мяне маці. — Поле уродзіць, — сказаў бацька, не апускаючы галавы. А мне хацелася на луг, папырскацца ў цёплых лужынах.

На буслянку яны сваю вярнуліся з краінаў егіпецкіх. Шлях да дома роднага адшукалі, аднак, не забыліся. Як у напамін чалавеку: без айчыны можаш толькі наесціся.

Аралі і сеялі людзі, жытка жалі і хлеб новы пяклі. Богу маліліся, песні на вячорках спявалі; жанілі ды хрысцілі, хадзілі — таксама — на мярліны, праводзячы сваіх на вечны супакой. І хоць пачалі пакідаць вёску, прамяняўшы яе на горад, смерць усё роўна не адступалася ад іх, як і звычайная бяда. Гэтак жа аніхто і ніколі не ўбачыў мёртвага бусла, кажучы, што памірае ён у палёце над сінім морам, ад разрыву сэрца з тугі... Ажно адзін

застаўся на зіму ў нашым старонні, прыбіты кімсьці цяжкагрэшным. Шкадуюць яго, баючыся паратаваць святога птаха, бо, можа, знак гэта гасподні канца свету. Час ужо, каб надыйшоў разам са згіненнем апошняга гаспадара, што глуха кашляе ў гібеючай хаце.

## СПАТКАННЕ Ў ВЕНЕЦЫІ

У мітусні на чыгуначным вакзале ля Санта Лучыя ў Венецыі сутыкнуўся я з сін'ёрытаю, якая, як бліск маланкі, спаслала мне дзявочую постаць забытай Нінкі. Здарылася тое ў імгненным арэоле ад хвіліннае інтымнасці. Пакінула пах недарагіх парфумаў, вабную пухкасць ад дотыку кудзеркаў, нецярплівую задыханасць боскага стварэння; яшчэ і адчуванне цялеснае гарачасці. І ў нечым славянскую, аднак, мяккасць у перапрашальным "эскузо!". У слыху застаўся стукат высокіх абцасаў яе туфелькаў, калі бегма знікла яна ў вагоне эўрацягніка ў Рым.

Я ўжо вяртаўся з Італіі, стомлены звычнай у ёй антычнасцю вакол. Таксама — класічнай прыгажосцю патомных жанчын. І раптам — Нінка, уся ў беларускай маладой нясмеласці. З невытлумачальных тут Вялікіх Азяранаў над Свіслаччу, што ў баку, адкуль ішоў Атыла. Рупіла сесці, нарэшце, у польскі авіялайнер, каб з бруднай Варшавы апынуцца ў сваім старонні. У зарэчна-лугавым, з бульбаносымі тубыльцамі, у якіх гэтак жа крыклівыя бабы пад неэратычную старасць.

У сін'ёрыты ўсё ж і няўлоўная неітальянскасць, магчыма, балканская ад прымежнае Славеніі? Заіскрыўся здогад наконт таго, чаму я ў Венецыі пачуваюся па-хатняму ды чуллівей разумею тутэйшы дыялект...

Едучы ўпонач кур'ерскім цягніком у Мілана, адкуль полуднем адбыўся вылет, прыснілася ў пасцельным купэ Нінка: стаяла вясковай маладухаю на падмостках Санта Анджэле, за павароткаю Каналь Грандэ. У чаканні мяне, выфранчанага на шпану ў заазяранскім мястэчку часоў дэкадансу сталінізму ў тую глухую палову нашага стагоддзя. Але, маладушна спужаўся я сыклівых ракет, асвятляючых яе, і чамусьці савецкіх тут пагранічнікаў з татарскай вузкавокасцю, што відавочна таіліся за шырокім вэлюмам шляхецкай кройкі ... Санта Мадонна і Ўсе Святыя, няўжо Другое Перасяленне Народаў і зноў загарыцца Еўропа!? — — —

Я ледзь давалокся да гатэлю Стар, на вія дель-Босі.

## СКАРГА НА ГІСТОРЫЮ

Пішу я скаргу на Гісторыю, бо яна нам, як пані тая вялікая!

А мы ж так верна ёй служым працаю потнай ды і адданнем цалюткім, і ўсенька, што толькі трэба, робім жа і робім. Целам і душою парабкуем з кідкай ахвочасцю на тых прасторах ейных без канца і краю, колькі адно змогі тае ў жылах маем. Нават і не прызнання банкетнага за тое ад яе мы чакаем, але каб ласкава хоць слоўца пачуць на сконе дзён сваіх. Без абразы і з надзеяй шчыра-сардэчнай пазіраем на палацы гэтыя ж светлаваконныя, прадзедамі нашымі чорнарабочымі яшчэ ўзбудаваныя тут, у якіх грымяць аркестры гадавінныя ды па-бальнаму святкуюць дзеля векапомнасці ўдачы ўсё чужыя, аднак жа. Часам і мы возьмем ды закруцім польку-янку на радасць плебейскую ў наваселле новабагатае, і тады даверліва пэўнімся ў тым, што моцна пашанцавала людзіну таму нашаму якраз вылупіцца, нарэшце, на свет белы, калі скінулі спачатку хамут яму з шыі замуленай да лішаёў, а потым бізун цівунскі адабралі з рук падпанка ягонага. І здзіўляемся, што ніхто чамусьці не віншуе нас са шчаслівасцю гэтакай, ды і самі мы, бадай, — здогадам не дурня аб тым, што няма чым хваліцца, — тоімся з ёю ж патроху, бы з грашом нейкім дарагім, усё роўна што той, хто спападаў быў выпадкам яго на тракце карэтамі ўезджаным.

І Гісторыя вось зусім не намерана перастаць быць паняй нам, можа, і добрай такой цяпер, як гэта некалі ў Беларусі бывала, і таму, здаецца, а чаго ж болын хацець ?

Матачкай мы яе клікаць гатовы, па навыку кроўным ад дзяцюкоў колішніх у світцы ды лапцях веквечна, і ад таго ж таксама крыўдаванне камяком расце мне ў горле, бо не надта каб справядлівай яна ёсць дзецям родным, а найменшанькае з іх, беларускае, даўно павінна да грудзей прытуліць, песню часу і яму праспяваць. Але дзе там, усё пра старэйшых думае і калоціцца, пра іх гэта клопат увесь яе без упыну, ды што лепшае ім жа падсоўвае, быццам жыць яны іначай не змаглі б.

Сэрца ад жалю паліць, а ў душы ные нешта нясцерпнае, і свет клінам мне сыходзіцца.

Я поўны скаргаў на Гісторыю!

# II

## СУСТРЭЧА СА СВІНСТВАМ

**Я** ўгледзеў яго ў аўтобусе гарадской камунікацыі з Выгоды: нейкі такі пасабачаны. Паглядзелі мы адзін на аднаго і нічога не сказалі; паміж намі нешта заперлася капытамі. Падумалася мне: пайшоў ты чарцям на спажыву!

На прыпынку, што ля забягалаўкі "Сонейка", ён хуценька зышоў мне з вачэй і застаўся на тратуары. Яму, відаць, трэба было яшчэ ехаць; яго прыпынак — ля ваяводскага суда.

Сапраўды, мы змоўчалі перад сабою. Па-праўдзе, ён мне нічога кепскага не зрабіў. Мо часамі падумаў паганае — ды мала чаго прыходзіць чалавеку ў галаву пра іншых... Хутчэй гэта я пахіснуў ім, ды так, што ягоную кар'еру малавеле з коранем не вываліў; з мужыцкаю зацятасцю, але ён не ведае аб тым і нават не здагадваецца?.. (Даўно тое было, сам ужо добра не памятаю: дакладна калі? Мо і таму, што ўспамінаецца мне яно, ці не штодзень, адзін чорт ведае колькі гадоў! Сталася гэтае ўспамінанне амаль рысаю майго характару).

Я паглядзеў тады на яго менавіта з гэтакай крыўдай, ад якой адно заціскаецца кулак: ты зрабіў мне свінства! Якое? Я якраз не ведаў, але адчуваў, што, аднак, зрабіў!.. Ён выходзіў з аўтобуса, быццам цюцік з сенцаў на панадворак. На такога сабаку няма патрэбы крычаць, даволі паглядзець яму ў сляпні, гэтак з дакорам, і ён адразу павернецца ў дзверы. І выйдзе.



Стаяў вось на тратуары, павярнуўшы сваю галаву так абы-куды. Аўтобус крануўся быў далей, а я нахіліўся да вакна і ўсё глядзеў на тую яго галаву, павернутую невядома куды, на гэтае, як я ўяўляў сабе, жывое свінства, і мне было ўжо ўсё роўна, ці калі даведаюся, менавіта, чаго дапусціўся ён... Я прыліп; ён паклыгаў у цэнтр горада, бы турыст з нечым цяжкім за плячыма, які пабачыў нешта ашаламляючае і цяпер ідзе ў пошуках кафейкі ў завулку, каб сесці там у куточку ды перадыхнуць, перадумаць сёетое, сабрацца з духам...

За паваротам вуліцы ён знік мне. Я вытрэшчваўся, пахілены зусім да таго вакна; здавалася, вось-вось вынырне ягоны твар у далячэючым натоўпе. Ад такога майго чакання прахожыя сталі як бы клыгаць (бы набітыя), збочваць і горбіцца. Нейкі тоўсты тып з пухлым партфелем пад пахаю як бы рохкае (у яго выгляд кармніка, які перастаў адчуваць патрэбу рыцца).

Мною хіснула на падлогу, але я не ўпаў, ухапіўся за чыёсьці плячо і таму не паваліўся. Той хтосьці зазлаваў на мяне, сказаў:

— Вы п'яныя! — назву "п'яныя" ён амаль выкрыкнуў.

— Выбачайце, — знябожыўся я. — Вельмі вас перапрашаю... Вельмі! — слова "вельмі" я, можна сказаць, таксама выкрыкнуў.

Аўтобус супыняўся; урэшце ён зарыўся як быццам, побач таго ж прыпынку, што ля суда.

— Я вас вельмі перапрашаю! — паўтарыў. Той не слухаў мяне, ішоў да выхаду: быў пагорблены ад крыўдавання. Усе паглядзелі на мяне, і я захліснуўся ад сораму; раптоўна ступіў за тым, што выходзіў на тратуар тут, пад вецер, які скакаў да вачэй.

Бяздумна заўглядаўся я на бязлістае дрэўца, трохі пад ногі і на плечы зграбнае жанчыны. Гэтак жа рушыўся пераходзіць вуліцу, пасярэдзіне якой спужаўся быў глыбіні Нарвы: перад носам у мяне шмыгнула легкавая машына, падаўгаватая, з бліштастым жыватом.

Дайшоў я да тратуарнага берага, а на ім — урослыя боты міліцыянера. Я іх адразу пазнаў: прытупвалі ад злосці.

— Вы, пане, што гэта думаеце сабе! — сказаў яго голас над ботамі.

Я падняў галаву.

— Пакажыце пашпарт!

Я паказаў.

— Гм, — міліцыянер чытаў у ім. — Настаўнік вы, значыць, з вёскі.

Я не адказаў яму. "Чаму настаўнік можа быць толькі з вёскі? — падумалася мне. — Як нейкі ксёндз."

— Заплаціце штраф, — ён выпісаў паперку на пяцьдзесят тадышніх злотых.

І я заплаціў.

Ішлося мне неяк лягчэй, бытта гэта перапыніў быў мяне цудоўны сябар і загаварыў: "Здыму з цябе адно свінства, і выкіну яго вон! Во, сам глядзі..." Хацелася зарагатаць ад таго: свінства — як хвароба, якую можна залячыць, але — ніколі не вылечыць! І аб гэтым ведае нават абы-які лекар... То зноў хацелася мне вярнуцца да міліцыянера ды насварыцца на яго: "Вы дурны, пане міліцыянер! Вы пакаралі мяне за парушэнне правілаў вулічнага руху, бо я перайшоў скрыжаванне пры чырвоных слепняках, ха-ха-ха... Вы, пане міліцыянце, не ведаеце, колькі іншых правілаў парушыў я, — напрыклад, сяброўства, га? Вам не хапіла б блакнота на штрафы, вам не хапіла б... эх..."

Я вяртаўся хворым. У маіх думках калацілася нешта такое, чаго я доўга не разумеў. "Пры чым тут міліцыя? Ну, сам скажы: пры чым? ... Ну, пры чым?.. Ну..."

Я па-сабачаму нырнуў у пад'езд сваёй кватэры, хвастом павярнуўшыся да па-пчалінаму растрывожанай вуліцы.

## ЦЫВІЛІЗАВАННЕ САКОЛЬСКАЙ

Маё з'яўленне на свет выклікала цывілізацыйны пераварот у нашым канцы Сакольскай вуліцы ?

Жылі Яновічы-Антошкі дружынаю ў мінулавечнай хаце з хлявом, ля азярышчанскага выгана з глыбокім ровам ад палёў. Спакойна, калі памёр дзярлівы дзядуля Антошка, (яго ў карчме прыбілі гарэлчыныя сябры). Брат майго бацькі ўдаўся зусім ціхіняю і жанілі яго два разы. Другою жонкаю ўпёрлася яму знароўленая паўінтэлігентка з мужчынскаю ўхваткаю, што за палякамі засядзелася без занятку з паперамі расейскае сястры міласэрнасці; падзарабляла абортамі. Прышываныя мяшчане тут далі бабе празыўку — Вонсы. Шляхецкую для смеху з камандзерскае старое дзеўкі з валосікамі пад носам.

Учынілася цесна не толькі таму, што я ўсё хварэў і надакучліва плакаў. Пасыпаліся дзеці і ў Вонсы. Яна, не будучы зацюканай мужычкаю, падбала пра будучыню ім: потайна апланавала спаліць саламяную калноту Яновічаў. Каб пажар выпаў верагодна і выплацілі страхоўку, трымала язык за зубамі і падпільнавала, калі мая маці рашчыніла хлеб пячы. Заранёў павязаўшы сваё дабро ў вузлы.

Каб не суседзі, нашы не згледзелі б за работаю, што гараць. Пагодным днём страха ўжо добра палыхала над імі, ажно гудзела! Вонсы тым часам адна з усенькім паспела на аселіцу, выправіўшы свайго чалавека ранкам баразніць бульбу пад Александроўкаю. Першым прыбег на бяду буславаты Манах, але, нешта знюхаўшы, кінуўся назад і неўзаметку дым ахутаў і яго кучу. Ад рынку заеліся трубіць ды ламарэндзіць па бруку пажарнікі з помпаю і з бочкаю вады на калёсах; пекна камандаваў імі Жоржык-Лялечка ў серабрыстай касцы. Да Манаха дагопаў жыватасты Булава з драбінаю і вядром, што жыў у парабкоўскай развалюсе каля сэрвітутаў, але яго пугнуў ён, як сабаку! Булава, пакуль здзівіўся, усё зразумеў; сакольнчанскія славіліся кемнасцю і сюды пайшла замуж нават жыдоўка, рабацяшчая Лейзаранка.

Пакруціла ў неба чарнотнаю хмараю, бухнула полымем, затраскацелі кроквы і ў Набіноса, і ў Карабельніка. Трапятаўся ад нерашучасці акулярысты Рухаймозг... Булава над сваімі галавешкамі здумаў крычаць нямым голасам, у якім і сам Госпад не дачуўся б фальшы; жонка з іконаю перад сабою бегала вакол агню. Жоржык-Лялечка запыніў сваю каманду ды раззявіўся. Умомант абступіла яго местачковая галота, што назбягалася адусюль, і нагадвала гэта крыху евангельскіх рымлянаў, упалоханых нападам варвараў на правінцыйны *urbi* са жменькай легіянераў...

Паліцыянты прыпазніліся. Адышоўшыся да кузні Мондрай Гловы, яны па-генеральску вытрэшчваліся ў біноклі. Ад вірлівае гарачыні ўзняўся вецер, зашугалі вогненныя жмуты. Начаўплі гевалту крамнікі, гаманлівым кагалам абселі свае ханайкі, ратуючы ад запалу. Пажар не дакаціўся да Палесцінскай, пайшоў на спад.

Страхоўку давалі ў магістраце як каму: Яновічам цалкам, нам і Вонсы. Настала пара будавацца. У падлеснай Грыбоўшчыне прарок Гальяш распродваў свой горад Вершалін. Разагнаўшы шпаркім ядлоўцавым дубцом апосталаў, святы збываў завідлівыя хаты з шырознымі вокнамі, з падлогаю і пад чарапіцаю. Сакольцы абдурвалі яго з польскімі грашыма, на якіх не знаўся. Днямі і начамі перавозілі абозам перасыпаныя сцены,

бэлькі. Кафлёвыя печкі. Трохі баючыся, каб ён часам не раздумаў. Шанц удаўся найперш Манаху, які ўмеў загаворваць зубы Святым Пісаннем.

Вонсы панатурылася ўставіць у сябе венецыянскія вокнішчы, рыхтык царскія, бы ў яе кнізе з малюнкамі князёў і княгіняк. Можа быць, так і зацясалі б, калі б майстры не скурылі тыя паперкі... Здарылася з імі яшчэ непрыемнасць: мандакавалі, каб не ставіць асобна хлявы, бо ў маразы цяплей начуецца з авечкамі, суха і мякка. Затое абсмяялі яны Булаву, які натапырыўся наваліць гліны на ўкладзеную яму падлогу (хацеў мець па-даўнейшаму). Сакольшчанскіх багатыроў закасаваў цяпер, аднак, Карабельнік, заказаўшы ўмясціць на гарышчы пакойчык з ваконцам. Летам жыцьму ў ім, тлумачыў. Карабельніку, як Карабельніку, не верылі і пляткавалі, што будзе мэнчыць там удовы, здаля ад вачэй хваравекае старое...

Падняў лямант недапечаны Франак-Анёл. Шалёнаму заманулася справядлівасці Гальяшу і кляў ашуканцаў. Абзвягаў Манаха, напляваў на бараду Булаве, парнуў кійком у пуп Набіносу, а Карабельніку намазаў глеем на дзвярах чорта з рагамі і голую Еву. Яновічаў ён не чапіў, нашых і Вонсы. Шанцоўнікі — урэшце — падкупілі лахмана залатоўкамі на імшу, і той даў ім слова замаліць перад Богам іх лайдацтвы.

Слаўна ўбудаваліся! Мой дзядзька ставіў фасонны плот, але яго Вонсы крывілася на штыхеты з вярхамі кшталтам бубны (не пераносіла карцёжнікаў). Настойвала на форме сэрцайка. Перарабляць аздобіны не хацелася яму, за што дастаў ад яе абрэзам па гарбе. Ён пасыкнуўся быў даць ёй аполкам, аднак жа паказала яна сябе школенай у паядынку. Раскірачыўшыся, бы крыжак пад Грунвальдам, выбівала з дзядзькавых рук усё, чым замахваўся. Ляскатлівая бравура не цягнулася доўга і, безабароннаму ўжо, уляпіла па шчацэ смачную аплявуху, усё роўна што нейкую прэмію. Маўклівы і задыханы заенчыў ён, што няхай той бык здохне, якога пабарола карова, і сапраўды прапаў у нямецкую неўзабаве вайну.

Балячкаю на азадку кожнаму муляла праблема нужнікаў. Бурмістр прымушаў збіваць з дошак тыя шпакоўні, лупіў штрафамі. Людзей брала злосць або рогат. Да тых, хто паслухаўся яго і змайстраваў гэтую непатрэбшчыну, паўнаджваліся свінні, што пагражала ганебным калецтвам (асабліва мужчынам).

Заставалася тое, чаго не надта прагна ўяўлялі сабе на



Сакольскай: мыцца па-панску. І хоць маянтковыя курвы займальна распавядалі на гэты конт ды, усё ж, чым дакладней, тым менш было ў тубыльцаў ахвоты слухаць таго. Адзін Карабельнік захапіўся быў. Ванну ён, праўда, бачыў у бурмістра, але больш яна яму спадабалася як вадапойны жолаб каню і для быдла; сам не палез бы ў яе, быццам той угрэты кныр у лужу. Рухаймозг падказаў яму пачапіць на жэрдку поўнае вядро і — шнурком нахіляючы сабе яго над галавою — паласкацца ў жніўную спёку. Простая інжынерыя чыпела, пакуль не грымнула звысоку па чэрапе... Пра іншых гігіеністаў не чувалася.

Не адно ў натруджанасці жылі. На Багача абавязкова пылілі на прывыганні музыкі. Рэзаў на гармоні валачашчы Мазоль, у бубен грукацеў ягоны байстручок. А калі пры немцах народ распіўся самагонкаю, сенсацыйна буянілі на Валоссю, ад якое пачынаўся вялікі пост. Мазалю было тады жніво: у каго зарабіў, у каго прыкраў і такое бяды. Хадзіў ён з тым хлопчыкам трохі як калядоўшчыкі; яго пасцельныя анекдоты прыдавалі сэксу манатоннай алкагольнасці і ўдзячныя тады гаспадыні не шкадавалі яму за гэта эратычна закругленых кілбас ці па-ратайску важкага акрайца сала.

Малалеткі не былі такімі еўнухаватымі, як цяперашнія. Гэта нічога, што не разумеў я клятых назваў геніталіяў, але нарачоную сабе назначыў. І як заўсёды ў сваю, яшчэ няхуткую, маладосць бяздумна. Нашмат старэйшую і недаступна дзікую — аказалася пасля — згвалтаваную артылерыстамі-мазурамі, што акапаліся былі за будынкамі і падбівалі савецкія танкі ў жытах, якія ў тадышняе адступленне праставалі на Гродна...

Але занадта далёка я ўжо забег дапераду.

## НЯЎДАЛАЯ ПАКРАЖА

Ехалі на Верхлес. Грузавічок знаёмца ламарэндзіў. Над трыбаю ўжо віселі зоркі, яшчэ бледныя ў надыход ночы. Вуркат занядбанага матора надаваў рызыкі папасціся лесніку.

— Пастанем, — сказаў знаёмец і скрыгатліва спыніў машыну.

Абодва мы, я і ён, павылазілі з шафёркі і, разглядаючыся ды паслухваючы, закурылі.

— Лес ціхі ў такую пару, — зноўку азваўся ён, маючы на

ўвазе далёкую чутнасць нашае язды. — Паветра сырое, нясе, як над вадою...

Блізка і коратка затрашчаў сухапад. Я міготка вытрашчыўся туды, у кустоўе пакрай вырубак.

— Казюля, — супакоіў ён мяне, — цікаўлівая, бы авечка... Ну, паехалі, — акурак утаптаў у пясок і гультаявата ўзяўся ўсядацца за кіраўніцаю, аж загайдалася кузава. Я спешліва зацягнуўся папяросінаю, жар падпёк пальцы.

Нам трэба было ў сасновік, у якім надоечы нагледзеў ён гатовыя фэстметры. Пастаўлена іх, відацьме, з прарубак. Якраз яны мне пад руку на зіму ў печку. Тым часам над верхалінаю, бы на каляднай елцы з жыдоўскай гвяздою, засвяціў месяц. Сярпасты, усё роўна што ў напамін майму з ім мужыцтву.

Уязджаючы ў тую заглуш, мы з недаверлівай панікай згледзелі перад сабою свежыя каляіны ў макрэчы; укалдобленыя заглыбіны ад буксавання, чорныя папоцемку, бы нарыіны дзіка.

— На "Жука" ладавалі, — адгадаў знаёмец марку праехаўшай нядаўна сюдою лёгкай таварнай машыны, але, і ён і я, падумалі адно: нехта паспеў перад намі, добра завідна ды, можа быць, выкупіўшы ў лясніцтве асігнату...

— От блядзь! — выключыўшы матор, ён першы адчыніў дзверцы і, не ставячы нагі на ступеньку, саскочыў на зямлю, мала не распароўшыся ад раптоўнага кашлю, калі б не той рыпат шырознае дзягі. Шапатліва крануўшы палою курткі галінку счырванелага куста. Чуйна загледзеўся кудысьці, быццам убачыўшы ўцякаючых.

Я — адзеравянелы — не рушыўся, брыняючы нелагічным сполахам.

Ён, нічога больш не кажучы, пайшоў чагосьці дапераду; ягоная клункастая постаць растварылася ў імглеючай цемрачы; вяртанне доўжылася. Мне пачынала здавацца, што гэта дзіўны ў мяне сон, які, вось, скончыцца і я прачнуся ў выгратай пасцелі, устану і накіну сабе на плечы халат, уступлюся ў пухкія шлэмбы, зайду ў кухню згатаваць кубак чорнае кавы... Жонка якраз падалася ў Саколку, да лекара; яна цяжарная. Я адзін дома.

Знаёмец паўстаў назад перада мною, рыхтык языцкі дух, ажно я ўздрыгануўся. Пакуль сказаў ён што, я ўсё зразумеў.

Сказаў:

— Хапанулі мэтры... Лепшыя, блядзь, зладзеі... Не, без асігнатаў. Калі б яны іх мелі, не згубілі б шапку, не пакінулі б танчэйшыя кавалкі...



Злосна насопшыся, выхаркаўся пасля ды з прывеселкам дадаў — гэты тутэйшы прымак-паляшук:

— Посподіваўсе дієд на мэд і лiёг спать ны еўшы, блядзь...

Чорт пабраў, а я так моцна ўсеўся на ўдачу! І на яго паляшуцкую бесцырымоннасць, на заядлую ў ім неадступнасць патомнага халопа, падкага на дарэмшчыну, і бязбоязнага самнасам з небяспекай у цёмным лесе. Калі танчэйшыя валяюцца, дык хоць такога дрэва набраліся б, але я змаўчаў пра тое. Я, проста, збаяўся падказаць яму тую карысць, прадчуўшы ў ім ганебны страх, такі ніадкуль і безнадзейна паніжаючы мужчыну, невытлумачальны, які бывае ў старэючага чалавека.

Пагазавалі паражняком дахаты.

## ШАНЦ ДАЧКІ ПОЎХА

Саветы атакавалі ад рэчкі Свіслач. Немцы адступалі ў Лапіцкія горы, паставіўшы гарматы за мястэчкам, на Навічанскім выгане. Паліцаі навыганялі з хатаў жанок і мужчын капаць процітанкавыя равы паабапал гарадзенскай шашы, паміж Грабшавым млынішчам і мокрымі лугамі ў Разбойніку. Камандаваў буславаты нямчур, сівы ўжо і ў шапцы кшталтам сядла ды з кабураю на жываце. Ён смешна гаварыў па-руску: "Давайт, бабі, давайт!.."

Смаліла сонца. Ад палеткаў несла хлебнымі пахамі пераспелых жытоў. Людзі абліваліся потам; у зарэччы пукалі з вінтовак, а ў хмызах стукацеў кулямёт, У баку да Вялікай Берастаўіцы грымотна біла артылерыя і кружыліся там у небе самалёты, адлятаючы ў дымна-белыя аблокі. Гарэлі хутары.

Антолін Болесь дастаў ад паліцая ў морду, калі закрычаў чагосьці і махануў рыдлёўкаю над галавою. Гэты дзівак і высалапень не мог жыць, не ўпароўшы якое дурноты. І, каб не свой нямецкі халуй, за нішто загавеў бы душою. Дапыталіся былі мужчыны потым: Болесь укапаўся ў чмялінае гняздо...

— Шпіёнішэ?! — гергетаў успуджаны тады Болесем немец. Паліцай замахаў рукамі: — Найн, біст ідыёт!

Але той, путаючыся афіцэркамі ў палынах, ішоў да ўтрупянелага Антолінкавага. Нечакана ласкава паляпаў яго па плячы, зазірнуў яму ў вытрашчаныя па-заячаму вачыскі, на брыняючую між імі ружовістую апухліну на пераноссі, і

вырагатаўся. "Гут, абарыген! Глюбоко копат траншэй, советскі танк надо капут!.." — адышоўшыся на ўзгорачак, ён заўглядаўся некуды ў бінокль.

Кабеты скрыгатліва пакопвалі ўпоперак травяністага схілу, а мацавіцейшыя мужчыніскі паглыблялі за імі ў рост чалавека, робячы тое з вышкаленасцю пабыўшых на вайне палякаў з Гітлерам. Не людская бяда, ці паспеюць, бо работы не на адзін дзень. Раптам засвісталі нізка кулі і ўсе без аглядкі пападалі, дзе хто стаяў (жартавалі пасля, у прыход саветаў, што Болесь не так вельмі недарэкі, калі дапоўз да бабаў).

Нямчур з нашым лайдаком кудысьці змыліся. Людкове сыпанулі межамі прэч, сукочучы нагамі ад жудаслівага енкату "уррр-аа!!", штораз налятаючага з ветрыкам ад Свіслачы і выбухаў, быццам якісьці шалёны малаціў цэпам па голым таку. Але ніхто не кінуў сваю рыдлёўку. Яшчэ таму, можа, што баяліся бандытаватых украінцаў, гвалтуючых харашунь.

На рынку, пад учарнелым сцяноўем гандлёвых радоў, — спаленых, калі ўцякалі ў сорак першым тыя першыя саветы, — запыніўся вайсковы грузавік, з кузава якога два фасоністыя немчыкі раздавалі местачкоўцам цукар. Спехма адважвалі па кілаграму за дапамогу арміі. Спрытнейшы прыгаворваў: "Іван цвай раз достаць нах дупа!" — і міргаў маладзіцам.

Неўзабаўку пад'ехаў да іх адзін, на сакочучым матацыкле, нешта загадаў і пыльнуў гасцінцам у зноў жа Лапіцкія горы. Ваякі заляснулі борт, лапатліва апусцілі брызент, пасядалі ў шафёрку і, запусціўшы матор, пагазавалі за вестуном.

Саветы прыйшлі назаўтра ў світанак. А пакуль было да гэтага, цэлую ноч ламарэндзілі немцы з тэхнікай, ад грукату якое абсыпаўся кіт на шыбах, закладала ў вушах. Спачатку з'явілася ад агародаў порсткая разведніца з рэвальверам напагатове і з трыма ўпэцканымі салдацікамі. "Германцев нету?" — знянацку падступілася да таго ж Болеся, які, як гэта дурань, высунуўся якраз на падворышча. Замест сказаць ёй дарэчы, узяўся ён азірацца, бы злодзей у шкодзе. Шчасце, што выбегла са склепу за ім сама Антолька ды загаласіла: "Няма, таварышка, каб іх халера выкаціла! Каб Сталінко на рогі падняў!.." — "Хватит, бабушка!" — пагрозліва ацішыла яе.

Загінуўшых звозілі мужыкі вазамі ў пусты канец праваслаўных могілак. Шукалі і забітых немцаў ды не знаходзілі. Нехта бачыў, што наклала галавою ўсяго двух, і свае забралі іх з сабою. Тым часам стала вядома: адбываецца бітва за Беласток.



Прывозілі адтуль параненых. Яны казалі, таксама, што ў Расеі больш не будзе калхозаў. Гаспадыні давалі ім есці; гаспадары ўчастоўвалі чаркаю. У мястэчку ўчыніўся настрой, як у восень на Багача: гралі гармоні, моладзь навучылася "Кацюшу" і "Цёмную ноч", аднавіліся — прызабытыя ў акупацыю — мардабоі за дзяўчат на танцах. У каго гаспадарка — вастрылі сярпы, вязалі на прыгуменнях перавяслы, валакліся ў поле.

Скончылася свята, калі камендант горада — паголены і з роўна зашпіленымі гузікамі на шынялі капітан Саша — аб'явіў мабілізацыю хлопцаў на Варшаву і Берлін. Мацяркам выпырснулі слёзы, той-сёй бацька разумеў, што плачам тут нічога не даб'ешся, трэба спосабу. Выйсце само паказалася — франтаваты масквіч Саша заходзіў да дачкі бясхлебнага Поўха на Шведскіх Акопах. Яна не мела адвагі — або і не хацела? — хавацца ад яго. Ёй, панаднай смяшлівіцы, і ўтлумачылі ўсім кагалам за каторымсьці разам, што няблага збагацее, надумаўшы менавіта фанабэрыі, абяцанкі-цацанкі таму Сашку.

— Не будзь дурнюшкаю, прасі, хай ён табе наносіць саладосцяў, гэты прышываны кавалер, — падказвалі. — У каго мяшок цукру цяперашнім часам, у таго, слухай, усе людзі кліентамі. Паняй табе быць! А хлопцаў аднаго-другога выратуеш, дарункамі цябе яны абсыплюць у тваё вяселле...

Казалі дзеля ўедлівай у галышкі ахвоты:

— Калі ўжо аддамо яму паціху цукар, што былі ў фронт прызарабілі, цягні муркі-жмуркі з ім далей, каб жывата ён табе не прыстроіў. Гні на шляхцянку, русакі балванеюць перад такімі: дамагайся вось ад яго модаў, трантаў усякіх зграбных, што салдатня лупіць з нямкіняў у Прусіі. Пакуль у яго тое наладзіцца, то і палякі сюды вернуцца, і турнуць Сашку ў ягоную Маскву... Забачыш, не пашкадуеш!

Местачкоўцы, ведаючы жыццё, няшмат памыліліся, апланаваўшы грэшны спас сынам: не ўсіх пабралі. Камендант пабыў праўда задоўга, але стары ўдавец Поўх не жаліўся: дачку, няшкодна прыкалечаную абортам, узяў па вайне сапраўды шляхтаваты надлесны з Пачапка. На шлюб ехала Поўшанка белакрылым анёлам, ў дываністай брычцы, запрэжанай тройкаю буланых коней. Някідка на выгляд аблезлы ў свае годы маладый меў твар, як падалося Болесю, шкодніка ў малінах...

## ЯК БОСЫ БОТ РАЗЖЫУСЯ

У мястэчку рабавалі жыдоўскае дабро. Гевалт чуўся да вечара. Свае не хадзілі брацъ; наз'язджаліся з вёсак, папрыходзілі з вакольных хутароў, тыя, хто не баяўся, што потым завозьмуцца пазнаваць іх.

З мяшчан рынуўся туды Босы Бот. Больш ніхто.

— Свайго не маеш, то і чужым не разжывешся, — нехта сказаў быў яму.

— Усё роўна, ля, людзі развалакаюць, — прабляяў Босы Бот. — Немец сам наказваў, ля, каб ісці... Жыдоў падушыць думае, ля, то і нічога ім не трэба...

Босы Бот — яго бацька за цара паехаў на шлюб у адных халявах ад зношаных ботаў — вываліў дзверы ў крамку, у якой куплялі пры паляках газу, соль, часам шыбы.

— Гут-гут, аборыген, — пахваліў яго жандар. — Дзішся васшэ, ютгро насшэ! — і пайшоў сабе далей растапыраным крокам пузатага чалавека з карабініскам за плячыма.

— Гут, ля, пане, — адкланяўся яму Босы Бот. І зараз жа пугнуў ад сябе вясковага дзецюка, якога падбухторыў выломваць (чым папала) завесы з крукамі. — Вон ад мяне, ля, хамут!

— Дзядзьку... — разявіўся той.

— Сабака табе, ля, дзядзькам!

— Каб не я, дык вы...

— Адыдзі, бо немца, ля, паклічу!

Босы Бот нічога не валок, чакаючы, пакуль аціхне вэрхал, аж мужыкі павернуць аглоблі назад. "Гут, кажу табе, ля, падла ты, гут-цурук! — крычаў на тых, хто квапіўся залезці за ім у сярэдзіну, і рыхтык звягліва чыхаў ад раздораў. — Немец табе, ля, лапатнік ты, угрэе гумаў, хай я толькі скажу яму!"

І Босы Бот набраў усяго. Сам здужаў ён цалюткую скрыню шыбаў, а яшчэ і кадушку газы ды колькі мяшкоў солі на вайну. Каб паспець перад паліцэйскім часам, ён прыхаваў усенька спачатку ў асатах над ровам, куды цякла нечысць з рыштокаў Палясцінскай вуліцы; груку было яму з той скрыняю (поначы выстраліў раз і другі немец!). Аддыхаўся Босы Бот у гэтых шыпулях, мурзаючыся і абхопліваючы то скрыню, то кадушку і сіпла ад стомы нашэптваючы, бы шалёны ў полі: " Мае, мае вы, ля, дальбог мае ўсе!.." Столькі бачыў каваль Лейба, які сюдою якраз пракрадваўся ў лес да партызанаў.



Даў сабе рады Босы Бот. Яго дамок стаяў блізу таго выгана. У садку, а не на людскіх вачах.

Босы Бот, відаць, моцна спадаўся... Ён ўжо нядоўга пажыў з тою здабычаю і памёр ад дзесяці хваробаў. Не распрадаў трохі шыбаў (пасля павыносілі іх суседзі, сваякі чамусьці не заявіліся). Грошы заграбаў, калі жыў, у карты рэзаўся, ажно падаючы ў бяспамяць, піў, ванітуючы крывёю, падкіх на баляванне лындастых салдатак падманваў... Дамок, да голых сцен абадраны, хтосьці падпаліў, ці — можа і праўда? — папала ў яго снарадам, калі савецкі фронт да гумнаў даходзіў...

Доўга пуставала гэтае месца; паставілі на ім свінаферму.

## ПАМЯЦЬ ПРА ЯСЯ-КУРЫНУЮ ДЗЮБКУ

Як калісьці усе пагулянцы, Ясь краў курэй. Выбіраўся па іх на гаспадарскую Кальварыю. Там было спраўней: падпаўзаў да падворышчаў, пачакаўшы ў чартапалохах, што кусціліся на Доўгім выгане. Сюдою ніхто не хадзіў. Часам спападала яго ў тым заглушку Рыжая Вэрця, нястомная палятуха. Пакачаўшыся з ім, латашыла яна агуркі ў прывыганскіх агародах (на маласольнасць пад чарку).

Хоць Яся і Вэрцю ведалі местачковыя гаспадары, пакражы ўдаваліся. Шкодзілі яны бабам, таму мужчынам не выпадала падымаць скандал.

Гаспадыні не выпускалі курэй за платы, каб не гублялі яек у крапіве або не панёс каторую ліс. Даволі было Ясю падпільнаваць, калі нікога паблізу. Размотваў ён тугую самаробную вуду з тоўстым чарвяком на кручку і лоўля адбывалася: да крутлявай смачноты дабягала зазвычай самая мажная сакатуха; высоканогі певень меў афіцэрскі гонар і рэдка бываў па-сяржанцку ласомлівым. Падчэпліваў Ясь дурачку, бы пырскаючую рыбу; чарада не заўсёды ўчыняла вэрхал, відавочна кемячы, што шчаслівая каляжанка ўцякае на крылах са здабычаю ў дзюбе... Крычаць не крычала, удушліва вылупіўшыся.

Прапажу прыкмячалі людзі потым, не зусім упэўненыя ў Ясевай тут рабоце. Столькі тае помсты яму, што яго празвалі кураедам. Не злаваўся; скакаў — аднак — біцца за "Яся-Курыную Дзюбку" (пад рогат дзяўчат). Не было б і тае злосці ў яго, калі б не амбіцыя ад хіхікання расквeтных сікушак. Быў жа ў ягоным

жыцці час, у які ен з такімі цшкамі вычварау, што толькі здумаў, а яны — па вёсках — малебна плакалі і рабілі пасля ціхія аборты... Залатыя дні паваеннага безгалоўя! Бывала, адразу чатыры заганяў клубаваць на сене; малады і вогненны, з абрэзам ў руках. Мацерку з дочкамі іншы раз. На хутары пад лесам.

Курыная Дзюбка, як кожны гультай, усё кавалераваты на выгляд блізіўся цяпер да саракоўкі. Упэцкаў быў сваё сумленне, лазячы калісь з бандаю, што хадзіла ў даўніх вайсковых шапках ды доўгіх шынялях; чакалі прыходу белай Полынчы. Папаліся гуртам узіму сорак сёмага. Ясь, будучы акурат п'яным да бяспамяці, апрытомнеў у павятовым следчым склепе, добра дастаўшы ад убоўца ў зубы. Угрэў яму ботам і па скабах. І па яйцах, ад чаго званітаваўся. Вылілі на яго вядрыска памыяў. Адзін выбіты зуб застрагнуў яму ў горле і ён зразу не мог яго выкашляць.

Ясь — на сваё шчасце — памятаў пра неадступную кару за грахі, што і выратавала яго. Патраціўся ён сваім здароўем няшмат, дзякуючы абуджанаму ў ім пачуццю вінаватасці і нестарому веку, а таксама набраўшыся розуму выдаць усіх і ўсё. Апошняя акалічнасць вярнула Яся жывым на Пагулянку.

Палічыў, што дастаткова нацярпеўся. А страх, што засеў у ім, не быў страхам здрадніка, але — рызыканта, што пабойваецца марнацыі ўдачы. Акрыяў, даведаўшыся: ўлады не цацкаліся з іншымі; зрэшты, знелюбіў лясных братоў ад пачатку, за кплівую ад іх празыўку Кныр.

Талент злачынца брыняў у Ясю, як цяжарнасць у бабе. Калі б не падпаў ён пад эпоху сацыялізму, вырас бы першакласным бандытам. У глухой правінцыі тым болын не існавалі адпаведныя магчымасці, і Ясь свае здольнасці прамарноўваў у кураедстве ды ў сэксуальнасці з растапыранай Рыжай Вэрцяй, нудна падатлівай.

Зладзеяватасць яксьці не пярэчыла ягонай рэлігійнасці. Недзе начытаўся нават, што Хрыстос заклікаў абсцёбваць багатыроў... Ксяндзу пра гэта не казаў ён у споведзь, трапна прадчуўшы, што набярэцца толькі біды. Апавядаў спавядальніку рэчы і без таго ашаламляльныя, пачуўшы якія гэты мазур у сутане бялеў, задыхаўся і мармытаў пра русінскую дзікасць. Ясь паўтараўся ў канфесіяльных аповедах духоўніку, і той западозрыў яго ў прасцяцкім махлярстве, урэшце сказаўшы, каб ён часта не прыходзіў з грахоўем (шкада часу). Тады жарсць самавыкрыцця апусціў Ясь-Курыная Дзюбка на Рыжую Вэрцю, доўгага языка якое зусім не баяўся; ніхто ёй не верыў у мястэчку. Гэтай



лапатунцы.

От, байкі былося Ясю. Я забыўся сказаць, што нарадзіўся ён байстручком, а маці памерла ад згрызотаў даўным-даўно, калі швэндаўся тым часам з бандзюкамі. Пакінула яму яна хаціну, у якой асталявалася "маліна" п'янюгаў ды звіхнутых бабаў. Блох і вашэй пазбаўляўся, парачы адзенне ў пастаўленым на пліту вялізным сагане, у якім варыла старая, пакуль жыла, бульбу свінчаці. Каб не той саган, Ясь-Курыная Дзюбка, можа, даўжэй пабыў бы на белым свеце... Маліннікі аднаго разу ўчынілі Ясю нямецкі допыт — лёгкадумна пахваліўся, што прыхаваў даляраў ад тых рабункаў (нібы адна шляхцянка заплаціла імі за тое, каб не забуславаў яе дачушцы-лялечцы). На Курыную Дзюбку кампанія лінула тады кіпнем з сагана, ад чаго ён у момант аслеп; аблезла з яго затым скура, бо ўпалоханыя дурні ратавалі яго халоднаю вадою, а каб не скавытаў у глухую ноч, дакладна заткнулі яму горла шкарпэткаю. Сканаў; задушыўся. Калі сябрукі пабачылі, што гэты іхны фундатар выпрасціўся, паспелі абачліва вырваць з рота нябожчыка ўціснутую шкарпэціну і, зваліўшы яму хітра на грудзі саганіска, змыліся, мала ног не паламаўшы.

Міліцыянт, вечна нецвярозы, прызнаў у трупе самагубства незнарокам. Ніхто не шкадаваў Яся (Вэрця ляпнула нецэнзурным словам). Пахавалі яго коштам гміны. Ксёндз не вельмі заступаўся за Ясеву душу, і столькі людское памяці засталося аб ім, што ў тых дзяўчат, якіх ён зматлашыў у ваенныя гвалты. Ну і куры перасталі прападаць.

## НА ПАЖАРЫШЧЫ

Пятка з Нэвалем валілі папаленыя муры.

Яны нанялі хэўру, згадзілі ўсіх у рэстаране Дзюбаграя. Пасля, гурмою, пайшлі на забаву ў бажніцы, у якой механікі з фронту паказвалі спачатку кіно пра вайну.

Пятка хваліўся Нэвалю, што ў аўсянае жніво знайшоў ён на лужку ў Разбойніку нямецкі рэвальвер.

— Нашто ён табе, — сказаў яму Нэваль, але так, каб ніхто не чуў. — Аддай яго мне, чуеш?

— Банды з лесу ўжо не прыходзяць, спі і храпі, Нэваль...

Нэваль кінуў слухаць, што гаворыць Пятка. Такіх, як

Пятка, язык губіць. Усе паўсядаліся кругам у буфеце і асушылі першую паўлітроўку.

— Ну і як, хлопцы, заўтра валім, хлопцы, пошту? — запытаў Нэваль, каб не маўчаць. І хоць не перакрыкваў ён усяго гэтага гевалту тут, салдацкіх спеваў тых, што паварочаліся былі з Нямеччыны, яму адказалі:

— Ты, Нэваль, — войт, ты і камандуй!

— Пяткі будзеце слухацца, хлопцы, ён у мяне, чуеце, камандзер, — прабубніў, аж прыўстаўшы як быццам. — Афіцэр ён, бальшавікоў страляў у рэвалюцыю.

— Нэваль, каб ты аблез! — прашыпеў Пятка; схапіўся з табурэткі і, здавалася, шукае рукою кабуру.

— Не кіпі, Пятка, ага, Нэваль нічога не сказаў, — загаварыў адзін з іх, насаты. Яму падтакнулі, а п'янейшы цыганок свой грош дакінуў: — А хіба хто не ведае, што Нэваль у Пільсудзкага быў...

— Быў я ці не быў, хлопцы, не твая справа, смургель ты, — Нэваль не дакончыў наліваць чаркі. — А ён, — зіркнуў на пацямнелага Пятку, — хай ведае і не забывае, і няхай добра служыць цяпер, хлопцы, бо калі не, то я…

— Ай, знайшлі аб чым трэліць, — перабілі войту.

Заядла сцябалі гарэлку, мала не пападаўшы, пакуль аціхла дурата; у гэты раз нікога не парэзалі, толькі музыканту ўгрэлі па мухаедах, бо ён захутка скончыў "Кацюшу".

У панядзелак пралазілі цалюткі божы дзень; урэшце збілі яны высокую драбіну — пошта мела два паверхі. Пятка даваў наганяй. Беластоцкі крадзежнік з'явіўся па цэглу сваім абозам, мужыкам заказаў у Дзюбаграя паўскрынкі манапалькі, а сам выпіваў з Нэвалем. Пятка выбягаў ад іх злосны і чырвоны, здалёк дзёрся:

— Валі-ііі!.. Валі-ііі!..

Адбрэхвалі яму:

— Сам валі, каб ты ўваліўся!.. Трэба драбіну!

— А жэрдкаю!.. Жэрдкаю расшугаць! - - камапдаваў Пятка, дабягаючы да зграі. — Няма часу, той возьме і напрэ з мужыкамі ў лепшае месца...

— Казалі: заўтра ён будзе...

— Маўчаць! — гыркнуў Пятка, папраніўшы на жываце сваю шырокую дзягу і расставіўшы погі ў апгольскіх ботах так, як бы зараз нехта павінен падаць яму рускую вінтоўку з доўгім штыхом.



І ўсе забегалі. На драбіну пацерабіліся насаты і цыганок. За імі чапіўся трэці, і тады затрашчала яна. Тыя, што засталіся ўнізе заенчылі. Першы ўгары ўшчаперыўся за недагарэлае акно, дрыгаючы на расчыненай раме, усё роўна як толькі што павешаны які. "Цэ-эгла-а!.. цэ-эгла-ааа!.." — хрыпеў недарэчна той. Другому ўжо не было калі перабіраць назад нагамі, скокнуў ён, аж зямля пад ім потым застагнала.

Нічога нікому не зрабілася. Каб гэтак з добрым чалавекам, то забіўся б.

## ЛЁДЗЯ-"АМЭРЫКАНКА"

Стась вярнуўся з Амэрыкі і Лёдзю выперлі замуж за яго. Стала яна ў крамку, якую адкупіў ёй у Хаіма, ездзячы за гешэфтамі. Пры саветах, калі ўпала Польшча, мала не павезлі іх на белых мядзведзяў за гэтае багацце. Каб не былі прыйшлі немцы. У акупацыю Лёдзя са Стасем спекулявалі па вёсках яўрэйскім дабром, што за бесцань аддавалі ім украінцы з жандармерыі. Паратаваліся, аднак, агародам і сваім полем каля Бяздоніцы, дзе радзіла бульба, а і гарох. Калі ж прапаў Гітлер і настала трохі свабоды, Лёдзін "амэрыканец" акрыяў, бы гусак пасля дажджу. Хапіўшы свежага капіталу, ён не быў дурань чакаць новай пятлі. Шмыгануў назад, павёзшы і Лёдзю на той край свету. Справіўшы добрае вяселле (не ўдалося ім дзіця) гарбатай дачцэ, да якой тут пасватаўся падкі на грошы, але жулікаваты басотнік.

Стась набраўся здольнасці ў сваім бізнэсе і закасаваў канкурэнцыю. Тады заканапацілі яго ( у нечым не паладзіў з чыкагаўскай мафіяй). Фірму пераняла Лёдзя, разумна не прымаючы ў памочнікі аніякага каханка. Кіравала па-бабску мякка, без завідлівых даходаў (два рэстаранікі і матэль).

У Каляду семдзесят шостага прыляцела з Нью-Йорка ў Варшаву; жаніўся з унучкаю стараваты сын яе колішняга кавалера. Малады з'явіўся па Лёдзю — на акэнцкае лётнішча — і, каб паказацца перад залатою цёшчай, так ціснуў газ у падораным "ролс-ройсе", што на галалёдзіцы пад Беластокам разбіў аўта, забіў сябе і Лёдзю (поўныя валізкі пакралі мужыкі).

Спадчына пайшла ў рукі тае гарбуні. Аўдавеўшы нават раней за матку, яна цяпер пашукала сабе спраўнейшага мужчыну.

Але той закруціў галаву абняшчасліўлай маладусе і, падчысціўшы долары старой, кудысьці з'хаў з яе дзеўкай. Каб прышчаміць людскія языкі, казала, што выправіла яго з ёю вярнуць бацькаў маёнтак у Амэрыцы...

## САШЭСЦЕ АХАПА

Панна Міляда — сваім: красуня Ляля — выпадкам счула, што едзе з плугам п'яны хам Ахап, араць мястовыя агароды з зімы.

Чутку падхапілі з радасным віскам паслясялянскія дамы ў амерыканскіх парыках, што пляткавалі на рагу Казінай і Воўчай. Запакутавала ад тае добрай весці ўсё патаемная Любка-Шпіёнка: ёй, шасціпудовай, нельга бегма бегчы. Сонца, прытым, нелітасціва прыпякала ў веснавенне (да агародніцкіх халадоў заставалася каля двух тыдняў). Пара ж садзіць бульбу ў садках ды рыхтаваць градкі пад салодзістую моркву, буракі на боршч, мацавітую фасолю, шыкоўныя памідоры, агуркі пад выпіўку...

Любка-Шпіёнка ўспацела ад самое навіны пра Ахапа перш, пакуль паспела што-колечы далей падумаць. Затое, дапаўшы да ганка сваёй хаты, што ўнізе Рынкавай вуліцы, абудзіўся ў ёй камандзірскі дух, якога даўно ўжо не паспытаў яе шлюбны Аркашка, празваны па палітыкаватым бацьку Імперыялістам.

— Ахап! — закрычала Шпіёнка ў цёпла расчыненыя дзверы і Імперыяліставіч умомант скеміў, што трэба. Шмыгануў у кухню, дзе ў шуфлядзе доўгага стала ляжаў ключ ад склепа.

— Нож! — енкнула пасля і грымотна закашлялася, але Аркашку не было калі паратаваць яе кулаком у плечы; нядотыкам кінуўся быў зноў у тую ж кухню. Бульбы для пасадкі нарэзалі потым удваіх, кош з вярхом і няцэлы другі. Заюшыліся пры гэтым, выхопліваючы адно аднаму лепшы той штыхаваты ножань з рук, каб шпарчэй было: Шпіёнка, асоба спадцішна энергічная, не трапляла вастрыём у меншыя клубні, а Імперыялісту ад спеху дваіліся бульбіны ў вачах. Раны палівалі яны, як здавалася ім, ёдам, але па тым, як пацямнела ў мазгах ад болю, здагадаліся, што схапіліся за бутэлечку з сінім каменем, з якім гэта калісьці наварылі сабе спорнага шэрага мыла з падла.

Упершыню Ахап з'явіўся быў на прадмесці, усё роўна што сышоўшы дабрадзеем з нябёсаў. Ніхто і не напытваў, адкуль ён



сам будзе, з якое вёскі ці боку. Наездамі бываў па Вялікадні і, затым, у перадлістападаўскі зазімак. Казалі: жыве ў пакінутых лесунамі хутарах, разгадаваў табун дзікіх коней... Нехта ведаў лепш: не коней, а авечак, трымаючы іх у драцяной загарадзі з электрычным пастухом. Даходны гешэфт, аднак, браўся ў яго не з аўчынак ды мяса. Да таго статка падпаўзалі, дарагія цяперашнім часам, ваўкі з Крынскай пушчы, якіх забіваў на подступах электраток з трактарнага акумулятара. Нюхлівыя ваўчугі краналі мокраю пысаю бясколерны провад з вольтамі ў высокай траве і каналі ад электралізу крыві, нават не завыўшы, толькі вышчарыўшыся і з закочанымі пад лабаціну вачыскамі. Аднойчы выпрасцілася за ноч адразу двух, хоць, наогул, калі каторы ляснуў у канвульсіях, рэшта драпала назад. Даволі нечакана Ахапу яны звяліся; недзе ў дрымучых Перацёсах павыла трохі выжыўшая ваўчыца ды, відаць, збегла некуды, можа і ў Белавежу, пашукаць ган'ё.

Ахап замаркоціўся. З аднымі авечкамі яму не ўдаваўся рахунак. Трэба да іх гаспадыню, каб стрыгла воўну. Старому кавалеру мець бабу ў хаце — як ні думай — гэта благі інтарэс, выдаткі за выдаткамі і сварлівы кантроль за глупствамі. Збыў узяў чараду падбеластоцкаму шанцоўніку і прывёз з торгу ў Саколцы каняку.

У руінных пустэчах пачуваўся Ахап, бы асаднік які на абрабаваных саветамі нямецкіх землях, што ў пасляваенне адыйшлі пад Польшчу. Знаходзіў усякае, патрэбнае яму, ламарэндзе; склаў зграбны вазок, выштукаваў барану, нафтаю ачысціў з іржаўя цалюткі жалезны плуг, што гібеў у дзірване на чыімсьці загуменні (гледзячы здалёку меў выгляд рыхтык кінутага адступаючай салдатнёю станковага кулямёта). Пашэнціла і з лейцамі, на якіх даўнавата хтосьці павесіўся на бэльцы ў стадоле; у астаронку валяліся парасцяганыя звяр'ём чалавечыя косці, шматкі фуфайкі; тырчэлі беленню з гумовых ботаў галёнкі, зеўраў чэрап у завязанай пад пашчэнкі шапцы-вушанцы (надумаў шалёны бяду ў завейную адзіноту?). У нябрыдкай хаце пад гаем, у якую Ахап залез цераз выламанае кімсьці акно, чарнелі чатыры тэлевізары на падлозе: варушылася ў іх плойма мышэй, што ўпадабалі гнездаваць паміж лямпамі апаратуры. З аблезлае халадзільні гультаявата выкручвалася змяя.

Ахап прадчуў кан'юнктуру сабе. Зрабіў стаўку на каменданта пастарунка і на войта. Тыя без пярэпалаху сеялі

наркатычны мак, таксама каноплі, і пашырылі ладныя загоны ходкіх трускалак, а яны любяць частую змену глебы і глыбокае ворыва (даглядалі плантацыі дробныя бандыткі з мясцовай галоты, абы-ціха адпушчаныя ад пратакольнай адказнасці). Ахап, закрасаваўшыся з канём і плугам у начальніцкіх платах, спакойна не напрошваўся кліентам, самі прыходзілі да яго, падпільноўваючы здаля. Грошай ад нікога не прымаў, тлумачачы тое здуманымі на гэты конт нейкімі святымі запаветамі, што запэўніла яму навалу заказаў. Ці ў спёку, а ці ў холад, насіў, аднак жа, на сабе непамерны плашч, транту ў латах, але з прасторнымі кішэнямі, які скідаў у работу і чапляў абавязкова поблізу сяней у мяшчанскіх дамах. Скончыўшы араць агарод і выслухаўшы падзяку ад панаватага гаспадара, асцярожна апранаў той лахман, заўсёды адчуваючы прыемны і лёгкі цяжар паўлітроўкі ў ім, далікатна засунутай яму папярэдне. Не любіў рабіць удовам: клалі кавалец сала, ну, дадаючы вянок купленае каўбасы.

*

...Ахапа вось чакалі і не прычакалі. Ён, магчыма, запіўся насмерць за доўгую зіму. Хацелі шукаць яго, але не шукалі, не вельмі ведаючы, дзе, у якім падлессі зарастаючай маладнякамі гміны, асталяваўся ўрэшце рэшт. Шкадавалі гэтага чалавека, тужліва выглядваючы, ці часам не валачэцца з бразгатам шырокаю, асфальтаванаю вуліцай да камендантавай мураванкі або секс-шопы зяця войта... А калі ўжо нельга было адкладваць майскае сеянне, запаўцелі клясці Ахапа і набываць рыдлёўкі.

Паводле Любкі-Шпіёнкі, Ахап увайну быў дзесьці нямецкім солтысам... Імперыяліставіч выказаў дапушчэнне, што яго знікненне трэба лучыць з пераходам на амэрыканскую службу, бо ўперадвяліклдзень чуў ён апоўначы як гудзеў над лясамі самалёт...

Прапаў Ахап, усё роўна што ніколі і не было яго.

## НЕЎДАЛОТА

Артуру ўсё не шанцавала. Можна сказаць: ад дзяцінства. Нават ад маленства. Бацькі, занятыя здабычаю, нанялі тады танную, прыдуркаватую няньку яму. Хадзіла з Артурыкам у возіку ў недалёкі парк, дзе ўпадабаў яе такі самы, як яна, кавалер.



Абое дадумаліся спойваць малога малаком з салодкім вермутам, ад чаго ён непрабудна спаў. Праз некаторы час Артурчык зрабіўся ненармальна вісклівым. Маці з бацькам, абхадзіўшы з ім лекараў, урэшце даведаліся, што немаўля іх ужо алкаголік.

Клянучы амурную дэбілку, узялі прывезлі з вёскі на яе месца матчыну старую. Бабуся, удзічэлая ў вымерлай ваколіцы, нясціхана плакала ад упаткаўшага яе гарадскога раю перад смерцю. Лечаны Артурык лямантаваў разам з ёю; нельга было пусціць на шпацыр, на людскія вочы. З раніцы, калі і суседзі выходзілі на работу, у кватэрах навокал заставаліся адны сабакі. Яны браліся выць ад бабіных задаволеных прычытаў (пры гладкім зяцю дома, аднак, асцерагалася сярмяжная цешча даваць волю голасу сваёй душы). Унучак стамляўся ад гэткіх выбухаў шчасця ў няшчасці і неспакойна засынаў, смагліва аблізваючы язычком патрэсканыя губкі.

Лекаванне давала вынікі. Тым часам бяда перакінулася на недаўмекаватых суседзяў: не маглі зразумець, чаму худзеюць ім дагледжаныя сабачукі. Заказаны ветэрынар нічога не дашукаўся ў таемна патрывожаных брахуноў. У правінцыяльнай газеце з'явіўся затым артыкул пра невядомую хваробу ў хатніх жывёлаў. Публікацыя выклікала сенсацыю. Стварыла канавалу канцэпцыйную падставу адчыніць дактарат у слыннага прафесара. Не выйшла, аднак: бабка, аб чым ён не ведаў, ад'еўшыся ды адагрэўшыся ў пакаёвай цеплыні, бласлаўёна аціхла. Дактарант ні трохі не раскусіў, чаму цюцькам вярнуўся апетыт, хвасты зноў падняліся ім абаранкам, мордачкі павесялелі.

Само дзяцінства Артура праходзіла, таксама, не менш злавесна. Да ўсяго кепскага даводзілі сябры. Аднойчы прынёс з крамы шапаткі пачак макаронаў маме, у якія нехта з іх засадзіў быў аглушаную мыш. Зверанё, акрыяўшы ў лакомлівай яму пастцы, колькі ночаў спажывала спадцішка далікатэс. Гэта выклікала ўражанне, што за ўваходнымі дзвярыма тоіцца начны злодзей з дрэнна падробленымі ключамі... Бацька, успомніўшы сваю вайсковую службу ў паветрана-дэсантнай брыгадзе, ці раз скрадваўся басанож у перадпакой, але на той момант усталёўвалася чуйная ціш.

Пакуль не здарылася тое, што павінна было, хоць неабавязкова ў святую нядзельку ды за абедам у кухні: мышка, узвычаеная дабрабытам, як і сямейным вэрхалам, выглянула была з распорыны ў кардонцы; асэпленая сонечным днём, вытрашчылася на ўтрупянелую мамцю! Тата паказаў сябе

героем — шкодніцу даканаў эмалевым апалонікам, набіўшы пры гэтым пасуды (саксонскую вазу насілі склейваць да музейнага спецыяліста).

Пара ў якую выпусціліся ў Артурыка пухкія валосікі пад носам і выганяўся ён у кавалеры, пакінула ў ягонай псіхіцы незагойны шок: не набраўся рашучасці жаніцца. На заручынах у асабняку Юліты падалі яму ўрачыста раскаркаваць трохлітровую бутлягу французкага шампанскага маркі "Курваз'е". Стрэл з дымком і роспырскам накшталт наванітнага атрымаўся ніштаваты. Але звалілася ад таго на прычоску Юлітки цяжорная талерка з крыштальнай жырандолі. Дзяўчына ўмлела, закаціўшы бельмы. Нядошлая цешча рынулася на паратунак дачцэ, напароўшыся грудзьмі на шпіль адмысловага графіна з марожаным джынам. Бацьку Артура цюкнула здагадка вярнуць прытомнасць будучай нявестцы тапельніцкім метадам вусны-вусны, за што ляскатліва аплявушыў яго пачынаючы сват. На знявагу мужа зрэагавала падобным чынам фасоністая ў той вечар маці. Брат Юліты, ужо аптыміст пасля разводу і чэмпіён чагосьці ў спорце, вышпурнуў за парог перш Артурыка. Было гэтаму асілку крыху валтузні са старым, якому ўспомніліся спосабы барацьбы каратэ часоў дэсантнай школенасці (адзін і другі нацярпеліся было ў далікатных месцах цела).

Наеўшыся сораму, Артур тры дні не прыходзіў дамоў, засеўшы ў яшчэ нежанатага сябра.

Цяпер жа ён дырэктар гандлёвага павільёна "Нью-Йорк", што ў завулку Сарака Мучанікаў (пры камуністах — Чырвоная Дарога). Дубасіць замужнюю неўпапад прадаўшчыцу, якой, як і яму, не ўдалося жыццё.

## РУСКІ БАЗАР

Хоць і грэх гэта, але хочацца пазайздраваць Госпаду Богу нашаму, які ціхамірна адпачываў быў у сёмы дзень пасля стварэння Ім свету. Добрая ў Яго, спакойная і прадуманая, без неспадзяванак арганізацыя працы. Зусім не тое, што ў мяне... Накупіў я на сваю галаву хатняе тэхнікі, каб лягчэй мець у штодзённы побыт. Не лічыўся, булава, з новай мудрасцю, што машынерыя ў руках варвара — страшней гранаты!

А ўсяму вінаваты, папраўдзе, той дзікарускі базар, што



рассеўся бабамі ў мястэчку. Каб не ён, жылося б, хай сабе надалей прымітыўна, аднак, як у Бога за спіною. Да маладаступнасці нам польскіх цэнаў мы прызвычаіліся ў спрадвечнай тут беларускай бяздарнасці і багацеем толькі ў марах. Радуемся пры тым, што ў параўнанні з расійскім абадранствам, то і без варшаўскага шчасця бяды нямаш.

Беларускія саветкі з-за кардону навалаклі на рынак сюды дарэмшчыны. Няйначай сам Сатана падкусіў мяне набыць у іх мікрахфалевую духоўку, плацячы ім за яе менш, чымсьці нядаўні мой штраф, што ўляпіў мне паліцыянт за абразу ягонай службовай асобы (я спрабаваў вытлумачыць яму, што ён ёсць дурань ды ганьба Польскай Дзяржавы). Мікрахфалёўніца, быццам з ласкі адпрацаваўшы неяк палову гарантыйнага тэрміну, загарэлася. Спачатку валіў дым ад ейнага трансфарматарыка, чамусьці рыжы і з попахам гарачых бульбяных пляцкаў. Заўважыўшы, што ад яго здыхаюць мухі ў кухні, я прафілактычна ўключаў час-часам гэтую маскальскую канструкцыю, пакуль — аднаго разу — не жыхнула з яе полымем.

Вырашыў абмежаваць свае амбіцыі да куплі электрычнае брытвы (якраз "Бердск" перапрадаваў за сабачы грош сваякаваты мне капрал былое арміі Андэрса, што карпела некалі на італьянскім фронце). Машынка на выгляд выклікала давер, накшталт жуліка з тварыкам анёла. Калі застаўся я з ёю сам-насам перад люстэркам у пакоі, тая механічная зараза кусанула мяне за верхнюю губу, зрэзаўшы пры гэтым бародаўку (хто ведае, ці не ракатворную?). І буяла, усё роўна што самалёт у вайну, што бамбіў маянтковыя хлявы, у якія пахаваліся былі нямецкія ўкраінцы, захапацеўшы тутэйшыя курвы... Колькі яе потым не мазаў я аліваю, ні трохі не папраўлялася. Урэшце ўзяла і захліснулася. Аддаў неўдалоту ў цацкі дзецям, а яны, засранцы, напалохалі бліскучкаю цётку Мальвіну з Баб'яе Гары, ад якое не мелі мы дагэтуль адбою (памятала яна пра якіясьці процітанкавыя міны, на якіх падарваўся яе нябожчык мужык, што вёз возам сена з Чортавага Балота, калі саветы пагналі немцаў ужо пад Беласток, у сорак чацвертым).

Падумаў: Бог з жалязякамі — спірту набярuся на тым базары. А каб не, збылі мне яго танней самагону. Прычакаў нядзелі, каб паспытаць, бо ў будзень усё ж забаяўся: работы шмат. Адразу пацямнела ў мазгаўні ад яго; у вачах жа крыху пазней, калі ахапіў мяне прымус бегчы ў прыбіральню, у якой, здавалася, так і памру загаліўшыся... Кідала ў дзіўны холад.

Шчасліва здагадаўся піць кіслае малако.

Не адзін я аказаўся дурнем. У Баб'яй Гары ўсё вяселле гэтак выкаціла. Казалі: маладуха першаю брыкнула ўверх нагамі, растапырыўшыся на падлозе... Гэта паратавала маладога, які не паспеў па-хамуцку наліць сабе горла. Іншых пакалечыла лакомлівасць на глыбокую чарку. Дзякаваць Богу, пайшоў на той свет адзін усяго сват. Праўда, старшага дружбанта выпісалі са шпіталя вар'ятам. І чыюсьці дзеўку, якая цяпер рагоча без дай прычыны, голаю сядае пакатацца на ровары... Найбольшае дзіва, што постбалыдавіцкі спекулянт, расквагараваўшыся ў іх, запісаўся потым жыць з бяздзетнаю ўдавою свата і, прыдбаўшы на гэтай падставе польскія паперы, драпануў у Нямеччыну.

Пакуль тая камедыя здарылася, я не стрываў ад нагоды старгаваць запалак з горада Чудава, фабрыкі "Пралетарскае полымя". Зрабіў запас. Як ні шморгаў пасля іхнымі галоўкамі, агнём не займаліся, акрамя некаторых... 3 якіх, акурат добрая, зламалася і адляцела ў кут са смеццем ды старымі газетамі. Скончылася тым, чым павінна было: хату не спаліў, выратаваў, але мышэй ляснула!

Кінуў хадзіць на базар.

Грошай як бы пабольшала ад гэтага часу, хаця я імі ніколі не раскідаўся. Цяпер жа яксьці сонна на душы... Няўжо адкрыў я гэта прыгажосць катастрофы і, разам з тым, сэнс самое Расіі?

## ЗДЗЕЛКА

— А гэта ты мне пра што, пане?! — непрыемна здзівіўся Балабэнак.

— Ну, майсы майсамі, а ты як сабе хочаш, — знеахвоціўся Намеснік.

Яны пілі ў "Перапёлачцы" чырвонае віно, самае таннае, якое там можна было заказаць (румынскае). На дварэ марусіў дождж, штодзённы ў гэтае мокрае лета. За шклянымі сценамі павільёна гнілавата зеляneў блізкі парк, запушчанае кустоўе нечага ўздоўж тратуарчыка заглухлай тут вуліцы (па якой лепей было не хадзіць увечары). Балабэнак з Намеснікам адчувалі сябе не зусім каб добра ў такой маладняцкай кафэйцы, будучы мужчынамі з налётам сівізны на скронях. Месца, аднак, для іхняй гутаркі выбралі яны абачліва — у рэстаране альбо ў бары мог жа



іх нехта сур'ёзна падслухаць, а таксама і не пасядзіш тамака з абы-чым.

— Слухай, Намеснік, цану ты скажы яму, пане, пасля ўсяго.

— Можа быць, ён абразіцца?

— Хто?! Гэта ж мужык!

— Ну, майсы майсамі, хаця б патрыятызмам нам возьме і заедзе...

— Не смяшы мяне, Намеснік: нашто, пане, ратаю нацыянальнасць?

— У нас, папраўдзе, не будзе столькі грошай, Балабэнак. Тут справа такая, што майсамі не выкруцішся ад яе.

— Ад цаны да платы дарога, пане, павінна быць доўгая, Намеснік.

— Як зрабіць тое?

— Рухай мазгамі, Намеснік, варушы імі...

Яны паазіраліся, трохі як набабнікі, што зайшлі пашукаць валачашчай сабе нанач. Віхрастыя юнакі і ўгадованыя дзеўкі лізалі марожанае, хто седзячы, а хто стоячы, модна крыўляючыся. Начэквалі, калі аціхне дажджоўе, каб хутка пайсці дамоў.

— Я яму, Намеснік, як жа не даў, ведаеш, дык ён і выпрасціўся!.. — пачаў сваё Балабэнак. Недзе за імі рагатліва крыкнула дзяўчына, задзынкала разбітае шкло: "Ідзі, заплаці за шклянку, хі-хі..."

— Не перастае, — сказаў Намеснік, як бы не чуючы Балабэнка і нудна ўглядзеўшыся некуды ў заімжавелае воддалле. Той рогат рабіўся нясцерпным, усё болей падобным на роспачны плач маладзіцы ( заціх, урэшце, быццам зайшоўшыся ад жалю). — Балабэнак, — загаварыў, бы прачнуўшыся. — Майсы майсамі, нашто табе было заводзіцца з ім?

— Калі тое, пане, было?!

— Ой, балабэнак-балабэнак ты...

— Ну што "балабэнак"?!

— А тое, майсы майсамі, ці ты паверыў бы ў гешэфтах такому, каго бачыў на сваёй жонцы?

— Глупствы, Намеснік: пры чым тут, пане, "паверыў бы — не паверыў бы"? Ён жа, той самы, унукаў ужо, пане, гадуе!

— Блага, Балабэнак, калі баба стаіць на дарозе.

— А ці я кажу, што добра? Інтэрас наш наматай ты з ім так, майсы майсамі, як бы пра мяне і не чуў нават.

— Усё роўна выявіцца...

— Позна яму тады будзе ганорамі раскідацца, майсы майсамі, грошы добрыя нанюхаўшы. Ды і другога такога дурня дзе ж нам знайсці?

— Яно праўда...

— За грошы і чорт харошы, хі-хі...

Дождж сыпаў і сыпаў. І яны засядзеліся.

## ДАЎГАНОГАЯ ЛАНЬ

Віця Крывая Шыя не вылазіў з тае Амэрыкі, пакуль яго маці тут не пачала канаць. Яна так і аддала б сама адна Богу душу, без анікога каля сябе, калі б не паштальён, што прынёс ёй рэнту ды не змог дастукацца ў дзверы да яе, каб пусціла з марозу ў хацінку. Хлопец гэты падумаў, што — ў ранні зазімкам адвячорак — бабулька баіцца таго бандыта, пра якога кажуць: прывалокся аднекуль з-пад Варшавы дзеля рабункаў пакінутых у самоце глушы мужычак... Выявілася потым — ляжыць, нябога, у надырдыганеным логаве галодная, недагледжаная. З пошты далі тэлеграму Віцю ў Чыкага, па вядомым з пісьмаў адрасе. І ён, даволі хутка, з'явіўся сюды.

Як толькі ўехаў быў у Польную вулачку, да маткі, адразу зрабілася ў тым закутку святлей яксьці... Вузкі брук заняла даўжэрная ды яснаблішчастая яго аўтамашына; сонечныя праменні, што ў распагаднелую замаразь прастрэмваліся праз гушчавіну векапомных дрэваў, распырскваліся ад яе тулава казачнай кузакі дарагімі каменьчыкамі, рассыпаючыся ў паваленых платах, у купах высахлага лапушніку, у стаўбунах чартапалоху. Сыпаліся, зіхотка, і сыпаліся! Ехаў ёю асабіста Віця Крывая Шыя, не з парожнімі рукамі і не адзін. На прывязі ззаду гайдалася на калдобінах паўнюткая прычэпа, пакрытая брызентам, а за пярэдняй шыбай сядзела поруч яго маладая баба, але дзівоснае пароды (падобную можна было дагэтуль пабачыць у амерыканскіх кінафільмах пра індзейцаў). Пазайздравалі Віцю ўсе: дарослыя — доларнай яму Амэрыкі, кабеты — дарагіх у яго пачак, кавалеры — шыкоўнага аўто, дзецярня — таемнае пры ім індзейкі (нагадвала здатную Даўганогую Лань у чэйенаў). Смольнага вобліку госціца з валасамі, бы мяцёлка ў камінара, паказала сябе, аднак, асобаю прыветнай, хоць бі-забі, незразумела гергетлівай. Даўганогая Лань і ён, Крывая Шыя, усякага зажылі абое, застаўшыся потым са старою. Вішчала, каб Віця не пакідаў яе, родную маць, сам-насам з прывезеным нялюдскім дзівам! Як ні прасіў-маліў радзіцельку не дурэць, яна ўсё роўна лезла на сцену, калі Даўганогая Лань мякка падступалася ў макасінах да ейнае пасцелі, з дбайлівым доглядам. Заклінаў усімі святымі гэтую сялянскую хрышчаную язычніцу, што ўсенькія людзі свету вартыя раю, будзь яны мардатымі манголамі, ці прыплюшчанымі кітайцамі, або лупатымі неграмі, недарослымі пігмеямі... Сівому дурылу, але, убіўся ў памяць каторысьці фільм у тэлевізары, з заюшанымі скальпамі, злупленымі з вестэрнаўскіх беленькіх каланістак з высокімі чубамі, з сінімі бантамі...

Віця Крывая Шыя не быў з тых, хто схільны на ўступкі недадумкам з курынымі мазгамі! Належыў таму чалавечаму падгатунку з прыроднай інтэлігентнасцю, які, чамусьці часцей сустракаецца ў байстручкоў (з іх Віця менавіта). Памаўчаў ён, памаўчаў, злосна зіркаючы на ўчарнелую ад векавой запушчанасці мацерку і пальнуў:

— Бо ажанюся з разводнай Чаркесавай Лёляй-Лойкаю!

Маці вытрашчылася ад гэтых яго словаў і цалкам разумна адказала:

— Сынок, лепей ўжо бяры гэту, што маеш, пляскатую, горш з ёю табе ані мне не будзе, — і яе вочы ўперліся некуды ўбок, дзе, відаць, стаяла за ім, Крывою Шыяй, Даўганогая Лань са сваімі нерухомымі зрэнкамі-вугалькамі на — месяцавай прыгажосці — бондзе аблічча з рыхтык уціснутым носам ды расцягнутым на два горла ротам. Рашыўшыся, нарэшце, намаглася палюбіць новаз'яўленае стварэнне, з біблейскага занебакраю як бы. Не ўдалося, бо адвярнулася зараз, ўздыхнула, але, аднак жа, адчуў Віця, што зноў паднатужыцца, калі не сёння нават, дык заўтра. Дзякуючы Лёлі Чаркесянцы, усё ж, каб яна так здаровая была і ніколі не даведалася пра тое. Яшчэ паненкаю хадзіла Лёлька з дзедавым кінжалам за паясніцаю, і ці раз парэзала каторага кавалера на музыках (за што, вядома). У яе каля печкі таракан за тараканам бегаў, і бегае, як і трэба ў нямытай лойкі. Муж удаўся ёй палахлівым — адважны, пэўна, узяў бы іншую — і, вось, выгнала яго, вольнай аднова стала. Яе бацька тым часам не дае рады выплакаць у Бога лёгкую смерць сабе.

Крывашыіха, замест памерці, ажыла. Даўганогая Лань

падсыпала, неўпрыкмет ёй, у ежу сушаных зёлкаў, назбіраных у Вялікім Каньёне, што налева ад даўнейшага шляху ў Сакрамэнта (з расою і ў поўню). Ад выпадку, калі Даўганогая Лань надумала сама агледзець мясціну, Віця Крывая Шыя нікуды не пускаў яе. Ейную увагу тады прыцягнуў славянскі мардабой п'яных, але недапоеных, у нацыяналізаванай рабоча-сялянскаю ўладаю "Карчме". Біліся, як заўсёды, дзеля тлумачэння адзін аднаму, хто каму вінаваты літроўку: ставіў той, які столькі даставаў укаплех, што падымалі яго на ногі, дружна трымаючы пад пахі і дапамагаючы яму намацаць кашалёк, засупонены ў капшуку падшытым , зазвычай, пад левую палу кажуха. Гэтай, славутай у ваколіцы, гульні тутэйшых мужчынаў навучыў, яшчэ за першымі палякамі, казацкі прыблуда, што ўцёк быў ад бальшавікоў, недабоек з Белай Гвардыі. Як і пры картах, лічылася засранствам заходзіць у "Карчму" неганаровым дарэмнікам.

Якраз у такі, блізкі зазёванай згоды, момант задыхана ахвачаны клубаваннем натоўп знямеў, быццам балванамі на лёдзе застыўшы: бронзавым манументам узвысілася, пагразам у расхлябешчаным у прыцемках уваходе Даўганогая Лань! Усяляк пасля распавядалі пра тую хвіліну і падзею, але галоўнага, што счаўплося, Віця Крывая Шыя здагадаўся са словаў аслупянелай ад убачанага Даўганогай Лані, ледзь трапіўшай дахаты.

— Я бачыць поўна чалавек і я не бачыць поўна чалавек!.. Цуд! Дух Маніту ўзяць усё чалавек!.. Акно трэсь — акно няма!.. Многа-многа акно няма, адно акно а чалавек многа, другое адно акно а чалавек больш!!. Я прыйшла бачыць і я не бачыць, многа-многа зад бачыць, а зад усюды зад, у Амэрыцы зад, у вас зад... Стандарт - зад, зад ёсць таталь-зад, інтэрнейшл...

Цэлаю знайшлі пасля жалезную крату, што мацавала аканіцы знадворку ў барык; прытарабанілі яе назаўтра дзеці — гулялі ў снежкі на выгане. Аказалася гэта не самым значным рэкордам адлегласці і цяжкавагавага высілку. Самавіты, пацямнелы стол для півашнікаў, які ледзьве краналі з месца, счапіўшыся між сабою буяны, валяўся цяпер чамусьці за хлеўчуком з публічнай прыбіральняй; дубовы і навек аклінаваны, ні трохі не пашкодзіўся. Прыкідвалі мясцовыя цвярознікі, якая сіла заперла яго туды, а ці нячыстая... Чыгунны саган для гатавання каўбасаў з квашанай капустаю ў закусь гарэлчыным братам ушчэнт прапаў, вуха ад яго высачыў чыйсьці смургель, на суку сухое вярбы цяляпалася... Чайнік са свістком, венгерскі, пагудваў, бы пугач ноччу, на самюткай верхавіне тае сухастоіны,



што зусім немагчыма тлумачыць звышлюдскімі здольнасцямі вярнуць у сабе першародную малпу. Скандал (суд за шкоду) вісеў над Віцем на валаску. Паратунак яму, кажуць, сышоў з нябёсаў: кожны, каго клікалі на міліцэйскі допыт, прысягаўся чырванеючы, што ў той перадвечар акурат не выходзіў з хаты... Жанкі заядла пасведчвалі. Вазьмі прызнайся, то спытаюць, хто і што знёс на сваім гарбе, бы сабака кошку; разбіў, зніштожыў, нарабіў стратаў... Падлічаць плаціць.

Даўганогую Лань зненавідзела не маці ўжо і не Чаркесянка, а Барадатая Нюта, якая, у польскую прыватызацыю, думала была набрацца акцыяў "Карчмы". Гешэфт ляснуў, будыніне спатрэбіўся грашавіты рамонт, мабыць, капітальны. Тэхнічны агляд выявіў, што зрушылася тыльная падруба і пакасіліся філянговыя дзверы. Самым клапотным падаўся пакрыўлены ад таго часу комін, у чым жартаўнікі прывінавацілі саму Барадатую Нюту. Джгаючы ад Даўганогае Лані, вішчала на вецер ды перлася ў хлебную печ, што ў карчомнай кухні, і ў такой позе выкарысталі там крутлявую Нютку, бы ваякі ў фронт, старакавалеруючыя ананісты... Як ні як адчайныя хлапчугі! Але, прытрымліваючыся непляткарскіх фактаў, нагадаю дадатковую шкоду: асеў вугал фундамента, што аброс чарнаслівам. Якіясьці зладзюгі-валацугі раней падкопваліся пад падлогу там, дзе склад гарэлкі.

Віця Крывая Шыя шпарка вярнуўся ў Амэрыку, дапільноўваць бізнэс. Даўганогая Лань пакуль што засталася з яго старою. Здаравела маці на працяглае жыццё. Не марудзячы завельмі, выехалі і яны, абедзве за Віцем. Да вясны ад хаткі Крывое Шыіхі тырчэлі, ага, ужо адны камяні і гліняная печка, паразмываная адлігоццем, перадвясновымі дажджамі. Па Вялікадні, усё роўна што ў запозненае развітанне, зацвіў — недаламаны тубыльцамі — куст белага бэзу, у паненскім некалі агародчыку.

## ВЫПАДАК З КОСЦІКАМ

У торг на Пясках запыніў Косціка трохі знаёмы яму шанцоўнік з Млынавага завулка. Косціку не падабаўся ён за яго доўгі язык (даволі частая загана ў тых, хто любіць быць бездакорна апранутым). Загадаваўшы іспанскую бародку ды

вусы, шанцоўнік прыпадобніўся ў нечым на дагледжанага, але чамусьці галоднага ката. І ступаць пачаў неяк па-кашэчаму, перамагаючы гшебейскую качынасць (не служыў у войску?).

— Вітаю, вітаю, — ужо здалёку загаварыў да Косціка, кpануўшы пальцам бераг свайго шырокага брыля жэстам, падгледжаным у каўбойскіх кінафільмах. — Як з найдаражэйшым здароўечкам у васпана?

— Кажы па-нашаму, хутчэй будзе, — даў яму адказ Косцік і сам збянтэжыўся, што сказаў яму "ты" (здаралася з ім такое, калі беларус цiснуў на польскі лад).

Пасталі адзін перад адным.

І ад гэтага пайшла дзіўная ім абодвум размова, у якую не пра што істотнае не гаварылі ўголас.

— У палітыку залазіш, — не падараваў Косціку шанцоўнік, хоць і знізіўся да мужыцкай мудрасці ўсяго баяцца. Але парнуў, мабыць, глыбей: Косцік наскандаліў быў сваёй сястры за тое, што стала яна пярэвараткаю, каб пайсці замуж. Пры гэтым усякага нагаварыў матцы і бацьку, якія глядзелі на Вераніку не іначай, як на будучую бабу.

— Усё зводзіш да пруткай кішкі, — у такім жа тоне не змаўчаў Косцік. І хоць з іронінкай пазіраў ён на той загар у шанцоўніка, ад якога твар і шыя яго ў нечым нагадвалі спечаную цёртую кашу са скваркамі, аднак адчуў, што страчвае ўпэўненасць. Чаму гэта хлеб заядае душу? А чалавек — гэта перш за ўсё жывот?!

Шанцоўнік развёў рукамі і ўсміхнуўся так, што Косцік раптам зразумеў, куды ўваліўся. І бывае ж такое, што сам на сябе кпіну наклічаш ды анямела прымаеш яе, панурыўшыся, бы вінаваты перад судом! Шанцоўнік не спадзяваўся гэткай удачы, ён не імкнуўся да яе. Як бы здзіўлены такою непатрэбшчынай яму, ні ў чым не прыдатным тупіком Косціка, мог звычайна пайсці ад яго ды яшчэ і з узнятай галавою.

— Пабягу, ведаеш, па турэцкія кажухі: спекулянтак наз'язджалася з Варшавы, — сказаў з робленай занятасцю, як у таго, у каго няма большага клопату, чымсьці не прыпазніцца на абед дома. Гэтакія людзі без заядласці. Яны жывуць як быццам першабытнай маральнасцю — не браць для сябе вышэй патрэб.

Косціку ўраз стала брыдка за самога сябе. Гэтае пачуццё брыняла ў ім, бы аб'еўшыся недагатаванай фасоляй. Быў гэта той выпадак, калі нехта, каго ты не паважаеш, замест пакарыстацца нагодаю займець верх над табою і даканаць, узяў ды пашкадаваў



цябе... Але Косцік, відаць, усвядоміў сабе нешта важнейшае, менавіта тое, што маючы праўду на сваім баку, сам паводзіць сябе бязлітасна.

Гэтае адкрыццё вельмі спужала яго!

## ЧОРНАЯ ЛЁЛЯ

У мяне быў гешэфт з Зюнікам. Ён, вярнуўшыся з Лондана, пахваліўся моцнаю валютаю. За яе мы дасталі ў камбінатараў усё, што нам трэба было, каб звітна круціць справаю. Я любіў даходную рызыку. Адчынілі слёсарную майстэрню.

Галава Зюніка варыла памалей. Не пра ўсё мне быў сэнс казаць яму. Ён, дарэчы, і не дапытваўся, калі я не закідаў словы наконт грошай. А выпускаць з рук вялікія сумы быў у нас яшчэ час.

— Слухай, ты здаровы? — меў Зюнік такую звычку пачынаць гутарку са мною, што выклікала ў мяне ўздрыг.

— Здароў. Чаму пытаеш?

— Будзе здароўе, усё будзе, — паўтараў ён. Я не адразу скеміў, што набраўся Зюнік гэтага, пабыўшы ў чужых.

Надта ж паакуратнеў. Да выезду туды ён балаганіў, як і ўсе. Цяпер жа зрабіўся непадобным на нашага чалавека, не напіваўся і не брыдкасловіў. Гэта трохі перашкаджала ў здзелках, хоць, магчыма, што нават і не... Спекулянцкая драбнота, якой нельга ні ў чым уступаць, вынюхае, што за доўгім языком кароткі долар.

Зюнік падабаўся бабам. Яны, праўда, любяць парагатаць пры жартаўніку ды фокусніку, але па-шчырасці не шануюць такога мужчыну. Іхняя рацыя, відаць, у тым, што весялун не так заядла зарабляе грошы... Да Зюніка прысмакталася Чорная Лёля. Як я па часе зразумеў, гэта была норма: спакайноту чорт падчэпіць!

Не мая справа, што Чорная Лёля вычаўпала з Зюнікам. Зрэшты, а што я мог?! Ён перастаў з'яўляцца. Калі я, нарэшце, пайшоў да яго на кватэру, даведаўся, што ён некуды выехаў. І не адзін, — дадала паспалітага выгляду гаспадыня. Па тым, як яна замаўчала, быццам баронячы нешта цуднае ёй, мне ў той самы момант падумалася, што пекната Чорнай Лёлі даканае цэлы гэты наш гешэфт. Без Зюніка я нічога не варты.

Я яго болей ўжо не бачыў.

Неяк пасля, знаёмы камбінатар перагаворваў, што Зюнік цягаўся з Чорнай Лёляю па ўсякіх цёплых краінах, аж завалокся

зноў у Англію, дзе яна яго і пакінула. Сыйшлася з другім, і той павёз яе ў Амэрыку.

Я доўга яшчэ спадзяваўся, што Зюнік прыедзе назад альбо хаця прышле мне ўспамажэнне.

## КРУЧОК

Была магчымасць абдурыць аднаго чалавека. Сядзелі яны горбаю і здзіўляліся, чаму гэта раней не дадумаліся. Галавач схопліваўся з табурэткі, хадзіў з кута ў кут, ажно падлога скрыпела пад ім.

— Ай-ай, — круціўся, бы ад зубнога болю. — Ён жа, той, моцна хоча зарабіць, чуеце?!

— Ага, пакажы мне такога, які не хацеў бы, — злаваўся Вашай, не даючы рады выперадзіць думку Галавача. Пырнуў відэльцам у марынаваны баравічок і грыб адскочыў, бы спуджаная жабка.

— Аціхні! Хай кажа, — Басалыга зноў паналіваў чаркі; яго гэта пілі паўлітроўку.

Галавачыска важна ўсеўся за сталом насупраць іх, пальцамі выняў са слоіка квашаны агурок і, хрумстаючы кісласць з асалодаю даўно выпіваючага, маўчаў у чаканні ўвагі. У шчылінках яго прыплюшчаных вачэй паблісквалі іскаркі хітрасці, трохі так, як у замужняй палятухі, што загледзелася ў стройнага ды пры грашах мужчыну.

— Хлопцы, — закурыў папяросу, незвычайна тоўстую і з попахам свежа накрышанай махоркі. — Слухай, Басалыга, і ты, Вашай: ці бачылі вы галоднага, якому не смакуе кілбаса? Чырвоная ад чыстага мяса, з гарчыцаю і часнаком, адвараная ў крупніку з бульбаю...

— Перастань! — енкнуў Вашай; закашляўся, папярхнуўшыся слінаю.

— Ну, кідай байкі, — чыхануў Басалыга, мала не пакаціўшыся, каб не тыя, раскірачаныя ў яго, ногі.

— Гэты фраер, — так ён, Галавач, пра таго аднаго чалавека, — ёсць далікацік і мы яго на той інтэлігентнасці возьмем ды пакоўзаем... Падчэпім на кручок ідэйнасці, ай, патрыятызму, тады яму не будзе як пярэчыць нашай прапанове, — выслухайце мяне ўважліва, хамуты! Ён, зрэшты, падумае, што, калі такія морды гаворыць высокім тонам, маюць на прыкмеце надта ж нямапыя грошыкі, настолькі немаленечкія,



што аж пакультурнелі ад іх, і яму гойна не пашкадуюць... Цяміце? А мы якраз і не тое зробім палатанаму пану, ай, усянюткія сабе ў кішэні ссыплем, ай-ай!

— Задаткам якім прынадзіць варта было б, — памкнуўся Басалыга прыраўняцца Галавачу.

— Нашто? — Галавач раз'ехаўся зняважлівым смехам, пакуль не пачуў, што ўторыць яму Вашай. — Памыляешся, ай, Басалыга: жаль застаўся б у яго да нас, а так выканае ён ролю без крыўды. Яму ж пакідаем радасць служыць Айчыне, ай-ай, сабе рыхтуючы салодкую ганьбу прыбагацець на ёй...

— Як тая кабыла пад жарабцом, — ляпнуў Вашай.

Галавач лінуў яму гарэлкаю па слепняках. Прагаварыў:

— Вашай ты, Вашай: вашаём і здохнеш...

З абмяркоўкаю плана паспелі да вэстэрна ў тэлевізары.

## ЗМАГАННЕ З ПОЎХАМ

Поўх пачаў рыць на Яна. Паміж прышчэпнымі малінамі варшаўскімі і французскімі ружамі, паскуднік. Я не шкадаваў бы яму пажыць у маім садзе, калі б не крушняваў у ім вульгарныя купы зямлі; паласаваў ангельскую траўку выпуклымі норамі, у якія пагразала італьянская касілка.

Разлічваючы на інстынкт страху ў валакітнага звярка, я злосна таптаўся па тым месцы гаматнымі беларускімі боцікамі, адганяючы яго ў блізкі агарод Зоські Бабы-з-Яйцамі. І нават скакаў; заўважыў тое нейкі местачковы высалапень — распавёўшы людзям, што я прышалеў (гультаі падгледжвалі мяне за платамі Каўказкага завулка).

У энцыклапедыі прыроды дачытаўся: поўх жырue ў раніцу і ўвечары. Давай тады падпільноўваць яго з рыдлёўкаю напагатове. Але, баязлівец, таіўся, бы вуж, здалёку ўчуваючы скрадлівыя крокі. Каторагасьці адвячорку — маю варту зразумела па-свойму Зоська, рассеўшыся тым часам у прыбіральні, што ледзь чыпела ў слівах у заплоцці (апошні твор яе недарэкаватага нябожчыка мужа). Туды яна цяпер наведвалася ўсё подбегам, чамусьці задраўшы спадніцу; з усходам сонца і ў захад, а такое рэгулярнасці не было ў яе раней. І вось разрагаталася ў той гародняй архітэктуры з учарнелых аполаў, непрыстойна соладка і дзіўна страшна...

Я змяніў тактыку змагання з поўхам. Настругаў ветрачкоў, уведаўшы ад кагосьці, што шкоднік баіцца вібрацыі. Не маючы практыкі ў тым, бы хлапчаня ў майстраванне сабе самалёцікаў, пакалечыў пальцы. Заюшаны, паджгаў у аптэку за бінтамі і ёдам; у мястэчку адразу паверылі, што дабіраўся я да куслівае Бабы-з-Яйцамі. No coment! — успеніўся я невядома чаму на мове імперыялістаў. Маё абурэнне надта спадабалася мужыцкім апалячэнцам: Nie kontent — пракаментавалі і зноў загаварылі паміж сабою на ганебна-роднай.

Ветрачкі не памаглі: рыў, як рыў! У тэлевізарскай перадачы для агароднікаў сказалі аднойчы пра жахі поўху ад укопаных у грунт пустых бутэлек без коркаў: посвісты ветрыку ў іх шыйках даводзяць паўсляпога рыйніка да панікі! Я, не будучы п'яніцаю, тайна падаўся прыцемкам у пошукі тае пасуды па сметніках за гасподаю, знаходзячы ўсё замежнага вырабу бутлягі, бо гэткіх не прымалі на замен ад сінемордых кліентаў. У сонечны полудзень усенька тое чужаземнае харaство непатрэбна праменілася ды бліскацела на травяністай гладзі, што выклікала пярэпалах у маёй бойкай суседкі і яна прывяла паліцыянта. Сяржант пахадзіў між шклянымі вярхамі, усё роўна што па мінным полі; пакасіўся і на ветрачкі; абгледзеў рыдлёўку, памацаўшы трэснуты чаранок, пасля чаго запытаў у мяне, ці ведаю, што поўх знаходзіцца пад аховаю закона аб рэдкіх гатунках фаўны. Я, вядома, ахнуў ад здзіўлення! Адначасна і ўпалохаўся не ў жарт, каб не налез ён пад паветкаю на банку з карбідам ды каністру з бензінам, надоечы прыдбаныя мною ў зладзеяватых механікаў. Яны хваліліся вынікамі барацьбы ў сябе з поўхам. Гарантавалі:

— Як засунеш, пане, тое ў тую дзіру ды высокаактанавай жаўтухаю зальеш яе, а потым запалку туды кінеш, дык ракетаю жыхане адтуль, ах паночку, і поўха аж на нябесны месяц шпурне лычом навыварат, га-га-га!.. Або скрозь зямлю-планету прасадзіць яго, проста ў Амэрыку пекнай Клінтанісе пад фартушок, гэ-гэ-гэ!

Згадка таго боўта пра янкі навеяла мне думку пакарыстацца папулярным у заморскіх дэмакратаў пакараннем смерцю на электрычным крэсле. Мой поўх усё ж не павінен пакутна канаць у полымі, не пры сярэдневяковай інквізіцыі жывем жа: запушчу яму ў падзямелле фазу ў дзвесце дваццаць вольтаў, і ціха-ша! Аддаўшы затым мільён на даўжэрны кабель, правёў я на поўхава згіненне моц туды ад разеткі ў летняй кухні, для бяспечнасці закінуўшы правады на нізкарослае галіноўе



фруктовых дрэў. Гэта зацікавіла малпаватых разяваў і, на маю бяду, Зоську Бабу-з-Яйцамі. Пакуль што і да чаго аднак, поўніўся я радасцю тэхнічнага рацыяналізатара, калі прыемна чуць-чуваў раптоўны віск у вечарэючым агародзе або ў святлеючы дзень, як толькі націскаў уключальнік ля дзвярэй з ганка на падворышча. Пусканўшы тых вольтаў з амперамі, выбягаў з батарэйкаю у руцэ пабачыць, ці ўжо вылез поўх у канвульсіях імгненнай агоніі... Але замест таго далятаў да маіх вушэй імклівы трэскат штыхетаў ды — быццам чортавы — тупат у нябачнай цемры. Пра гэты загадкавы вэрхал дадумаўся назаўтра: у малінніку калыхалася чыясьці зашмальцаваная шапка.

А Зоську лёс спакусіў напрыканцы тыдня. Модзячыся суботнім прысвяткам (а я якраз падключыў быў "устройства"), надумала разрумяненая ўдовіца занадзіць мяне да сябе, прыкінуўшыся сімпатычна заінтрыгаванай тымі канструкцыямі ў ружова-малінавым закуцці: драцянымі спіралямі, шпянямі тырчма, таемнымі электродамі. Не паспеў заенчыць на яе, каб не ішла, як тут жа брыкнула яна, бы ў валянтове закаціўшы вочы пад лоб! Мігам адключыўшы апаратуру — з дранцвеючым пачуццём некалі адкінутай ад сябе нямецкай гранаты, — я падхапіў бабу ў гінекалагічнай позе ды прыпёрся з ёю ў спальню: адратаваў, лыжачкай поячы салёнай для электралітычнай нейтралізацыі вадою.

Пайшла гуляць плётка, што зрабіў ёй аборт.

Поўх перабраўся пад яблыню-манастырку і ўзяўся рыць яшчэ больш заўзята. Уз'еўся на тыя бутэлькі, перакідаючы адну за адною, і цяжорную з-пад рускага шампанскага.

Камбінуючы, што мне з ім далей чыніць, запыніўся я, урэшце, на тым банальным факце, што маю дачыненне з мясаедным стварэннем. Даўно трэба было так падумаць, а не слухаць неінтэлігентных выдумак! Нарыхтаваў атруты, нарэзаўшы — кшталтам чарвякоў — сырога мясіска, якое вымачыў у зверабойным растворы на пацукоў. Заклаў у норы. Поўх, пэўна, насмакаваўся б майго браканьерскага частунку, калі б не выпіхваў ён зямлю са смакоццем наверх... Знюхалі прэпарат валачашчыя каты і неўзабаве выкацілa іх да астатняе нагі. Адбегшыся, здыхалі ў задворках вуліцы, стаючыся безабароннай спажываю ўдзічэлым сабакам. Цюцікам не паздаровілася такая кашэчына, хоць выжылі, валяючыся і выючы, бы дварнягі па нябожчыку ў гаспадарцы.

Гмінны ветэрынар прывёз эпідэміялагічную камісію. У

таварыстве камендаята паліцыі хадзілі акуляршкі з двара у двор, шукаючы прычыну заразы. Справа аказалася няпростай дзеля выяўлення, бо сканаўшых кісаў паелі псы, якія пасля разбегліся здаравець у завыганскіх гушчавінах.

Нарабіўся і я сам, стрымгалоў дэмантуючы немалую за гэты час сістэму зніштажэння поўха — бутэлькі пабіў і закапаў, ветрачкі папаліў у печцы цэнтральнага ацяплення, электратэхніку шпурнуў у апухі на гарышчы. Утрамбаваў нарыіны. Засталося дагадзіць гаварлівай Бабе-з-Яйцамі, каб не ляпнула чаго камісантам. Як апараны паспеў наведацца да яе з малдаўскім каньяком за пазухаю, з шакаладкамі; прымусіўшы сябе ўсміхацца здагадлівым дурнем.

Усё адбылося ў тэмпе і наўздзіў гладка. Можна сказаць: так добра, што аж нядобра!

— Рые? — запытала Зоська гарачымі губамі; мы абое ўжо былі пасля трэцяй чаркі.

— Ага, — выдыхнуў я, вызваляючыся з яе ўчэпістых абдымкаў.

— Гэта на наша шчасце, — сказала з далёкім намёкам.

— Няхай рые, хай яго халера возьме! — пракляў я злыдня і абсунуўся ў сон.

## ПРОСЬБА

Калі ён адразу згадзіўся з маёй просьбай, я зразумеў, што нічога з гэтага не будзе.

Падтакваў мне неяк не па-мужчынску... Мы размаўлялі на рагу Цёплай; ад агарода каля адвентысцкай капліцы навейвала на нас пахі язміну і — ўжо — вечарынак.

Я глядзеў у яго такія спагадлівыя вочы.

— Так, ага, — ён зноў пацвердзіў.

— Зрабі мне гэтую ласку, дзетка! — я яго вельмі прасіў. З сардэчнасцю таго чалавека, які ўсё-такі чагосьці спадзяецца ў важным для сябе.

Мы пачалі былі ісці ўглыб вуліцы і я — нанава выклаў яму сутнасць маёй просьбы, і падрабязна пераказаў справу. Усё ўявілася ясным; ён нават тайком пазяхнуў, а ягоны зрок — замглёны, і як бы заплаканы, — тужліва кіраваўся ўдалечыню. (Успамінаючы тую сваю размову з ім, бачыцца мне, што нагадваў тады я сабою паганага хлопца, якому не можа прабачыць дзяўчына...).

Я, вядома, дапусціў памылку: патрабаваў ад яго карысці толькі сабе! Была гэта чыстае вады просьба, аб якой можна прачытаць у рыцарскім рамане (наіўным). Нерэальная. Здараюцца, праўда, адступленні: калі пачцівы чалавек мае дачыненне якраз з такім жа, што — зазвычай — лічыцца вялікай рэдкасцю.

Мне, выгнанаму з саліднай пасады, было цяжка ўбіцца на іншую, болын-менш прыстойную работу. Прытым душылі мяне нягоднікі, якія, на маю бяду, мелі рацыю (па прычыне некаторых маіх паводзінаў)... Я, бы тая рыба на беразе, усяляк кідаўся, гатоў ухапіцца за самы скромны кавалак хлеба, каб перачакаць найгоршае. — Гэта ёсць страшнае — пакутаваць ад слушнага зневажэння з боку менавіта тых, якія даўно не заслугоўваюць добрага слова!

Разлічваў на тое, што ён, — так, ён! — дапаможа мне стаць на работу, хаця б абы-якую, і, такім чынам, дасць магчымасць жыць збольшага па-людску, дабіцца духоўнай раўнавагі, вярнуць яшчэ незгубленую мною чалавечнасць. Паступіць на службу без непазбежных у падобным становішчы тлумачэнняў як ад новапрынятага. (Я быў не першай маладосці, калі, пасабачаны акалічнасцямі, апынуўся сярод нескупых на сяброўства рэкамендантаў у прайдзісветы).

Я разважыў, што прыняць мяне, няхай сабе і ў грузчыкі на дайлідскім складзе дошак, будзе яму малы клопат як дырэктару дрэваапрацоўчай фірмы, якой — трэба і гэта дадаць тут, — пастаянна не хапае рабочай сілы.

Мая просьба, цалкам голая і без якога-колечы аспекту даверу да мяне, а нехта сказаў бы: прасцяцкая, мінімальная дарэшты, безабаронная вось... Ах, колькі гэта гаварыць пра ўсё! Дарэчы, а ці варта?

## БАЛЬ НУВАРЫШАЎ

Новы год сустрэлі перш ва ўправе гміны. Гэта там моцна бухнула. А дванаццатай уночы, выпіўшы, войт выхапіў ракетніцу ў каменданта паліцыі і стрэліў на віват, пад сукню свае каханкі. Спрытна; баба не паспела перапалохацца, а сама ракета жыхнула цераз аздобныя яе фалды проста ў буфет, запаліўшы скрыню

алкаголяў. Бутэлькі трэскалі, пырскаючы сінім полымцам на мужчынаў, што не адступаліся. Пакуль гарэла жытнёўка і тлелі каньякі, сітуацыя не бачылася безнадзейнай. Памылку дапусціў потым менавіта войт, паліваючы вогнікі газаванай вадою з сіфона. Заняўся затым раял-спірт, гэтая дарэмшчына ад савецкіх кантрабандыстаў, якіх наарыштоўвалі на перадкалядным рынку.

Жанчыны — фыркатлівым кагалам — апынуліся на вуліцы, па-гусінаму то гевалцячы, то аціхаючы ад далятаючых да іх камандаў у бальнай залі: "Анучамі гасі, булава!"

Дэтанацыя расейскіх бутлягаў аказалася не столькі шкоднаю, колькі гуллівай. Хваля паветра здзьмухнула павярхоўны пажарык. Накапцілася празрыстага дыму з дурманам дэнатурных пахаў. Пацвеpазелыя спадары, засупоненыя гальштукамі, пырхліва абмываліся ў санітарыяце. Квяцістыя спадарыні радасна наводзілі парадак на неўсмаленых сталах, пасля чаго ўсім таварыствам прычакалі войта з любкаю. Яна, прычэсаная пад Мэрлін Манро, пляснула пацалуначак у саланіністую шчаку дабрадзея, сказаўшы яму сіплым галаском: "Бядуля ты мая". Ён, вытрашчыўшыся сяржантам на дэфілядзе, гыркнуў, аж паліцай ляснуў абцасамі: "Гу-уля-ем!!!"

І ўзнялася катэгарычна энтузіястычная п'янка (на рахунак цяпер крамніка Махлярчыка).

Свая кампанія навагодзіла ў мясніка Казарэза, і свая ў млынара Пыталя. Сялянская нудота па задворках нікуды не паказвалася ў той вечар, дрэмлючы перад тэлевізарамі са святочнай хярнёю.

Казарэз праявіў фантазію, прычапіўшы коцікам да хвастоў штучныя агні. Беленькі з іх, выпушчаны пад усеагульны рогат на падворак, скачучы іскрыстай спружынаю пагнаўся ў падваротню стадолы. Большы, рыжы і хітрэйшы, рынуўся ў балаганна расчынены гараж, у які награмадзілі былі правінцыяльны запас бензіну. Стадольню затушылі б, калі б не пачало рваць тыя каністры і каціць адтуль палыхаючыя колы з псыканнем байкавых змеяў... Па Казарэза прыехала з блізкага горада карэтка хуткай дапамогі.

Пыталь жа дурэў спакайней. У поўнач падбухторыў кагосьці з гасцюючых у яго, каб паездзіць з ім аўтамабілем па вулічках, а ён будзе трубіць ды шпурляць праз апушчанае ваконца шафёркі петарды ў заплоцце. Было што паглядзець: адна за адным яснелі электрычным святлом вокны ў хатах, скуголілі дварнякі, з крыкам падымаліся ў адліжнае неба вароны, заначаваўшы ў старадрэўі, драпала з развальных прыгуменняў дзікае звяр'ё.

І хоць пабольшала выдумак у мясціне, усё роўна бядак бедаку не пастараўся, учыніў адвечна тую самую неспадзяванку: здымалі з крукоў брамкі, закідаючы ў чужы закутак, каб добра пашукаў... А я нікому і таго не зрабіў, самахоць прыхапіўшы сваю ламарэндзіну з засаўкай, як толькі звечарэла: хай хто прыемна падумаў, што нехта ўжо начоўп мне дураты.

ПераЖыўшы атракцыёны нашай новай буржуазіі, я, аднак, з некаторым страхам чакацьму дзевяноста пятага года. Што здумае тады войт, а што Казарэз і Пыталь?!

## ХЭЎРА

Франак-Амэрыканец гаварыў з Хлусавым Толікам; сцябалі самагонку ў Вераб'іхі, начэкваючы трэцяга. Ён павінен быў прыйсці з прыцемкам, калі людзі ў мястэчку парассядаюцца перад тэлевізарамі.

Вераб'іха, насмажыўшы ім яечні са скваркамі, ды паставіўшы на стол што трэба, таўкла ў сенцах бульбу свінчаці.

— Ты, Толь, мяне ведаеш, — павярнуў гутарку да гешэфту Франак.

— А каб не!

— Помні-запомні, Толь.

— Ну і што ты ўсё не верыш мне, Франак!?

— Хлíснем, давай, бо заснем...

Пілі надпіваючы, каб не дагаварыцца да благоты. Той чамусьці не прыходзіў і яны адставілі няскончаную бутэльку, адсунулі і закусь, быццам рыхтуючыся пагуляць змаганнем на рукі. Не запальвалі святло. За ваконцам, у бок Купцовага луга, мігцеў на дождж маладзік. Вераб'іха грукала ў каморы, не забываючы, што яе хлеб патаемкі — гэта не чуць лішняга.

— Ідзем, Толь, — падняўся з-за стала Франак.

— Ага, не прылез, зараза.

Франак-Амэрыканец змоўчаў так, што Хлусаў Толік крадком адставіў прыхаваную ім пад палу недапітую паўлітроўку, назад. Ён трохі ведаў таго, каго не прычакалі, і ў душы пашкадаваў яго з тым страхам, з якім літуюцца над няшчасна пацярпелым суседам, самі дзякуючы Богу за лепшы лёс.

## МРОІ ПРОШАПАНА

Агатка, пажылая жонка Прошапана, зацяжарыла ў памятную сушу, калі людзі ледзь маячылі ўжо ад знямогі. Прошапан — нияк няўдала — пахвальваўся гэтым і, каб узвысіцца над недарэчнымі халопамі, шторанку галіўся да самое сінечы скуры на барадзе. І хоць дзецярні Прошапанам хапала і без таго, і бяды ад яе, але ў той раз адбывалася ў іх нешта ўсё ж радаснае... Яны, пакуль і самі, добра не ведалі, што менавіта. Агатка не адразу пасвятлела на твары, відаць, падумаўшы пра свае пад пяцьдзесят, у якія жанчына не павінна нараджаць; як вядома, ператвараецца тады яна ў бабу (мужчына ж горбіцца ў шэсцьдзесят).

Бог, прытым, не скупіўся Прошапанам на ўдачу. Дарослыя сыны, як угледзелі маці зноў з жыватом, шпарка і багата пажаніліся з забеластоцкімі мазурыцамі. Гэта далося ім досыць проста, бо мазавецкім гаплючкам імпанавалі — ліцьвінскае пароды — мужчыніскі, бамбізы пад бэлькі ў столі ў мухаройных халупах. Не адно ў якасці парабкуючых прымакоў на тых гектарных раўнінах; паказалі сябе ў пасцелі ўстойлівымі дубаснікамі, непараўнанымі з тутэйшымі задыханымі заморанікамі.

Прошапанок, тым часам, ажно падспеўваў ад задаволенасці, пераважна, сяк-так чуваныя ў маладосць легіянерскія паходныя песні або і бальшавіцкую "Кацюшу", калі не было каго дома са сваіх палякаў (Агатка ўпалохана супыняла: — У пекле з маскалямі згарыш!).

Прошапан не быў бы Прошапанам, калі б ад такога сваяцтва не пачуваўся ён у сёмым небе! А яшчэ і нічога яму не каштавалі тыя раптоўныя вяселле за вяселлем. Ці ж выдаткамі назавеш гэта тое, што надаў быў хлопцам хатняга дабра, вышныпаранага на пыльным гарышчы, у пасажных куфрах? Прысадзістыя нявесткі з фанабэрлівых жа хутароў абдорылі яго "эквівалентамі"; навюсенькім касцюмам з амэрыканскага барахла каторасьці паддабрылася. А піў-напіваўся на "актах вэсэльных", мала не выпрасціўшыся пад плотам у ванітаванне! Моцна весяліўся Прошапан! Крыху з потайнай згрызотаю: спасланыя лёсам сваты і сванькі чамусьці паказаліся малютамі, бы японцы, а ўжо ж клубастая Агатка рассядалася сярод іх шырокакрылаю квактухаю.

Гадаваліся ў Прошапанаў, таксама, і дзяўчаткі, даволі лыткастыя падлеткі. Трэба ж упільнаваць курачкі, каб кавалерка не схапіла за чуб зіркасцейшую якую. Потым будзе не дапытацца, хто рагатусе насаладзіў... З дочкамі вечны клопат. Жанатыя браты, на шчасце, не забудуць пра сясцёр: куртатаму мазуру толькі давай русінскага гамата!

Камбінаваў Прошапан самым розумам: бацькі бацькамі і на тое яны і бацькі, каб сысці калі-небудзь у магілу, пакінуўшы ўсенька нашчадкам сваім. Значыць: Прошапан і Прошапановічы з Прошапановічанкамі раней або пазней накладуць рукі на тамтую шляхцюкоўшчыну — з умураванымі хлявіскамі, стадоламі на два такі, спружыназвонными машынамі палявымі ў шопах, трактарамі нямецкае маркі, уробленымі палеткамі пад пшаніцу і цукровыя буракі, сасновікамі на ўзгорках, з якіх не адзін дворык з пеўнікамі ў шчытах адгрукацьме. Прошапан аж дубянеў, калі занадта надумаў думанае: жарты, такія магчымасці!

Яксьці не прыходзіла яму ў галаву, што і сам ён напраўду некалі памрэ. Шчаслівыя або зайздрослівыя не дапускаюць да сябе смерці.

Прошапан заеўся быў і тыднямі не браўся за чарку, збіраючы грошы, вось, на атлас анатоміі жанчыны. Парфумная беластоцкая курва падманула яго набыць і атлас мужчыны, асабліва з дадаткам палавых органаў ды іхніх папулярных хвароб. Ён, бач ты яго, пажадаў навукова даведацца пра ўмовы напаткаўшае цяпер шанцоўнасці. Наглядзеўшыся каляровых кішак ды страўніка, усяго таго мясніцкага балагану ў целе, узяло Прошапана бяссонне. Не адыходзілі ад вачэй і тыя органы, то ў выглядзе рэзанага кімсьці салыхісончыка, то накшталт трэснутага ад пераспеласці гарбуза... — Ужо ж насохся ад уздзіву, што людзіна так быдлячая!

Прошапану далей рупіла чагосьці. Закінуўшы дактарскія малюнкі ў апухі, каб Агатка не пабачыла нутраныя жудасці або дзяўчыняты не ўведалі пра венерычныя фокусы, ён пацішэў у чаканні родаў у бабы. Гэта яму нясцерпна доўжылася, і Прошапан час-часам даставаў назад медычныя фаліянты, сцішна зашыўшыся з імі ў закутак пад кроквамі, пакуль мышы не паелі, сцерабілі перш вокладкі, а затым і непрынадную сярэдзіну з ілюстрацыйнымі бэбахамі. Яго энергія абярнулася на дачок: чаму яны памалу растуць? Ён прыемна ўяўляў іх сабе ў вэлюмах, гаспадынямі ў гербавых радзінах, радзіцелькамі патомных паноў, далікатнымі і белатварымі, без мужыцкага загару на шчоках, плячах і грудзях... Замілаванасць Агаткаю то слабела, то

мацавела у ім.

Зразумеў Прошапан, што настарацца дзяцей — гэта залаты інтарэс! Палову гміны можна імі пасля абсадзіць і войту ў сакратаркі каторую свежарослую харашуню падбухторыць, каб падаткі меншыя прысылаў плаціць. Але, на жаль, Агатка не здолее болын. Няма іншае рады, як замену ёй шукаць? Прошапан спачатку жахнуўся ад такога здогаду, бо ведаў: Бог не пахваліць і смехаты ў народзе начаўпецца, што хоць ты ў сабакі вочы пазычай! Тым не менш мазгаўня працавала і выйсце як быццам знайшлося: немаўлятак падкідаць будуць Агатцы падкупленыя распусніцы, а ёй столькі тае работы, што прыкідвацца аднова пузатай... Падлічыў кошт, параіўся са знаёмым лайдаком, і план гатовы.

Калі Прошапан растлумачыў усё Агатцы, дакладна і дэталёва, з падрахункамі, яна ні то засмяялася, ні то заплакала. Пасядзеўшы ў задуменні за сталом у пакоі, куды не пускалі смургеляў, нічога не сказаўшы, угрэла свайму Прошапану ў гладкую ды пахкую ягоную морду, ажно зазіхацела яму вялізнай лямпачкаю і задраў ён доўгія ногі, мала-веля не чапіўшы ботам нізкую дзеля аздобы жырандолю.

— Яшчэ раз такое мне скажаш, яйца табе выражу, — пачуў ад жонкі ціхую праўду (каб дзятва не пачула).

Прошапан неўразуменна матлянуў булавою, стрыжанай пад свістуноў з рок-гуртоў, і аблёг на падлозе з квяцістым дываном, крыху нагадваючы сабою дбайна дагледжанага нябожчыка, які павінен быў яшчэ жыць і жыць.

І так, радасць у Прошапана аказалася нядоўгай. Ён і не вельмі смуціўся, але кінуў хадзіць выгаленым штодзень і па-афіцэрску выпрастаным. Вярнуўся ў мужыцтва ды не настолькі, каб у нечым не вырозніваццa з натоўпу. Сыноў засмактала, спападнае ім, багацце; дочкі падрасталі непрабачальна марудна; Агатка цяжарыла ўсяго шосты месяц...

Прошапан, аднак жа, нешта апланоўваў, не здаваўся, але заўзята маўчаў, каратаючы дзень да вечара ў гаспадарцы.

## КОЛЕВА ЧАРКА

Добры хлопец Коля хліснуў гарэлкі, калі, набыўшыся ў Амэрыцы, прыпёрся назад. От, са страху бадай, чым ад радасці.



Вельмі магчыма, зрэшты, што ад усяго пакрысе... Бо жонка жонкаю, але трэба ж было яму аднавіць штат у фірме. Кампанійцы, ушчаперыўшыся за посткамуністычны капіталізм, схаладнелі тым часам, бы нейкія еўнухі. Коля зразумеў, што гэта такое чаўпецца: вітальныя абдымкі цяпер нічога не значаць, не больш за фальклор на сцэне. Сялянскі ў ім інстынкт самазахавання ды практыка багатыраватых бацькоў падказвалі: трэба тут самагонкі! Дастаў бы яе ў лесуноў або ў падбеластоцкіх дэгенератаў, не зважаючы нават на рызыку сесці ў турму. На шчасце, ажно гэткая адчайнасць аказалася лішняй.

Коля пасучыў быў кароткімі нагамі плебея ў прымітыўны гандаль-дом з камічнай шыльдаю ДЭЛІКАТЭСЫ. Грудзістая прадаўшчыца там, беспамылкова пазнаўшы пана па халявах, наставіла на прылавак перад Колем батарэю снарадападобных бутлягаў з дэнатуратна-сінімі галоўкамі: танна і многа. Адгадала ж яна, каго ён участуе. Фундацыя каньякоў такім — гэта смешнае непаразуменне: шклянкамі павыпіваюць і яшчэ абгавораць, што блашчыцамі смярдзіць...

П'янку інаўгураваў былы Колін бос, кульнуўшы першыя сто грамаў градуснае атруты. Па тым, як вырачыўся ён пасля і спападна гомтаў закусь, Коля ўцяміў, што справы пойдуць на лад. Але гэта чамусьці пуганула дамоў службовых бабаў... Таксама і слабакоў неўзабаўку. Засталася эліта і ён, Коля. Ні спачатку, ані потым не даходзіла да ягоных мазгоў сцішная тая драматычнасць ўзніклай яму сітуацыі аднаго на траіх. Даверліва засеў насупраць здаравезных варацілаў. Бяда, бы павук са столі, павісла над ім.

Не піў мала, каб не абразіць уфундаваных. Ратаваць сваё хілае здароўе вырашыў, аднак жа, безнадзейна позна. Самы бязвінны спосаб для гэтага — выйсці ў туалет, што не выклікае падазрэнняў у надуманасці змыцца. Так і ўчыніў. Паспеў у апошні момант: пачаліся аслабляльныя адрыжкі... Памятаў яшчэ, што хапіла яму мацаты растапырыцца над умывальнікам.

Закруцілася ўсенька ў галаве каляровай кінастужкай падарожнага фільма пра звяроў Афрыкі: рыкалі ільвы, трубіў слон, гагаталі гіены, бубнілі там-тамы, нешта свістала і гікам гікала... У рэшце рэшт угледзеў над сабою таўстазадую негрыцянку ў раскалыханай спадніцы, якая спакваля прыпадобнілася да начное старажоўкі Фені з яе смешна-польскім крыкам "А цо пан запаскудзіўся, бы дзеўка ў першую цёнжу?!"

Гэта страшэнна паўплывала на Коліка! Нагадаўся яму нью-

йоркскі Гарлем, адкуль гопаў сярэдзінаю стрыт-асфальту, шчасліва ашаламіўшы пляскатых чарнюхоў расейскімі мацюкамі. Асцерагаўся з гэтым нумарам на задворках польскага Грын-поінта, дзе анёл розуму злітаваўся над Колем, шапнуўшы яму паабяцаць тутэйшым панажоўшчыкам уз'яднаць Беларусь з Польшчай... Дурні паверылі і Колька застаўся ў жывых.

Элітная троіца знепакоілася невяртаннем Колічкі. Кіруючыся на гармідар у дамскім, чамусьці, туалеце, не памыліліся: убачылі Колю на падлозе, над ім жа сакатлівую бабу і смяшлівую, аднекуль, паненку. Сам ён рабіў уражанне ліцэіста-пераростка, якога толькі што экстэрнам школілі на мужчыну... Колька знямогла засынаў і яму яны ляскалі па шчоках, каб падымаўся, аднак, ды пайшоў ужо сабе да мамы, да таты. Прыгледзеўшыся пацверазелымі вачыма да букету ружаў на Колінай кашулі, эліта апазнала накрушняванае ім нястрымна французскае "салятэ", якім частаваліся пад чарку... Тыя агледзіны не маглі закончыцца іначай, як тым, што геолагі называюць вулканічным эфектам або ажываннем кратэраў.

Усе чацвёра затым апынуліся ў шпіталі, у заразнай палаце. Іх усяляк абследавалі і яшчэ звазілі верталётам у цэнтр рэдкіх хваробаў, дапусціўшы дыягназ інфекцыі сюды неразгаданае эпідэміі, што ўзялася ад інтымнага кантакту чалавека з асаблівым гатункам афрыканскай малпы ў кангалезскіх джунгліях. У гэтым вінаваты быў зноў Колька: ён непатрэбна прамовіўся перад тымі канаваламі, што выязджаў быў з Еўропы ды братаўся, хоць і няўдала, з патомнымі чорнага кантынента...

Пасля ўсяго гэтага эліта сцяміла, што з Коленькам кашы не наварыш і бяспечней будзе адвязацца ад яго.

## НАЕЗД НА ХАМУТОЎ

Святы Франак, што баяўся дзяўчат і ўсё пекненька казаў "дзянкуе" і "дзянкуе", чамусьці дастаў па зубах ад высранскіх кавалераў на музыках у лесуноў; у нашым Жыдоўскім завулку закіпела. Падшпаркі слепацелі на напухлую, бы сліва, губу Святога. Ён мацюгаўся, але, згледзеўшы спеючых дзяўчынак у плойме смургеляў, хаваўся ў хату.

Заходзілі да Святога Франка сябры і стала вядома, што хамутам дастанецца за яго. У слёсара Роварчыка тым часам



даводзілі яны да ладу свае матацыклы. Валтузіліся з вайсковым маторам, што са зручнаю лодкаю кулямётніку... Моцнае ламарэндзе гэтае магло перці на сабе трох хлапчугоў з камянямі за пазухаю. Нехта з іх прывалок заезджанага савецкага "Іжа" з прычэпкаю пад брызентам, так што тэхнікі не бракавала.

Камандзерыў Чорны Грышка з Браварнай. Ваўчыца, смольнай пароды яго сястра, нарыхтавала бойкіх яблыкаў, нашпігаваных якойсьці ўедлівай поскуддзю. А кожны сам сабе прыдбаў шворань, абгорнуты дзеля няпознатку газетаю.

Засталося чакаць танцаў на Спаса ў тым Казловым Лузе.

Як толькі надышло тое свята, Чорны закамандаваў збірацца ўсім пад вечар за спаленай у вайну гарбарняй Сруля. У гэтым — някідкім у вочы — месцы каторы раз прымеркавалі, што і як будзе; затым пагазавалі да казлоўцаў. Кіраваліся не на голую шашу; няспешна пэрхалі ўтравелымі дарожкамі ў палях, раз'яднаўшыся адны ад адных, усё роўна што чужыя (канцэнтрацыя напрыканцы).

Чорны Грышка, набыўшыся польскім капралам, ведаў тактыку ды спосабы. Узяў з сабою Святога Франка, каб апазнаваў мардабойнікаў.

Уязджаць завідна ў Казлоў Луг не планавалася. Заляглі ў зарасніках, на канцавым загуменні. Музыкі пачаліся былі — чулася, але слаба бубнілі, начэкваючы кавалеркі, якая яшчэ сцябала па хатах сівуху (паненкі канчалі модзіцца). У падворышчах людзі віскліва кармілі свіней, бабы курэй клікалі. Ад лесу пастух гнаў кароў з пашы, што здаля магло падацца пяхотнаю ротаю з вазамі рыштунку ды правіянту...

Узышоў месяц і кусалі камары, калі Чорны Грышка махнуў у траву недакурак, гучна сказаўшы:

— Цяпер, хлопцы!

З трэскатам павыводзілі з гушчавіны маторы і з рыкам ірванулі туды, да пагулянскай ламатні з п'янымі спевамі. Гамавалі каля парога святліцы так, што мала не пападалі, а густы пыл наляцеў за імі, укрыўшы ўсю гэтую каманду. Чорны Грышка саскочыў з вуркочучай машыны першым і нема заенчыў на парозе:

— Кесе сю §6гу! — і пагрозліва размахнуўся над галавою доўгім шворнем, з якога ападала паперына, нагадваючы белы штандар капітуляцыі.

Вашаі зарагаталі, убачыўшы местачковых шванцаў. Калі, аднак, поруч з Чорным з'явіўся Святы, нехта пагасіў ліхтар пад

столлю і зрабілася ціха, бы ў прыход начной навальніцы.

— Ręce do góry, сказаў вам, — паўтарыў без сэнсу ў цемнаце Чорны Грышка, дапусціўшы тым самым памылку небандыта.

Аднекуль адказаў яму сіплы голас выпівайлы і курца:

— Пацалуй у сраку!

Узняўся вэрхал і Чорны аддаў загад сябрам:

— Яблыкі! — і зашпурлялі яны імі неўпапад. Ад гэтага тхнула адтуль нейкім аптэчным смуродам і зараз першабытнымі крыкамі дзяўчат. — Назад! — была наступная каманда і сябры гурнулі да абачліва непагашаных матацыклаў. Святы Франак спатыкнуўся, але Чорны Грышка падхапіў яго за каўнер; ніхто не застаўся пад мужыцкімі ботамі.

Дагналі і перагналі наезнікаў казлоўскія сабакі. Падралі нагавіцы Святому, які сядзеў ззаду за Чорным; уцякалі яны апошнімі, па-камандзерску прапусціўшы сяброў дапераду. Франак страшэнна перапужаўся і ад таго схапіў ушчаперанае яму за нагу малое сабарно за карак ды падняў над зямлёю — адурэлы такім лётам дварняк завыў дзіка і ад гэтага цэлае ган'ё некуды прапала.

Ды адна бяда не бывае. У святло пражэктара пярэдняга матацыкла ўбег малады, то і дурны, заяц, як аказалася пасля. Чорны Грышка ледзьве запыніўся перад карамболем. Святы Франак, які верыў у злыя духі, не адразу сцяміў, што не вогненныя гэта чэрці бліскацяць перад ім ды бахаюць жалеззем, скачучы ценямі ўсё нібы з нябёсаў ды ўніз на дарогу рагатымі ілбамі...

Тым часам Бог адняў розум якраз казлоўцам і яны выбеглі за вёску, каб паквапіцца нагодаю накаплешыць удосталь. Гопалі, бы збунтаваныя ў паншчыну халопы, паддаючы жару самі сабе ебукамі (на шчасце не дадумаліся ўзяць вілы ды сякеры). Чорны Грышка — а ў такі пограз ён сухі, аж іскры з яго сыплюцца — гукнуў, як пых полымя:

— Гасіць фанары! Маўчаць!

У невідушчую цемнач балаган пагоні аціх і можна было ўявіць сабе, як тыя пасталі ў купе, чуйна ўслухаўшыся. Сябры гэтак жа не варушыліся, ад стрымнага страху разумеючы, што вось у дажджавое хмар'е ратунак, бо паніка закончылася б капліцаю ім. Абедзве зграі цішыліся з паўгадзіны, хоць недысцыплінаваныя мужыкі выяўлялі час-часом сваю прысутнасць баязлівай лаянкай: "Ану, шванцы абструганыя!"



Чорны загадна шаптаў:

— Хлопцы, ні з месца! Хамуты ўсраліся!!

І сапраўды, тыя неўзабаве загарлапанілі, як і павінны забабонныя варвары, упалоханыя чарамі свету. Іх гамана аддалялася. Сябры асцярожна, без дзвэнгання, пападымалі ўсяляк паваленыя маторы і, не маючы пэўнасці ў іх непапсаванасці, павялі ў руках. Дзіўнае гэта было вяртанне, доўгае і ўтомнае. Рыхтык зладзеі, што набраліся здабычы ў падлесных засценках багатых хутарцаў...

Местачковая галота заядла ганарылася сябрамі з Жыдоўскага завулка, у паслейшых аповядах якіх пра тое здарэнне нават гранаты рваліся ды біла артылерыя, пакінутая адступаючымі немцамі каля — узарванага партызанамі — мастка на Балатнянцы.

## НОЧ ВІЯЛЕТЫ

Віялета была жырная; ела нават бульбу з постам. Адзін раз прачнулася ад голаду і сярод ночы распаліла ў пліце ды насмажыла пляцкаў з пшанічнай мукі. Так аб'елася імі, што не магла здыхацца. Цёпла апранулася, каб прайсціся па мястэчку. У скверыку гулі п'янюгі, грызліся, бы тыя паршукі на выгане, і Віялета пасунулася далей ад вулічнага святла. Зайшла яна за Антыфонавы стадолы, за якімі пачыналася балаціна ў кустоўі. І хоць баялася чорта лазатага, раптам схапіла яе злосць на мужа свайго, які ўжо каторы год не варочаўся з заробкаў у Нямеччыне. Віяліта тут, у гэтай поначнай пустэчы, зразумела, што Артур пакінуў яе, бяздзетную.

Вярнуўшыся дахаты, яна кідала ў агонь усенькія яго дарункі, напрысыланыя ім у пачках. Вялізную бутэльку іспанскага віна выпіла, не адымаючы губоў, і яно пакаціла яе. Калі ачуняла, быў дзень на двары, па вокнах дзынкаў дождж з градам, а сама яна ўся калацілася ад дрыжыкаў; лоб паліла гарачка. Мела яшчэ настолькі змогі, каб давалачыся да лекара на Акопах, адкуль павезлі Віялету ў далёкі шпіталь. Пакуль паспела даць знаць сваячцы, дабро яе павыносілі валакіты, толькі мэблю не рушылі.

Віялета выжыла, але здароўя ў яе ўжо няма. Ходзіць, як шкілет нейкі, і часта плача.

## МУЗЫКІ Ў ШУДЗЯЛАВЕ

Паслаўляюць музыкі ў Шудзялаве. Свабода тамака. Навалачы наехала жыць. У "белае танга" б'юць у морду, каму трэба. Здараецца тое і ў модную "трасцу". Тады не так салідна. Мала часу. Без настрою.

Скачуць местачкоўцы. Крынчане. І ім дастаецца ўкаплех. Бывае — і паненкам (дзягаю па лытках). Музыкантаў не чапаюць. Яны паследкі тут.

Рэня Пупянка патраціла прычоску. Газетаю нехта жыхнуў.

— Так табе, а так! — крычала Пупіха на дачку. Кавалер гэта вазіў Рэню "ладаю". Дык і ўцякаў, газуючы. Уцёк бы, калі б не мацёра Вашаіхі. Разлеглася, падла, за мастком у калдобіне... Страху наеўся. Гэта не калецтва. Не тое, што Рэні.

Музыкі ў Шудзялаве, го-го! Слабаку не туды дарога. І запазычанцу. А яшчэ і той панясе "фанары" пад вачыма, у каго нарачоная без круцелеватасці грэшніцы.

Разаніна ж у Шудзялаве на Зелную. Ага.

## ПОЗШ РОЗУМ АЛЕГА

Начамі грымела ў Лапіцкіх горах, парыла духоццем. У даліне — каторы дзень! — стаяла сонечнае, хоць замглёнае ў небе, пагоддзе. У свята Ільі і пасля яго дажджы не падалі. Сярэдзіна лета. У такую пару здараюцца вечары, у якія няма чым дыхаць ад бязветранай цішы. Затыкае тады ад моцнага паху медуніц пад вокнамі. Звіняць камары, што хмурынкаю вiруюць пад блізкаю лістотаю вішні. Кідаюцца на шыбы спасаўскія мухі, ўжо не куслівыя. Міготка залятаюць пад апухі ластаўкі; гняздуюць яны ў руінах, пакінутых за Гарбарнай, жыдоўскіх муроў. Цямнее яшчэ даволі позна, можна паспець парабіць задуманае ўрань.

Алег, нарадзіўшыся тут і выгнаўшыся ў кавалеры, жыў — аднак — у глыбі Полыпчы, дзе лягчэй з грашыма ды выгодаю. Не ён адзін так. Зорны час ягонаму пакаленню ўсё ж праламаўся як бы напалову: маладую ўдачу і радасць ад яе рана змяніў дарослы смутак лішняга чалавека. Гэта немагчыма было яму прадбачыць. Свет, які вітаў некалі юнага Алега, здаваўся навек уладкаваным. Дзеці, думалася ў жаніцьбу, павінны будуць толькі лепей



паўтарыць бацькаў лёс. Але адбылося зусім іначай.

Дваццатае стагоддзе шалёнае ад пачатку да канца. Яго сутнасць у неверагодных спадзяваннях, разважаў цяпер Алег. І шчымліва нагадалася жонка: не вернецца яна з Мюнхена, забраўшы з сабою меншага хлопца. Сказала ў нечым смешна і страшна: "Я не ўваскрэсну, каб паспытаць, урэшце, камуністычнага раю, а пакуль што ў нас пекла і ў мяне няма ахвоты заставацца ў ім!".

Нагаварылі адно аднаму, вядома, глупстваў. Яна, цалкам проста, павяла сябе, як тая — тысячагадовай даўнасці — варварка, што ўпадабала была заальпійскі камфорт антычнага Рыма... Большы сын знік затое звычайна, без тэатральных жэстаў. Праўда, з дзеўкаю — дайшлі потым чуткі — з высокапастаўленага дому. Паехаў ён нібы ў экскурсію... Сам зарабіў на гэта, занядбаўшы прытым сваю палітэхніку. Даслаў з таго канца зямлі паштоўку: "Тата, маманька! Не турбуйцеся за нас. Дасць Бог, калісьці запросім Вас да сябе". Унізе дапісалася ягоная Хрысця: "Нам тут добра. Працуем. Не злуйцеся на нас. Моцна абдымаю — і прашу зразумець!" І ўсё, без даты. На амерыканскім паштовым штампе невыразна адбілася назва горада.

Вось як: была сям'я, няма сям'і. Усё роўна што вымерла... І каб віна, хаця б абы-чыя, вызначылася!? Алег не пакідаў начэкваць, сам не ведаючы чаго. У адранцвенні ад раптоўнасці.

Патраціўшы здароўе на рабоце — працаваў у складзе з атрутнымі рэчывамі лабараторыі аптэкаў — ён атрымаў даволі прыстойную інвалідную пенсію. Жонка, зрэшты, таксама ў тым Мюнхене не стала хлеб шылам есці: у палякаў — а яна з іх — усё якіясьці сваякі ў заходнім замежжы. Найболей крыўдна рабілася Алегу на душы за тое, што жыццё пражыў як быццам не для сябе, ці не за сябе. І не для кагосьці, аказваецца, а ўсяго ў дачэпку камусьці. Горай: у чыйсьці дэсерт...

Увык вагацца. Колькі памятае сябе, усё вагаўся. У важным і ў няважным. Вагаўся пусціцца і на гэты апошні рашучы крок. Незнарокам, пэўна, дапамагла яму ў гэтым сама жонка, дасылаючы ўперадвялікдзень пачку з каланіяльнымі смачнотамі. Абразіўся за гэта на яе горш, чымсьці тады, на мюнхенскім вакзале. Можа быць не выбухнуў бы нястрымным абурэннем, калі б у канверце са спіскам упакаваных рэчаў знайшоўся яшчэ асабісты ліст да яго, няхай кароткі, у некалькі звычаёвых фразаў. Ды анічога, акрамя прадуктаў, падкрэслена шыкоўных.

"Значыць: хваліцца баба! — ускіпеў Алег. — Дулю паказвае мне, кпіць!"

Кватэру з мэбляю здаў у арэнду амаль назаўтра, за тры мільёны ў месяц вёрткаму бізнесмену з цыганаватай каханкаю. Узяў з яго плату за год наперад. Прыхапіўшы апранахі, з'ехаў на ўсход Польшчы, у паўзабытую тут хату, што ўчарнела на закрапівелым падворышчы ў гэтай даліне (даўжэй за бацьку пражыла маці). Жонка падштурхоўвала на продаж халупы, але не ўдавалася напытаць купца на яе. Алег цяпер з'явіўся сюды, бы запознены сын марнатраўны. І неяк прыемна здзівіўся быў нават, што дуга жыццёвага шляху прывяла ў мясціну дзяцінства зноў жа не аднаго яго... Шмат дзе ў ваколлі стукалі і грукалі, рамантавалі. Нікуды, аднак жа, не хадзіў, каб пазнаваць, аднаўляць сяброўства. Навошта і аб чым жа гаварыць з імі, гэтулькі гадоў не бачыўшыся? А папраўдзе, баяўся, што пойдзе гаворка ўсё пра тое самае, ад чаго ўцёк не без панікі з шумнага, а так нечакана пачужэлага яму вялікага горада блізу Нямеччыны. Пра грошы, якіх мала і мала. Выклікала гэта ў Алега одум, што заробкі ўсё так адбываюцца, каб не хапала іх на нешта большае, акрамя хлеба надзённага, лахманоў на хрыбет, чаркі пры свяце. І каб абы падаткі якія аддаць. Высілкі грамадства круцяцца вакол мінімалізму. Толькі некаторыя ў ім пераскокваюць нібыта зачараваную рысу кола беднасці, спазнаючы цялеснае ўзнясенне.

Яму прыкра было ўсведамляць тое. Маючы ўжо за сабою галоўнае, менавіта радасць існавання, завершаную стварэннем сям'і. Апынуўся вось у шоку, бездапаможным, як слабеючае бзынканне мухі ў павуцінні. Даходзіла да яго запозненае разуменне жыццёвае ўдачы, якая раней уяўлялася бяздумна абавязковай дарасламу. А яна гэтак жа рэдкая або і унікальная накшталт шчасця. Як цуд, які не здараецца незаслужана.



# III

## КРАІНКА НУВАРЫШАЎ

У беларускім мястэчку на ўскраіне Польшчы начамі выюць сабакі. Не бывае ў ім такой пары, каб хто не павесіўся. Тыя, што вар'яцеюць, падпальваюць стадолы, і ссылаюць іх у шпіталь. Хлопцы ж забіваюцца на матацыклах ды танных аўтах. Няма як сказаць, чаму. Калісьці зводзілі сябе са свету мнагадзетныя басотнікі і банкруты з фабрыкантаў.

Бабы трымаюцца. Іх шчасце, што яны менш разумеюць.

На гэтым ускраі жывуць, здавалася б, як і ўсюды: не з Богам, а з грашыма. Нават цудоўна (раўняючы з паншчынным векам). Чамусьці, аднак жа, бязрадасна.

Гэтак таму, што захутка ўсенька далося, і бяда выпусціць з рук. А трэба ж яшчэ далей і далей...

## ЗАПІСКІ АМАЛЬ НАВУКОВЫЯ

Міфы культуры характарызуюцца бяздоказнасцю. Як матчыннасць мовы, якой пярэчыць практыка самазнікнення народаў. Пачатак гэтаму ў сям'і. Працэс адрачэння ад свайго нараджаецца зазвычай у жанчыне. Ад яе пераходзіць гэта не столькі на мужа, колькі менавіта на дзяцей: гадуе іх на адшчапенцаў (тое ж датычыць рэлігійных пярэваратаў).

Чым тлумачыцца такая вядучая роля жонкі? Насамперад несамастойнасцю яе лёсу. Яна ідзе замуж, яе нехта бярэ (у расейскай моўнай традыцыі — жэняцца не "з жанчынаю", а "на жанчыне", што здаецца нават грубіянскім). Канкрэтыку быту вырашае тыповы ёй інстынкт гнязда, які лімітуе рэакцыі ды паводзіны, элімінуючы рызыкоўныя (заўважце: у мужчыны наадварот, бо ён — бойкі самец!). Звяртае ўвагу ў гісторыі цалкавітая адсутнасць інфармацыі пра паўстанні рабыняў; гаварыць пра іх фізічную слабасць — гэта замоўчваць галоўнае.

Каханне — наступная вялікая выдумка. Прыгледзьцеся да жаніцтваў: знойдзеце не абдуманае (хоць бацькамі)? Дзяўчына імкнецца да замужжа, каб унікнуць цяжкога ў жыцці. Не зважаючы і на тое, што мала каторая з іх з'явілася на свет Божы здольнай быць маткаю. Гэта адтуль такое мноства дзетак з пакрыўленым характарам, усякіх неўрасценікаў і псіхапатаў.

Патрыятызм, айчыннасць. Каму гэта патрэбна? А тым, у каго ёсць выбар жыць у сябе ці на чужыне. У цэлага ж народа не бывае такое альтэрнатывы. Я спакойны за патрыятычнасць нацыі — яе ўсю аніхто хлебам не накорміць, калі сама на яго не запрацуе. Айчыннасць датычыць эліты. Простанароддзю — гэта лішняя балбатня, як чытанне рыцарскага рамана галоднаму абадранцу.

Таму чуючы пра некага, што ён патрыёт, дык ясна для мяне: той чалавек хоча нажыцца. І вельмі добра! Грамадства без багатыроў не развіваецца. Паддаецца яно замажнейшым іншаплямёнцам, шукаючы ў асіміляцыі з імі паляпшэння свайго быту, а знаходзячы толькі ілюзію таго і расчараванне.

## АДКУЛЬ БЯРЭЦЦА ДУРНОТА?

Няма пэўнага адказу на пытанне, адкуль бярэцца дурнота. Усё не дае мне гэта спакою — тлумачэнні яе неадукаванасцю ёсць, аднак, павярхоўныя. Куды ж тады падзецца з прафесарам-дурнем?

Не болып дае таксама праўда пра адзічэласць бядоты раптоўным дабрабытам. Знаходзяцца такія, што, разжыўшыся на вілу, аўта і каханку, — не перастаюць пазнаваць людзей.

Бліжэй да ісціны тут лёгкасць нажывы, асабліва празмернай. У гэткі шанц, сапраўды, можна ашалець, калі бракуе



арыстакратычнай вытрымкі. Патомнае ўбоства знакаміта асвятляе гэтыя няяснасці, але ўсё-такі дзякуючы таму, што ў гісторыі наогул ёсць гісторыя ежы, адзення і пасцелі.

Чалавека робіць дурнем і сітуацыя. І гэтак жа параўнанне: каму дурань, а каму і не.

І так пачынае быць без канца... Як з мудрасцю.

А ці без дурноты ведалі б мы разумнае?

Вялікі мудрэц і ёсць вялікі дурань. Няўпэўнены я толькі ў тым, ці дурань можа быць разумным. Хоць як быццам не пярэчыць гэта логіцы, і прыклады таго, здаецца, відаць...

Я ўсё шукаю адказу на пытанне, адкуль бярэцца дурнота.

## ЗАВУЛАК

У Вавёрчыным завулку — лужы і жалезныя платы. Асабнякі ў ім, бы тыя дзеці аднае, але не вельмі каб разумнае маткі. З ганкаў тут сыходзяць, усё роўна, што пасля святочнага абеду (на які падаюць прыгожую свіную катлету, абкіданую зялёным гарошкам). Дзяўчаты носяць узіму высокія прычоскі з аздобінкамі, белыя даўжэзныя шалі ды каўнерыстыя кажухі наросхліст, сягаючыя ім да лытак. Яны чамусьці дзялецкія такія, і не нагадваюць сабою карнавальныя балі з дастойнымі вальсамі. Летам жа, у пару выспявання садкоў, аголеныя і загарэлыя, нечым занятыя з той заклапочанасцю пачынаючай гаспадыні, якой ўжо заказалі вясельных музыкаў (пад восень). А недзе дзікі пляж забеластоцкі, над рэчкаю лясною з вадзянымі лілеямі, і погуд далёкі вузкакалейкі, у якім як жа добра пабыць у адзіноце.

У Вавёрчыным, усё-такі, патыхае расійскім халопам і норавамі служанкі варшаўскай пані. Гэты навамодны мезальянс даў акуратны кавалак хлеба ды румяную дзятву, а яшчэ і самаадчуванне сяк-так важнага чалавека. І ясна, што тут усё круціцца вакол грошай, аднак (хоць і пры універсітэцкіх тытулах часамі). Трэба ж бачыць тую прагу ў іх да будучыні ад агіды да курнага мінулага; брыняе яна ад слодычы дастатку. *Ну і не дай Бог, каб мужык панам стаўі*

Не з тае пасцелі ў свет яны, нарэшце, пайпшi, каб аж на п'едэсталы ўзыходзіць. Паазірайцеся на помнікі ж нашы!

У завулку тым даволі, калі жывуць-пажываюць...

## КРАЯВІД У АСЕННІ АДВЯЧОРАК

Хаты за агародамі з капусцянiскамі. Тэлевізійныя антэны ў імгле бабінага лета, бы аголеныя страхі на вераб'ёў у маку. У векавечных прыгуменнях балаган з іржавеючага жалеззя і ўцекачом адтуль пыхкае трактар у мёртвым завулку. Вые сабака пад ганкам з выбітым ваконцам. Вечарамі брэша яшчэ адзін, у бок падбагонніка. Ніхто не ганяе іх; новыя п'яніцы — не раўня старым, якія адышлі на той свет з песнямі салдацкімі. Няма сварак; адны ўдовы засталіся, шматдзетныя без дзяцей.

Мястэчку ўжо не вярнуцца да сябе. Занадта вялікім яно было калісьці. І людзі не тыя цяпер у ім: здаволеныя, што ёсць хлеб ды чарка ў свята. Галота, якая перастала галадаць. Абадранцы выфранціліся. Кутнікі адгрукалі асабнякі сабе. Такія не адновяць гарадскі быт. Рабацяшчыя не ствараюць жа таго, што культураю завецца. Не бывае ў іх часу дзеля гэтага. Значыць, і таленту.

Я доўга не цяміў, чаму вытрэшчваюцца ў мястэчку ў тэлевізары, неяк стоена ўсеўшыся перад імі пасля мазольнага дня. А гэта ж так свет падгледжваюць, не разумеючы яго.

Сіроты космасу. Інфанты лёсу.

## ЭЛЕГІЯ ПАКІНУТАГА ГНЯЗДА

Хаты вясковыя — гнёзды пакінутыя, якім не пачуць ужо галасоў маладых. Пад кашаль старэчы слухаць вам байкі пра лёс залаты сыноў, што ў чыноўніках ходзяць, і пра дочак замужжы панскія. А яны ж — не тыя птушкі, каб у старонне роднае вярнуцца. Пагінуць на свеце шырокім, паразлятаўшыся хто куды і нават туды, дзе ніхто не чакаў іх. Ім, аднак, хлебна ёсць там, на спадчыне той чужой, хоць — бывае — і зусім зязюльчынай. Куюць галасіста песню сваю шчасця ад сытасці безайчыннай, здаволеныя над здаволенымі.

А вёску тваю няхай яма заваліць разам з мінулым яе нялюдскім ды працаю гаротнаю, з доляй горкаю і сварнёю без сціхання, з усімі зайздрасцямі яе ды праўдамі тымі і няпраўдамі!..

Унукі твае, хаціна ты хілая, кажуць і казаць будуць: не дай Бог пад страхою тваёю нарадзіцца!



* * *

Восень на Выгодаўскім прадмесці пачынаецца ў садках; пахне антонаўкамі. Нанач спускаюць з увязі сабак тут, замкнуўшы брамкі ў жалезных платах. Святло ідаць у вокнах, што з балконамі, і з прачыненых у іх фортак чутна тэлевізійная гамана. Іншы раз нехта ходзіць па падворчыку, пасвечваючы электрычным ліхтарыкам, як бы свой злодзей. Або — узбурацца вуркатаць легкавушкі ў гаражыках, усё роўна што на раптоўную эвакуацыю якую. Тады гулка бахне беларускі праклён ды суха пасыплецца польскае шматслоўе.

На прадмесці кладавяцца спаць няпозна. Нават тыя агеньчыкі ў паддашках гаснуць не вельмі каб апоўначы; так гэта жыве сваім моладзь.

Скандалы ўжо ціхія неяк, бы данос, на гэтай, бандыцкай некалі, Выгодзе. Не мардабойныя і без панажоўшчыны яны, баязлівецкія зрабіліся. Падумаецца — ад ганьбы такое заядла будуюць асабнякі і фарсяць у святы, ды ўсё ездзяць у Амэрыку тую!

У горадзе нуды, якім ёсць Беласток, — у пустазельных завулках Выгоды, здаецца, пачуеш, як вые туга.

## ЭЛЕГІЯ БЕЛАРУСКАЯ

Ціха ты, Еўропа! — нацыя мая родная ўжо пры смерці, мову ёй адымае. І не трубі па ратунак, захварэла яна па-мужыцку невылечна. Няхай спакойна на той свет адыдзе, без пакутаў дарэмных, сябе і іншых не мучачы лішне. Даволі і так пажыла, ледзь з духам нарадзіўшыся, жыццё сваё пракаратаўшы сяк-так, з горам ды бядою. Як неўдалота вясковы, яна найболыд сама сябе заядала; беднаму ўсё вецер у вочы, а багатаму чорт дзяцей калыша.

Нацыя беларуская, ты, як бабуленька непатрэбная, калі ўнукаў пагадавала, — дабрынь твая перастала даваць карысць. Задобрай ты была, занадта спагаднай і падатлівай у новы час, у які шануюць таго толькі, каго баяцца. Божамаці народаў ты, Беларусь, без права на быт рэальны, а ўсяго на легенду паклонную. Ікона не дае хлеба, таму не ўсе да яе моляцца.

Успамінаць Цябе будуць цёгшым словам, як кожнага, каму

лёс выпаў скупы, незайздросны. Крыўда, аднак, не мінае такіх аж да канца, спасылаючы забыццё сусветнае.

Калі напэўна што пастаяннае і векапомнае, дык гэта — зло.

## АДЗІН Я Ў ВЕЧАР КАЛЯДНЫ

Зорка па-над бацькавай хатаю апусцелай урачысціцца. Стаю на падворышчы дзяцінства свайго, у цішы паднябеснай. Снежна-снежныя далі скугольна сінеюць ў месячнай бляклaсці. Дрэвы трэскаюць у маразечу, бы стрэлы паспешлівыя беластоцкіх браканьераў у Перацёсах. Чарнацяць платы ўдовіны паваленыя. I сам-самюткі я перад сусветам тхланным, халодным халадэчаю прадчуванаю. Каб хоць брэх сліністы сюды аднекуль, з ваколіцы па-касмічнаму мёртвай, да якое пушча век-вечная скрадліва падступаецца, вяртаючы сваё.

Зорка калядная зіхаціць арэолам нада мною. Няма каму паклікаць мяне Хрыста людна вітаць, Русь тут вырадзілася. Не расчыняцца цёплыя дзверы з голасам матчыным. Буду, мажа, здзіўляцца самім сабою, чаму не пабег за народам тлумным у маторнае святло праспектаў гаманлівых? Застаўся з маўклівымі ценямі продкаў па-халопску забытых. I ўсё роўна, што не вельмі каб разумна літуючыся над імі...

Айчыны шкада, хай хоць для мяне яна патрэбная.

## НЕЧАКАНЫ ЎСПАМІН

У пераднавагоднюю віхуру, у гэты белы канец свету, у маю памяць з'явіўся з забытай далечыні захад летняга дня з паблісками ад нямецкага самалёта на пацішэлым небе. Вайна пайшла пад Маскву, і самалёт задаволена гудзеў чмялём з хмаркі на хмарку. Я нарваў вераб'інага шчаўя і трухаў да хаты, халоднымі ад расы ступнямі трапляючы ў цёплы пыл каляінаў.

Лётчыкам быць хацелася з той паныласцю, з якою зайздросцяць герою файнай кніжкі. Я кінуў марыць пра каралеву, каб упаткаць яе сірацінаю на дарожцы пад Казловым лугам. Ды й хто яе бачыў? А аэраплан, во, сам буіць! Сесці ў яго — таксама свята не меншае. Немец нядобры, хто-хто, а ён не пусціць. Саветы



вернуцца, дык тады і папрашуся. А да тае пары татку авечак папасу, мамцы курак дапільную, бабулі новай бульбы ўкапаю на полудзень... Трэба ж будзе і ў школу пахадзіць, калі ўсе дзеці пойдуць; і вырасці.

## ПАД КАНЕЦ

*Бліжэй да канца, больш бяссэнсу? Нясмутна паміраць, няшкода адысці са свету... Нашто ты на ім?*

*Жыць трэба. Без цябе іншыя застануцца, тваім лёсам пазначаныя (ад іх — наступныя гэтак жа). З табою не скончыцца вясна, не сатлее лета, не аціхне ветравей у лістападзе і снег не ўчарнее.*

*Беларусь збеларусее.*

*Дух — не хлеб. Унук патомны ў Сан-Францыска, зхэрцам у айчыне. Гэткае немагчымае ў Сібіры. Там і душы канаюць. Не заблудзіся ў той бок, сыне родны!*

*Я — жыццё, бо я — смерць. Варвар баіцца скону. Неразумны. Як жа ісці, не канаючы? Ніхто ж не пачынаецца з нічога. Адзін Бог бясконцы. Кім жа ты пры ім? Будзь сабою і не болей. Усё было. Усё будзе. Не здумай быць першым і апошнім. Пастарайся не стаць дурнем. Гэта не надта цяжка. Хоць і нялёгка. Глупствы бяруцца, пераважна, ад неахвоты.*

*Хрыстос несмяротны. Фараонаў бальзам захаваў. Сталін недзе валяецца. А па рабе божым чэрап і падэшвы гумавыя знаходзяць магільшчыкі. Ды якая розніца, кажуць абарыгены.*

## *ЖУРБОТНЫ САМОТНІК ПАД ЗОРКАЙ КАЛЯДНАЙ*

*Сакрат Яновіч свой літаратурны дэбют распачаў у 1956 годзе і з таго часу выдаў больш за 20 празаічных кніг, разнастайных паводле тэматыкі, жанравай спецыфікі, стылю. Творы пісьменніка перакладаліся на мовы многіх народаў свету: нямецкую, ангельскую, італьянскую, рускую, нарвежскую, украінскую і інш.*

*Дыяпазон творчых пошукаў С. Яновіча вельмі шырокі: ад невялікіх лірычных мініяцюр, якія называюць вершамі ў прозе, да псіхалагічных раманаў і навукова-філасофскіх эсэ. Аднак у цэнтры ўсіх твораў С. Яновіча нязменна прысутнічае імкненне спазнаць супярэчлівую прыроду чалавека, месца і ролю яго на зямлі і шырэй — у сусвеце. Усе гэтыя глыбінныя спрадвечныя пытанні быцця пісьменнік прапускае праз прызму асабістага жыццёвага вопыту, светаўспрымання, свайго індывідуальнага чалавечага "я ".*

*Даследчык псіхалогіі творчасці Леў Выготскі сцвярджаў, "што мастацтва — гэта найбольш важны, асноўны цэнтр усіх біялагічных і сацыяльных працэсаў асобы ў грамадстве, што яно з'яўляецца спосабам ураўнаважвання чалавека і свету ў найбольш крытычныя і адказныя хвіліны жыцця ".*

*Народжанаму напрыканцы II тысячагоддзя ў часіны глабальных сацыяльных, экалагічных і маральных катастроф, якія, можа быць, да канца яшчэ і не спазнаныя сучаснікамі, Сакрату Яновічу і асабісты лёс не пашкадаваў "крытычных і адказных хвілін жыцця ".*

*Нарадзіўся будучы пісьменнік у Крынках на Беласточчыне напярэдадні II сусветнай вайны ў 1936 годзе. Вучыўся напачатку ў Электратэхнікуме ў Беластоку, а потым закончыў там Настаўніцкую студыю, затым — Варшаўскі універсітэт.*

*Значна пазней, праз некалькі дзесяцігоддзяў у апавяданні "Одум", змешчаным у гэтай кнізе, С. Яновіч паспрабуе пафіласофску, улічваючы ўсе складаныя грамадска-палітычныя і дэмаграфічныя аспекты, асэнсаваць лё'с усяго пасляваеннага пакалення, і ў тым ліку свой асабісты.*

*"Пасля вайны вялікае мы школы паканчалі заядла і, усе да апошняга, дарослымі ўраз зрабіліся. І на работу ў гарады трамваезвонныя ды з тратуарамі франтаватымі, бы на фэст які вяселісты пайшлі-паехалі. Грошы ж свае мелі, яшчэ з малаком на*



*губах будучы, во дзіва цуднае было над дзівамі! Так працавалі там і ў якія толькі хочаш змены, што сам Сізіф той пры нас гультаём здаўся б. Не з аднаго страху парабка, што маўклівым кватарантам сноўдаўся ў кожным з нас, — а каб не турнуў хто на галытву тую бацькоўскую назад ".*

*Так пісаў С. Яновіч у працяг традыцыйна-беларускай тэмы "сена на асфальце" (М. Стральцоў), альбо, кажучы па-навуковаму, не столькі пра працэсы урбанізацыі сучаснага грамадства і праблему адаптацыі вясковага чалавека ў горадзе, колькі пра асіміляцыю беларусаў чужароднай гарадской этнічна-моўнай культурай.*

*Сялянскі сын у горадзе, альбо паводле вызначэння С Яновіча "хам на паркеце", доўгі час быў і ў нейкай ступені застаецца і зараз адньгм з галоўных герояў шматлікіх твораў пісьменніка, што дало фармальныя падставы крытыцы, у тым ліку і польскай, аднесці творчасць С. Яновіча да так званай вясковай плыні.*

*Гэтай чыста знешняй суаднесенасцю найперш з вясковай тэматыкай засямняецца і затушоўваецца другая, больш важная, іпастась Яновіча-пісьменніка і Яновіча-асобы: яго этнічна-палітычная заангажаванасць, яго свядомая ўпартая тэндэнцыйнасць, з якой ён, як некалі наш славуты зямляк з-пад Наваградка Адам Міцкевіч, адлюстроўвае трагізм лёсу да гэтага часу заняволенага беларускага народа.*

*Зрэшты, што здараецца не так ўжо і часта, нават сваім асабістым жыццём С. Яновіч нібыта пацвярджае на практыцы свае мастацкія ды філасофскія погляды. Да шматлікіх грамадска-палітычных канспіратыўных аб'яднанняў, што на працягу двух апошніх стагоддзяў бесперапынна ўзнікалі на Беларусі, ставячы на мэце нацыянальна-вызваленчую барацьбу, Сакрат Яновіч дадае свой падпольны Саюз Беларускіх Патрыётаў, арганізаваны ў наймени спрыяльны для гэтага час — час сталінскіх рэпрэсій.*

*Актыўная творчая і грамадска-палітычная дзейнасць Сакрата Яновіча, які, скончыўшы філалагічны факультэт Варшаўскага універсітэта, працаваў у тыднёвіку "Ніва " і ў розных структурах Беларускага Грамадска-Культурнага Таварыства, не магла не застацца незаўважанай збоку адпаведных спецслужбаў. У выніку восенню 1970 года пісьменнік трапіў у сіло палітычных праследаў, быў пазбаўлены сталага месца працы і аказаўся на пэўны час ізгоем у грамадстве. Мусіў здабываць хлеб рознымі выпадковымі заробкамі. Чым ён толькі ні займаўся ў гэты часі Працаваў чарнарабочым, пажарнікам, тэхнікам бяспекі працы і г.*

*д. І, канешне ж, у мітрэнзе гэтых няпростых выпрабаванняў ён нанова спазнаваў самога сябе і людзей, знаёмых і незнаёмых, то верыў ім і цешыў сябе ілюзіямі, то зноў горка расчароўваўся і іранізаваў са сваёй наіўнасці.*

*Згукі гэтых трывожлівых перажыванняў прачытваюцца ў невялікім апавяданні "Просьба". Лірычны герой твора просіць свайго знаёмага — дырэктара дрэваапрацоўчай фабрыкі, дзе вечна бракуе рабочай сілы, узяць яго на працу хоць бы грузчыкам. Але адразу ж разумее, што "дапусціў памылку: патрабаваў ад яго карысці толькі сабе! Была гэта чыстае вады просьба, аб якой можна прачытаць у рыцарскім рамане (наіўным). Нерэальная. Здараюцца, праўда, адступленні: калі пачцівы чалавек мае дачыненні з якраз такім жа, што — зазвычай — лічыцца вялікай рэдкасцю ".*

*Аднак С. Яновіч не быў бы С. Яновічам, калі б паказваў чалавечую натуру цалкам аднамерна, малюючы асяроддзе ў з 'едліва-іранічных танах, а свайму лірычнаму герою пакідаючы пастэльна-ружовыя фарбы. Як у дачыненні да гэтага героя, так і ў дачыненні да самога сябе пісьменнік застаецца заўсёды самакрытычным і аб'ектыўным.*

*"Гэта ёсць страшнае — пакутваць ад слушнага зневажання з боку менавіта тых, якія доўно не заслугоўваюць добрага словаі", — горка зазначыць ён ва ўжо згадваным апавяданні "Просьба ".*

*Праблемы і непаразуменні сужыцця творчага чалавека з найчасцей бездухоўна-прагматычным асяроддзем у цэнтры ўвагі пісьменніка і ў навеле "Выпадак з Косцікам ", якая створана паводле традыцыйнай для С. Яновіча схемы: сустракаюцца двое знаёмых, перакідваюцца нейкімі фразамі пра сваё жыццё-быццё, а з гэтага выпадковага дыялогу пісьменнік альбо чытач робіць маральна-этычную, псіхалагічную ці філасофскую выснову. У "Выпадку з Косцікам" адзін са знаёмых — свядомы беларус, чалавек прынцыповы і духоўна багаты, другі ж — удачлівы "шанцоўнік з Млынавага завулка", як называе яго аўтар, "усё зводзіць да пруткай кішкі". Але для нас найбольш важна, чым закончылася гэтая сустрэча. "Быў гэта той выпадак, — піша С. Яновіч, — калі нехта, каго ты не паважаеш, замест пакарыстацца нагодаю займець верх над табою і даканаць, узяў ды пашкадаваў цябе... Але Косцік, відаць, усвядоміў сабе нешта важнейшае, менавіта тое, што маючы праўду на сваім баку, сам паводзіць сябе бязлітасна.*

*Гэтае адкрыццё вельмі спужала яго!"*



*Тут, у гэтым невялікім творы, С. Яновіч у характары свайго свядомага беларуса Косціка са скрухай вылучыў і падкрэсліў яго ўпартую просталінейную зацятасць, няўменне ісці на кантакт з людзьмі, што, на жаль, так уласціва большасці беларускіх адраджэнцаў. Якраз гэтая зацятасць і адпалохвае многіх не зусім яшчэ свядомых людзей, якія цягнуцца душой да беларускага руху. Пра гэтую негатыўную рысу беларускага адраджэнства прароча папярэджваў у свой час яшчэ Максім Гарэцкі ў славутай аповесці "Дзве душы". 1, можа, таму, што гэты твор у часы савецкай улады быў строга забаронены, беларуская літаратура на перасцярогу класіка забылася зусім, ажно пакуль пра гэта зноў не нагадаў нам С. Яновіч.*

*Варта адзначыць, што акурат у такіх невялікіх, фрагментарных і нібы выпадковых выказваннях яскрава выяўляецца глыбінны, сутнасны, а не дэкларатыўны, гуманізм Яновіча-пісьменніка, мудрасць Яновіча-чалавека. І што б ён ні гаварыў пра людзей і свае адносіны да іх, як бы ні насміхаўся ні здзекаваўся з іх у сваіх творах, у жыцці Сакрат Яновіч чалавекалюб, які па-бацькоўску шкадуе і перажывае за сваіх "хамаў на паркеце ".*

*Самым натуральным сведчаннем гэтага глыбока гуманістычнага стаўлення да сваіх далёка не ідэальных супляменнікаў з 'яўляюцца не толькі і не столькі мастацкія творы, колькі грамадская дзейнасць С. Яновіча-палітыка, хоць палітыкам ён і стаў не паводле ўласнае волі, а ў выніку жыццёвых абставін. Перажыўшы ў 70-ыя гады палітычны перaслед за свае светапоглядныя арыентацыі і грамадскую дзейнасць, пісьменнік не выракся сваіх прынцыпаў, не даў сябе запалохаць ці падкупіць. У 1980 годзе, як маючы пэўны вопыт падпольшчык, ён далучаецца да арганізацыі канспіратыўнага Беларускага Незалежнага Выдавецтва, якое існавала ажно да самага заняпаду камунізму ў Польшчы. У лютым 1990 г. у Беластоку ўзнікае Беларускае Дэмакратычнае Аб'яднанне, якое скандэнсавала беларускі палітычны рух, і лідэрам якога стаў акурат Сакрат Яновіч.*

*Пісьменнік і палітыка — з'явы, здавалася б, занадта далёкія адна ад другой. У нашыя складаныя часы апалітычнасць робіцца ледзь не сінонімам па-мастацку дасканалай, як кажуць, сапраўднай літаратуры. Закіды ў залішняй палітычнай заангажаванасці ідуць на адрас кожнага, хто сёння неабыякавы да лёсу роднага краю і не баіцца выказаць публічна гэтую неабыякавасць. А ў беларускай літаратуры гэта найперш Васіль Быкаў і, канешне, Сакрат Яновіч.*

*Аднак гісторыя літаратуры сведчыць пра адваротнае: вельмі*

*многія вялікія пісьменнікі былі не толькі тэндэнцыйнымі і палітычна заангажаванымі, але, можа быць, дзякуючы менавіта гэтаму стварылі свае найбольш дасканалыя творы, якія лічацца сёння шэдэўрамі сусветнай літаратуры. Згадайма, да прыкладу, А. Міцкевіча з яго славутымі "Дзядамі", "Бесы" Ф. Дастаеўскага, "Тутэйшых " Янкі Купалы...*

*Зрэшты, як іранічна пасміхнуўся С. Яновіч у сваёй "Спробе дэфініцыі беларуса", — "беларуская дзейнасць — гэта той від чалавечае актыўнасці, які мае эксклюзіўны характар і не выкліканы агульнаграмадскімі патрэбамі".*

*Можа таму, не толькі паводле стану свайго здароўя, але расчараваўшыся ў рэальных выніках сваёй грамадскай працы, пісьменнік у апошні час адышоў ад грамадскага жыцця і ўсе свае сілы аддае найперш літаратурнай творчасці.*

*Вынік гэтага пераразмеркавання энергіі аказаўся плённым. Да выдадзеных раней кніг "Загоны" (1969), "Сярэбраны яздок" (1979), "Думкі пра аўтаномію" (1981), "Віаіогш, Віаіогш" (1987), дадалася выдадзеная ў 1992 г. у Мінску ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" кніга "Самасей", якая не пакінула абыякавымі чытачоў па той і па гэты бераг Буга, выклікаўшы супроцьлеглыя, мажліва, цалкам не суадносныя з аўтарскай задумай інтэрпрэтацыі. У 1993 годзе ў Беластоку выходзіць элегічна-прарочая кніга з сімвалічнаю назвай "Доўгая сьмерць Крынак", у якой была змешчана і аповесць "Сьцяна", важная для разумення творчай эвалюцыі аўтара. У гэтым жа годзе выходзяць кнігі на польскай мове: "Dolina pełna losu", "Terra incognita: Białoruś". У 1995 годзе — "Лістоўе — Listowie".*

*І ўжо самай выдатнай кнігай трэцяга, сучаснага этапу творчасці С. Яновіча вядомы беларускі філосаф Уладзімір Конан называе "Дзённікі: 1987—1995" (Беласток, 1997).*

*Новая кніга "Запісы веку" (1999) С Яновіча ўключае апавяданні, навелы і мініяцюры, што ствараліся на працягу апошніх пятнаццаці гадоў або не змяшчаліся ў ранейшых выданнях. Усе гэтыя творы ў свой час друкаваліся на старонках перыёдыкі, у пераважнай большасці тыднёвіка "Ніва", і дасведчанаму чытачу трошкі знаёмыя. Аднак, сабраныя пад адной вокладкай, здавалася б, разрозненыя творы валодаюць дзіўнай уласцівасцю ўзаемадапаўняць і ўзаемараскрываць адзін другога, выпукляючы тым самым мастацкую канцэпцыю аўтарскага ўспрыняцця свету.*

*Новая кніга пісьменніка, звычайна, з'яўляецца працягам*



*папярэдніх. І ў дачыненні да С. Яновіча ўсё гэта так, але ў пэўнай ступені і не. Асноўнымі праблемамі, што хвалявалі яго з першых крокаў у літаратуры, былі ўзаемаадносіны чалавека з навакольным светам, прыродай, грамадствам. Але не нейкага абстрактнага чалавека, а беластоцкага тутэйшага, які, можа, больш за іншых сваіх супляменнікаў у моц гістарычных абставін падпаў пад уладу Мамоны.*

*Даследзіны светагляду, характару, спосабаў выжывання гэтых бядоцікаў, мардацікаў, бавантураў, босых ботаў і г. д. С Яновіч праводзіць з зацятасцю і скрупулёзнасцю навукоўца-псіхолага і палітолага, з глыбока стоеным болем адлюстроўвачы прымітывізм іхніх жыццёвых запатрабаванняў і бясслаўную пагібель.*

*У разрозненых паводле часу і месца дзеяння невялікіх навелках з жыцця насельнікаў роднага староння, пісьменнік стварыў свой свет, сваю гратэскна-абстрагаваную рэальнасць беларуска-беластоцкай тутэйшасці. Паводле мільгаючых там-сям геаграфічных назваў і некаторых дэталяў можна здагадацца, што прасторавыя рамкі гэтага свету абмежаваны Беластокам і ягонымі ваколіцамі, а часавыя пачынаюцца з гадоў II сусветнай вайны і цягнуцца ў сучаснасць. У гэтых часава-прасторавых рамках невялікая супольнасць людзей, пазначаная метрыкай тутэйшасці, нібыта з'яўляецца аб'ектам эксперыменту на выжыванне. І ўжо не толькі духоўнага, але й фізічнага.*

*Гэтую тэрыторыю, дзе вядуць сваё існаванне вартыя жалю людзі, С. Яновіч з уласцівай яму з'едлівай іроніяй ахрысціў "краінкай нуварышаў". У гэтай краіне істоты, падпарадкаваныя своеасабліваму інстынкту спажывання, не маюць навагп уласных імёнаў, а толькі дзіўныя і смешныя мянушкі, накшталт Ясь-Курыная Дзюбка, Лёдзя-"Амэрыканка", Чорная Лёля і г. д. Тут "у беларускім мястэчку на ўскраіне Польшчы начамі выюць сабакі. Не бывае ў ім такой пары, каб хто не павесіўся. Тыя, што вар'яцеюць, падпальваюць стадолы, і ссылаюць іх у шпіталь. Хлопцы ж забіваюцца на матацыклах ды танных аўта". ("Краінка нуварышаў").*

*Ландшафт гэтай яновічаўскай "краінкі" вызначаецца разбурэннем і хаосам, а людзі — першабытнай дзікасцю нораваў, бязглуздасцю ўчынкаў. Згадаем толькі апавяданні "Баль нуварышаў", "Здзелка", "Неўдалота", "Цывілізаванне Сакольскай". І без цяжкасці заўважым, як у мастацкім адліку часу пад пяром С. Яновіча спрадвечная забітасць і цемната той далёкай беларускай*

*вёскі, што вядзе свой радавод з "Маёй хаты" Ф. Багушэвіча ды "Лазні" М. Гарэцкага няўзнак перарастае ў яшчэ большую бязглуздасць і тупы прымітывізм гарадскіх нуварышаў.*

*У дыялогу з Янам Чыквіным, змешчаным у культуралагічным часопісе "Крыніца" (№ 39, 1998 г.), С. Яновіч так характарызуе сваю творчую лабараторыю: "У пантэон паганскіх багоў я ўвёў, як памятаеш, багіню ганьбы. Патронку сялян у горадзе. Іх жа дзяцей дэфініяваў як самасеяў. Сярод гэтага дэмаграфічнага смецця здараліся парасткі чалавечнасці, і я перасаджваў іх пад біблейскую сцяну".*

*"Самасей" альбо "хам на паркеце", як яшчэ называе яго С. Яновіч, грунтоўна і шматбакова адлюстраваны як у папярэдніх кнігах празаіка, так і зараз. Але самасеі не ўзнікаюць самі па сабе, з нічога. Іх нараджэнню, лічыць пісьменнік, спрыялі пэўныя негатыўныя рысы нацыянальнага характару, у лік якіх уваходзіць і "неадступнасць патомнага халопа, падкага на дарэмшчыну", як характарызуе гэта пісьменніку апавяданні "Няўдалая пакража".*

*Сатырычныя абразкі з жыцця "краінкі нуварышаў" здзіўляюць, з аднаго боку, поўным разыходжаннем з прынятай у былой савецкай і постсавецкай літаратуры канцэпцыяй праблемы бацькоў і дзяцей, пазначаным там штучнай ідэалізацыяй старэйшага пакалення, а з другога боку, — уражваюць спалучэннем канкрэтна-гістарычных рэалій з абагулена абстрагаванай вобразнасцю, можна нават сказаць, біблейскай прытчавасцю.*

*Напрыклад, гісторыя пра Босага Бота, які, нарабаваўшы падчас вайны жыдоўскага дабра, нядоўга цешыўся сваёй здабычай і неўзабаве "памёр ад дзесяці хваробаў". Ніхто не згадаў добрым словам пасля смерці і Яся-Курыную Дзюбку, гультая і злодзея, які пасля вайны "упэцкаў быў сваё сумленне, лазячы з бандаю"...*

*Увогуле, жыхары яновічаўскай "краінкі нуварышаў" не абцяжарваюць сябе пакутамі сумлення. Дзеля сваёй выгады яны з лёгкасцю пераступяць нормы маралі і этыкі, ці гэта бедны ўдавец Поўх, які ў імя лёгкай нажывы гатовы ахвяраваць цнотаю адзінай дачкі ("Шанц дачкі Поўха"), ці паўінтэлігентная мяшчанка Вонсы, што падпальвае ўласную хату, каб атрымаць добрую страхоўку ("Цывілізаванне Сакольскай").*

*Сярод твораў падобнай тэматыкі істотна вылучаецца алегарычная навела "Сашэсце Ахапа", блізкасць якой да біблейскай прытчы падкрэсліваецца ўжо ў назве. Гэта журботна-іранічны расповяд пра апошняга магіканіна, сына багіні Ганьбы вёскі — Ахапа, які невядома адкуль з'яўляецца на прадвесні, каб узараць за*



*бутэльку гарэлкі мясцовыя гароды.*

*Напрыканцы 80-х гадоў многіх уразіла трагічная аповесць Алеся Адамовіча "Апошняя пастараль", у якой аўтар падаваў сваю візію канца свету. Сакрат Яновіч у сваім "Сашэсці Ахапа" абагулена і разам з тым натуралістычна, як таго, відаць, і патрабуе сама тэма, малюе сваю карціну знішчэння цывілізацыі. Паводле С. Яновіча, гэта можа адбыцца (ужо адбываецца на нашых вачах) і без сусветнай ядзернай вайны, як было ў А. Адамовіча. Першабытная дзікасць прыроды і чалавека, які дзічэе разам з ёй — тут. Побач з намі. За колькі крокаў ад агнёў вялікага горада. Там, дзе жыве апошні сын вёскі Ахап.*

"У руінных пустэчах пачуваўся Ахап, бы асаднік які на абрабаваных саветамі нямецкіх землях, што ў пасляваенне адышлі пад Польшчу. Знаходзіў усялякае, патрэбнае яму, ламарэндзе; склаў зграбны вазок, выштукаваў барану, нафтаю ачысціў з іржаўя цалюткі жалезны плуг, што гібеў у дзірване на чыімсьці загуменні (гледзячы здалёку меў выгляд рыхтык кінутага адступаючай салдатнёю станковага кулямёта). Пашэнціла і з лейцамі, на якіх даўнавата хтосьці павесіўся на бэльцы ў стадоле; у астаронку валяліся парасцяганыя звяр'ём чалавечыя косці, шматкі фуфайкі; тырчэлі беленню з гумовых ботаў галёнкі, зеўраў чэрап у завязанай пад пашчэнкі шапцы-вушанцы (надумаў шалёны бяду ў завейную адзіноту?). У нябрыдкай хаце пад гаем, у якую Ахап залез цераз выламанае кімсьці акно, чарнацелі чатыры тэлевізары на падлозе: варушылася ў іх плойма мышэй, што ўпадабалі гнездавацца паміж лямпамі апаратуры. З аблезлае халадзільні гультаявата выкручвалася змяя".

*У гэтай задоўжанай цытаце добра відаць спецыфічная здольнасць пісьменніка нібыта выпадковым сказам, словам ці параўнаннем ("бы асаднік на абрабаваных саветамі нямецкіх землях", "рыхтык кінуты станковы кулямёт") абудзіць цэлы ланцуг канкрэтных гістарычных асацыяцый і згадак у душы чытача.*

*Канешне, такая проза патрабуе і адпаведнага ўдумлівага чытання і адпаведнай інэлектуальнай і жыццёвай дасведчанасці.*

*Пластычна і не палохаючыся адкрытага натуралізму, С. Яновіч паказвае знікненне натуральнага асяроддзя, у якім існаваў калісьці і мог бы існаваць зараз яго Ахап. Але гэтае асяроддзе знікае з твару зямлі і з ім не можа не знікнуць і сам Ахап, "як і не было яго ніколі", скажа ў канцы твора аўтар. І можа не столькі пра*

*апошняга сына вёскі гэтая прытча, колькі пра апошняга прадстаўніка беларускага этнасу, якіх і сапраўды не так і шмат засталося на нашай зямлі. Нездарма ж такім пачуццём самоты і пакінутасці прасякнуты, бадай, усе мініяцюры, лірычны герой якіх паводле свайго светагляду найбліжэй да аўтара.*

*Трагікамічнасць падзей, што адбываюцца ў "краінцы нуварышаў", з'едлівая іронія, якая стасуецца тут у дачыненні да герояў, пэўным чынам падрыхтоўваюць чытача да ўзвышанай атмасферы журботнага суму ў лірычных мініяцюрах пісьменніка.*

*Лірычныя мініяцюры С. Яновіча — гэта ўжо не шэрая, грубая проза жыцця, а самая высокая і ўзнёслая паэзія. Бадай кожны з гэтых твораў можна было б назваць не мініяцюрай, а міні-эсэ, калі зыходзіць з багацця фактаў, згадак, асацыяцый і самай шчыльнай аўтарскай спалучанасці з тым, пра што ідзе гаворка.*

*Тут нібыта робіцца спроба лагічна завяршыць тое, пра што імкнуўся сказаць аўтар у алегарычнай форме ў сваіх абразках з жыцця "краінкі нуварышаў". Так, "Элегія беларуская" — гэта амаль што эпітафія альбо надмагільны плач-галашэнне аб Беларусі.*

"Нацыя беларуская, ты, як бабуленька непатрэбная, калі ўнукаў пагадавала, — дабрынь твая перастала даваць карысць. Задобрай ты была, занадта спагаднай і падатлівай у новы час, у які шануюць толькі таго, каго баяцца. Божамаці народаў ты, Беларусь, без права на быт рэальны, а ўсяго на легенду паклонную. Ікона не дае хлеба, таму не ўсе да яе моляцца".

*Акурат тут, у лірычных мініяцюрах, асабліва яскрава выяўляецца мастакоўская самабытнасць С. Яновіча. Ужываючы даўно адрынутыя сучаснай прозай інверсію і рытмізаванасць, пісьменнік нейкім толькі яму аднаму падуладным чынам балансуе на мяжы натуральнасці пачуцця , не ўпадаючы ў штучную ўзнёсласць. Там, дзе ў іншых літарапгараў лірычны герой з падобнай рамантычна-сентыментальнай фразай выклікаў бы смех, у С. Яновіча гэты герой абуджае якраз тыя пачуцці, якія імкнуўся перадаць аўтар.*

*Дык хто ж ён такі — Сакрат Яновіч? І ў чым яго феномен? На гэтае пытанне можна адказаць словамі вядомага літаратуразнаўцы Уладзіміра Гніламёдава: "Чым глыбей яго ведаеш, тым больш ён здзіўляе маштабамі і незвычайнасцю сваёй індывідуальнасці: паэт, празаік, эсэіст, публіцыст, аналітык, гісторык, культуролаг, сацыёлаг, псіхолаг, філосаф, мараліст і. яшчэ, і яшчэ. Пры ўсім гэтым, гэта чалавек з вельмі нізкім болевым парогам — мяккі і пяшчотны, тэмпераментны і ваяўнічы*



*адначасова. Такім яго нарадзіла Беларусь XX стагоддзя... "*

*А найлепш шукаць разгадку феномена Сакрата Яновіча ў яго кнігах. У прыватнасці, і ў гэтай, якую ён назваў такою сімвалічна шматзначнаю назваю — "Запісы веку".*

Галіна Тычка
*Мінск*

# Змест


I

Акно 5
Мой малы генезіс *6*
Рэмінісцэнцыі 7
Одум *10*
Выезд па справе *11*
Узнікненне і заняпад Ангельскай *20*
Наведанне *22*
На парозе старасці *23*
Супраслеўскі трыпціх *23*
Смерць вяза *25*
На ганку ў прадвесне *26*
Адлёт буслоў *2 7*
Спатканне ў Венецыі *28*
Скарга на гісторыю *29*

II

Сустрэча са свінствам *30*
Цывілізаванне Сакольскай *32*
Няўдалая пакража *35*
Шанц дачкі Поўха *37*
Як Босы Бот разжыўся *40*
Памяць пра Яся-Курыную Дзюбку *41*
На пажарышчы *43*
Лёдзя-"Амэрыканка" *45*
Сашэсце Ахапа *46*
Неўдалота *48*
Рускі базар *50*
Здзелка *52*
Даўганогая Лань *54*
Выпадак з Касцікам *57*
Чорная Лёля *59*
Кручок *60*
Змаганне з поўхам *61*
Просьба *64*
Баль нуварышаў 65
Хэўра *67*
Мроі Прошапана *68*
Колева чарка *70*
Наезд на хамутоў *72*
Ноч Віялеты *75*
Музыкі ў Шудзялаве *76*
Позні розум Алега *76*

III

Краіна нуварышаў *79*
Запіскі амаль навуковыя *79*
Адкуль бярэцца дурнота? *80*
Завулак *81*
Краявід у асенні адвячорак *82*
Элегія пакінутага гнязда *82*
"Восень на Выгодаўскім..." *83*
Элегія беларуская *83*
Адзін я ў вечар калядны *84*
Нечаканы ўспамін *84*
Пад канец *85*

*Галіна Тычка, ЖУРБОТНЫ САМОТНІК ПАД ЗОРКАЙ КАЛЯДНАЙ 86*


KAMUNIKAT.org